Установа адукацыі
“Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна”

# ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСІ

## ВЫВУЧЭННЕ, ЗАХАВАННЕ, ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ

Электронны зборнік навуковых артыкулаў

Брэст
БрДУ імя А. С. Пушкіна
2026

***ISBN 978-985-22-0987-8***

© УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна”, 2026

Аб выданні – 1, 2

<u>1 – звесткі аб выданні</u>

УДК [902+39+94+72](476)(082)

*Рэцэнзенты:*
вядучы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу
ДНУ “Інстытут гісторыі НАН Беларусі”
кандыдат гістарычных навук, дацэнт **В. І. Кошман**

дацэнт кафедры гуманітарных навук
УА “Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт”
кандыдат гістарычных навук, дацэнт **С. У. Грыбава**

**Гісторыка-культурная** спадчына Беларусі: вывучэнне, захаванне, папулярызацыя : электрон. зб. навук. арт. / Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна ; уклад.: А. А. Башкоў, В. Ю. Піліповіч. – Брэст : БрДУ, 2026. – URL: https://rep.brsu.by/handle/123456789/.

ISBN 978-985-22-0987-8.

Зборнік уключае навуковыя артыкулы, прысвечаныя розным аспектам даследавання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, падыходам да яе захавання, выкарыстання і папулярызацыі. Навуковыя працы закранаюць шырокае кола пытанняў археалогіі, этналогіі, культурнай антрапалогіі, архітэктуры, гісторыі, краязнаўства, гістарычнай памяці, адукацыі і выхавання. Публікуюцца ў аўтарскай рэдакцыі.

Адрасуецца навукоўцам, выкладчыкам, настаўнікам школ, а таксама аспірантам, магістрантам і студэнтам вышэйшых навучальных устаноў, навучэнцам школ, ліцэяў, каледжаў.

Распрацавана ў фармаце pdf.

**УДК [902+39+94+72](476)(082)**

Тэкставае навуковае электроннае выданне

Сістэмныя патрабаванні: тып браўзера і версія любыя;
хуткасць падключэння да інфармацыйна-тэлекамунікацыйных сетак любая;
дадатковыя надстройкі да браўзера не патрабуюцца.

© УА “Брэсцкі дзяржаўны
ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна”, 2026

*<u>У ПАЧАТАК</u>*

2 – вытворча-тэхнічныя звесткі

- Выкарыстанае ПЗ: Windows 10, Microsoft Office 2013;
- адказны за выпуск Ж. М. Селюжыцкая, тэхнічны рэдактар К. С. Мізерыя, карэктар К. С. Мізерыя, камп’ютарны набор і вёрстка В. Ю. Піліповіч;
- дата размяшчэння на сайце: 04.05.2026;
- аб’ём выдання: 13,7 МБ;
- вытворца: установа адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна”, 224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28. Тэл.: 8(0162) 21-70-55. E-mail: rio@brsu.by.

*У ПАЧАТАК*

## ЗМЕСТ

### АРХЕАЛОГІЯ, АРХІТЭКТУРНАЯ СПАДЧЫНА

**Акулова О. А., Кривицкий П. В., Басов С. В., Ткачук И. В., Манн А. С.** Технологии и перспективы создания цифрового фонда памятников архитектуры Республики Беларусь ........ 6
**Башкоў А. А.** Археалагічныя даследаванні Тэрэспальскага моста на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці ........ 13
**Вабішчэвіч А. М.** Архітэктура Заходняй Беларусі (1921–1939): гістарычны агляд ........ 19
**Донцова С. А.** История археологического изучения г. Каменца (по архивным материалам) ........ 36
**Павлова Я. И.** Костяные предметы игр и забав XIV–XVIII веков с территории Могилевского Поднепровья ........ 41
**Піліповіч В. Ю.** Археалагічныя даследаванні на вуліцы Будзённага горада Брэста ў 2014 годзе ........ 48
**Шуткова Н. П.** Изразцовое производство Российской империи по материалам «Списка фабрикъ и заводовъ» 1912 года ........ 54

### ЭТНАЛОГІЯ, КУЛЬТУРНАЯ АНТРАПАЛОГІЯ

**Варабей А. М.** Рэканструкцыя і прэзентацыя шляхецкага строю XVI–XVII стагоддзяў ........ 67
**Коўшар Д. А.** Веткаўскія ліштвы як частка культурнай спадчыны стараабрадцаў ........ 76
**Омелюсик А. В.** Проблема сохранения традиционных промыслов белорусов в контексте борьбы с браконьерством ........ 84
**Селях А. А.** "На доўгую памяць": паэтычныя інскрыпты ў рукапіснай дзявочай культуры апошняй трэці XX стагоддзя (па матэрыялах з Заходняга Палесся) ........ 96

### ГІСТОРЫЯ, ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ

**Баран В. А.** Успаміны І. Я. Калеснікава як крыніца па гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў ..... 101
**Воробей А. В., Воробей И. А.** Берестейский арсенал в середине XVI века ........ 108
**Никитенкова Л. П.** К вопросу восточнославянских культурных связей в области просвещения в XVII веке: изучение и сохранение тенденций общеславянского наследия ........ 130

**Розмысл Е. В.** Мемориализация памяти Великой Отечественной войны в Щучинском районе: советский период (1944–1991) .................... 136

## КРАЯЗНАЎСТВА, ВЫХАВАННЕ, АДУКАЦЫЯ

**Алейнікаў Я. Д.** Паэма Міколы Гусоўскага “Песня пра зубра” як сродак патрыятычнага выхавання .......................................................... 150
**Корунец Д. А.** Потенциал историко-культурного и природного наследия Брестской области в воспитательных мероприятиях средней школы.................................................................................. 156
**Лавшук Д. Г.** Использование архитектурного наследия С. Д. Шабуневского в краеведческой работе ............................................ 162

# АРХЕАЛОГІЯ, АРХІТЭКТУРНАЯ СПАДЧЫНА

УДК 004.94

**О. А. Акулова, П. В. Кривицкий,**
**С. В. Басов, И. В. Ткачук, А. С. Манн**
Брест, Брестский государственный технический университет

## ТЕХНОЛОГИИ И ПЕРСПЕКТИВЫ СОЗДАНИЯ ЦИФРОВОГО ФОНДА ПАМЯТНИКОВ АРХИТЕКТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Сохранение памятников архитектуры Беларуси является важной социальной задачей, решение которой наиболее эффективно с применением современных цифровых информационных технологий, таких как лазерное сканирование, фотограмметрия, информационное моделирование. В статье показано применение такого подхода на примере каплицы-усыпальницы рода Толлочко, расположенной в д. Большая Раковица Брестской области. Полученные результаты могут быть использованы для создания цифрового фонда объектов историко-культурного наследия Беларуси.
**Ключевые слова:** историко-культурные ценности Республики Беларусь, обследование технического состояния, лазерное сканирование, информационная модель здания, среда общих данных.

The preservation of architectural monuments in Belarus is an important social task, the solution of which is most effective when using modern digital information technologies such as laser scanning, photogrammetry, and building information modeling. The article shows the application of this approach using the example of the the chapel-burial vault of the Tollochko kin located in the village of Bolshaya Rakovitsa in the Brest Region. The results obtained can be used to create a digital fund of historical and cultural heritage sites in Belarus.
**Keywords:** historical and cultural values of the Republic of Belarus, technical condition survey, laser scanning, building information model, common data environment.

В настоящее время Республика Беларусь активно занимается сохранением и восстановлением архитектурного наследия в целях его популяризации, развития туризма и укрепления престижа на международной арене. Это важная социальная задача, перспективным направлением решения которой является внедрение современных цифровых информационных технологий, получивших широкое распространение во всем мире [1].

Сохранение памятников архитектуры включает историко-археологические исследования, обследование технического состояния объекта, планирование и осуществление ремонта, консервации и реставрации.

Регулярные обследования технического состояния исторических объектов помогают своевременно определить возникающие риски, а также улучшить условия их эксплуатации.

При этом чаще всего для памятников архитектуры отсутствует какая-либо техническая или графическая информация. Кроме того, определение геометрических параметров ветхих зданий вручную с помощью измерительного инструмента и геодезического оборудования может быть затрудненным или даже опасным. В этом случае эффективным является применение лазерного 3D-сканирования и фотограмметрии, позволяющих получить огромный массив данных об объекте в виде облака точек, позволяющий создать его геометрическую модель, а при необходимости и информационную.

«Информационная модель – это объектно ориентированная параметрическая трехмерная модель, которая представляет в цифровом виде физические, функциональные и другие характеристики объекта (или его отдельных частей) в виде системы информационно насыщенных элементов» [2, с. 7].

Следует также отметить, что процесс создания цифровой информационной модели памятника архитектуры – это сложный и длительный процесс, который определяется необходимостью изучения архивных документов, исследования конструктивных особенностей объекта, а также воссоздания сложной геометрии декоративных архитектурных элементов.

Цифровая информационная модель может создаваться с помощью самых разных программных комплексов, а затем с помощью открытого стандарта обмена данными IFC (Industry Foundation Classes) загружаться на специализированные платформы для управления жизненным циклом объекта, представляющие собой среду общих данных (СОД). СОД позволяет специалистам различных областей получить доступ ко всей информации об объекте и, соответственно, принимать наиболее обоснованные и эффективные коллективные решения по управлению объектом.

Такой подход обеспечивает создание площадки для сотрудничества между архитекторами, историками, археологами, инженерами, техническими специалистами, владельцами, властями, а также специалистами туристической отрасли, что способствует популяризации историко-культурного наследия.

Свой вклад в сохранение памятников архитектуры Республики Беларусь вносит и отраслевая лаборатория «Научно-исследовательский центр инноваций в строительстве» научно-исследовательской части Брестского государственного технического университета. Так, лабораторией были выполнены обследования ряда исторических зданий, среди которых здание бывшего банка, расположенного на площади Замковой, д. 1 в г. Кобрине, здания бывшего монастыря бернардинок на территории Брестской крепости, каплицы-усыпальницы рода Толлочко, расположенной в д. Большая Раковица Брестской области. Остановимся отдельно

на последнем объекте, при обследовании которого применялись лазерное 3D-сканирование и технология информационного моделирования зданий и сооружений.

Первые упоминания о Раковице относятся к 1524 г., когда она входила в состав царской собственности, перешедшей позднее к Романовичам, Соколам и с 1565 г. к князьям Шуйским. В 1730 г. Игнаций Шуйский продал Раковицу вместе с прилегающими деревнями Станиславу Толлочко из Жмуди, герба Побуга. С тех пор и вплоть до 1939 г. усадьба принадлежала роду Толлочко.

Последним государственным деятелем деревни был Теодор Толлочко (1876–1946), который и построил в 1908–1910 гг. неоготическую каплицу-усыпальницу на родовом кладбище в честь святого Казимира.

Вокруг каплицы похоронены члены семьи, в том числе Станислав Толлочко (1868–1935), кавалер ордена Polonia Restituta, доктор философских наук, профессор Львовского университета.

Каплица пережила две мировые войны, после 1939 г. была закрыта и заброшена. В 1960-х гг. была предпринята попытка разрушения, в результате чего была частично повреждена башня со шпилем. С 1990-х гг. каплица периодически обновляется и ремонтируется [3; 4].

В 2019 г. каплица-усыпальница рода Толлочко была внесена в Государственный список историко-культурных ценностей Республики Беларусь (gosspisok.gov.by) и имеет категорию «3» (ценности районного значения).

Каплица представляет собой компактное каменное сооружение. Ее объемно-пространственное решение типично для памятников католической сакральной архитектуры первого десятилетия XX в.

Основной объем прямоугольный в плане с двускатной кровлей. Стены не оштукатурены, выполнены из серого цементно-песчаного кирпича, изготовленного безобжиговым способом. Такой кирпич имеет значительно большую всасывающую способность по сравнению с керамическим кирпичом, что приводит к его поверхностному разрушению под воздействием атмосферных осадков [5].

В стенах прорезаны оконные проемы в форме полуциркульных стрельчатых арок. Окна обрамляют гладкие оштукатуренные, расширяющиеся кверху пояса, а также рельефные панели в нижней части (рисунок 1, *а*).

Боковые и задний фасады каплицы имеют смещенные контрфорсы сложной геометрической формы (рисунок 1, *б*). Вход в каплицу оформлен в виде полуциркульного стрельчатого портала, обрамленного гладким оштукатуренным декором в виде ступеней с крестом и украшенного по бокам двумя пилястрами в виде башен (рисунок 1, *в*). Над входом расположена квадратная в плане башня, верхняя часть которой не сохранилась (рисунок 1, *в*). На заднем фасаде окно апсиды заложено силикатным кирпичом (рисунок 1, *г*).

а)



б)



в)



г)



Рисунок 1 – Декоративные архитектурные элементы
каплицы-усыпальницы рода Толлочко (Чаховіч Уладзіслаў, wikimedia.org):
а) оформление оконного проема; б) угловой контрфорс; в) вход в каплицу
с разрушенной башней; г) торцевой фасад с проемом, заложенным кирпичом

Таким образом, несмотря на небольшие размеры, каплица имеет большое число декоративных архитектурных элементов, многие из которых имеют значительные прогрессирующие разрушения.

С помощью лазерного сканера Leica BLK360 было выполнено сканирование объекта с 18 станций с погрешностью 6 мм [6]. Получено облако точек, которое в дальнейшем использовалось для создания цифровой информационной модели каплицы, в которой с помощью архивных фотографий (рисунок 2) была восстановлена геометрия разрушенных архитектурных элементов (рисунок 3).

Такая модель может содержать не только геометрические данные объекта, но и любую требуемую негеометрическую информацию, например о материалах, их экологических, структурных и механических характеристиках, сведения о культурной, исторической и архитектурной ценности, результаты обследования, архивные документы в оцифрованном виде и мн. др.

Цифровая информационная модель может стать единым источником информации об объекте, позволяющим эффективно управлять им на протяжении всего жизненного цикла, на этапах ремонта, консервации, реставрации.

а) б)



Рисунок 2 – Архивные снимки каплицы-усыпальницы рода Толлочко:
а) [7, с. 77]; б) [8, с. 52]



Рисунок 3 – Цифровая информационная модель
каплицы-усыпальницы рода Толлочко

Следующим шагом может стать создание цифрового фонда объектов архитектурного наследия с целью эффективного управления им и сохранения для будущих поколений, что является одним из основополагающих условий устойчивого развития и национальной безопасности Республики Беларусь.

**Источники и литература**

1. Брайан, Пол. BIM для культурного наследия: Разработка информационной модели исторического здания / Пол Брайан, София Антонополу. – [б. м.] : Изд. решения, 2019. – 106 с.

2. Моделирование информационное в строительстве. Основные положения по разработке стандартов информационного моделирования зданий и сооружений : ГОСТ Р 57563-2017/ ISO/TS 12911:2012 : введ. 28.07.2017. – М. : Стандартинформ, 2017. – 27 с.

3. Пашпарт гісторыка-культурнай каштоўнасці роду Талочкаў у в. Вялікая Ракавіца Брэсцкага раёна. – Брэстрэстаўрацыяпраект, 2019.

4. Гладыщук, А. А. Каплица Толлочков в Раковице – памятник неоготики / А. А. Гладыщук, С. В. Басов // Реставрация историко-культурных объектов в Брестской области как сохранение культурного наследия Республики Беларусь : сб. ст. науч.-техн. семинара, Брест, 25 сент. 2019 г. /

М-во образования Респ. Беларусь, Брест. гос. техн. ун-т ; редкол.: Э. А. Тур [и др.]. – Брест : БрГТУ, 2019. – С. 8–11.

5. Анализ технического состояния строительных конструкций бывшего монастыря бернардинок на территории Брестской крепости / А. Б. Шурин, В. Л. Шевчук, В. Н. Деркач, В. М. Терлецкий // Вестник Брестского государственного технического университета. – 2023. – № 1. – С. 71–75.

6. Лазерное сканирование каплицы-усыпальницы рода Толлочко, расположенной в деревне Большая Раковица Брестской области / О. А. Акулова, П. В. Кривицкий, И. В. Ткачук [и др.] // Реставрация историко-культурных объектов как сохранение наследия Республики Беларусь : сб. ст. науч.-техн. семинара (с междунар. участием), Брест, 23 сент. 2024 г. / Брест. гос. техн. ун-т ; редкол.: Э. А. Тур и [др.]. – Брест : БрГТУ, 2024. – С. 9–12.

7. Polesie Ilustrowane: monografja / red. O. Nelard. – Brześć : Drukarnia Orka Brygada, 1923. – 133 s.

8. Несцярчук, Л. М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў (гісторыя, стан, перспектывы) / Л. М. Несцярчук. – Мн. : БелТА, 2002. – 336 с.

**Да зместу**

УДК 902(476.7)

**А. А. Башкоў**
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна

# АРХЕАЛАГІЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ ТЭРЭСПАЛЬСКАГА МОСТА НА ТЭРЫТОРЫІ БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ*

Артыкул прысвечаны асноўным вынікам археалагічных даследаванняў канструкцый Тэрэспальскага моста на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці. Раскопкі былі праведзены ў 2013 г. у межах падрыхтоўкі праектнай дакументацыі па рэканструкцыі і ўзнаўленні гэтага ўнікальнага збудавання другой паловы XIX ст. У рабоце даецца характарыстыка стану захаванасці, аб'ектыўныя памеры і асаблівасці канструктыўных элементаў моста, аналіз прылеглых культурных напластаванняў і знойдзеных артэфактаў.
**Ключавыя словы:** археалогія, рэстаўрацыя, мост, культурны пласт, артэфакт.

The article is devoted to the main results of archaeological research of the structures of the Terespol Bridge on the territory of the Brest Fortress. Excavations were carried out in 2013 as part of the preparation of design documentation for the reconstruction and restoration of this unique structure of the second half of the 19th century. The work provides: a description of the state of preservation, objective dimensions and features of the structural elements of the bridge, analysis of adjacent cultural layers and found artifacts.
**Keywords:** archeology, restoration, bridge, cultural layer, artifact.

Мост у сістэме гарадской планіроўкі заўсёды адыгрываў вялікую ролю і выконваў шэраг важных функцый. Мост звязвае розныя часткі горада, дазваляючы людзям і транспарту пераадольваць ландшафтныя перашкоды, спрыяе развіццю інфраструктуры і эканамічным сувязям, а таксама з'яўляецца архітэктурна-эстэтычным элементам гарадской забудовы.

На тэрыторыі старога горада Бярэсця (сёння тэрыторыя Брэсцкай крэпасці) размяшчалася шэраг мастоў, якія забяспечвалі камунікацыю цэнтральнага горада, што размяшчаўся на выспе паміж рукавамі Мухаўца і Заходняга Буга, з Тэрэспальскім, Кобрынскім і Валынскім прадмесцямі.

Тэрэспальскі мост адыгрываў асобую ролю, бо выконваў яскрава выражаную прэзентатыўную функцыю, абумоўленую яго лакацыяй. Праз мост ажыццяўляўся ўезд у горад з боку Польшчы, што паўплывала на яго архітэктурнае рашэнне пры будаўніцтве Брэсцкай крэпасці. Пра яго знешні выгляд мы маем уяўленні дзякуючы архіўным дакументам (праектныя дакументы) і фотаздымкам пачатку XX ст.

* Праца падрыхтавана ў межах выканання НДП БРФФД “Спасательная археология в г. Бресте как элемент реализации государственной политики по охране историко-культурного наследия” на 2025–2027 гг.

Ён уяўляў сабой падвесную літую каркасную канструкцыю з драўляным насцілам. Над рэчышчам Заходняга Буга ўсю канструкцыю моста трымалі металічныя тросы. На заходнім беразе рэчкі тросы мацаваліся праз тры вертыкальныя пілоны ў анкеры, размешчаныя ў падземных калодзежах. На ўсходнім беразе – праз тры пілоны за канструкцыю ўязной Тэрэспальскай брамы.

Тэрэспальскі мост быў моцна пашкоджаны ў часы Першай сусветнай вайны пры адступленні рускай арміі. Існуюць фотаздымкі, на якіх відаць, як нямецкія жаўнеры праводзяць рамонтныя працы на мосце.

У міжваенны перыяд польскімі ўладамі была праведзена рэканструкцыя моста. Яго насціл быў перароблены, значна падняты над рэчышчам і пастаўлены на бетонныя канструкцыі, якія размяшчаліся па берагах. Гэта было абумоўлена неабходнасцю бесперашкоднага суднаходства па Заходнім Бугу.

Падчас штурмаў Брэсцкай крэпасці нямецкімі войскамі ў 1939 і 1941 гг. мост ацалеў. Ён быў разабраны канчаткова толькі напрыканцы Другой сусветнай вайны.

У пачатку 2000-х гг. у калідорах Брэсцкай абласной адміністрацыі нарадзілася і стала лабіравацца ідэя аб узнаўленні падвеснага Тэрэспальскага моста ў першародным выглядзе. Меркавалася, што ў выніку інтэграцыі Беларусі ў еўрапейскую супольнасць неабходна ствараць новыя камунікацыйныя шляхі. Тэрэспальскі мост павінен быў стаць пешаходным пагранічным пераходам паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча. Гэта дазволіла б значна пашырыць турыстычную плынь з Еўропы ў Брэст, павялічыўшы, такім чынам, прыток інвестыцый і фінансаў, а таксама папулярызаваць гісторыка-культурную спадчыну Брэсцкага рэгіёна і падняць міжнародны аўтарытэт Беларусі.

Праектная арганізацыя “Арміг” на чале з М. М. Гайдуковічам на падставе архіўных і фотадакументаў узялася за распрацоўку праекта па ўзнаўленні Тэрэспальскага моста. Неад’емнай часткай передпраектнай працы з’яўляліся археалагічныя даследаванні захаваных канструкцый моста і прылеглай да яго тэрыторыі.

У жніўні 2013 г. былі праведзены археалагічныя даследаванні ў зоне будучага будаўніцтва [1]. Асноўнай мэтай археалагічных даследаванняў было вывучэнне культурных пластоў на прылеглай да моста тэрыторыі, а таксама фіксацыя канструктыўных асаблівасцяў рэшткаў самога моста сярэдзіны XIX ст. У раскопках бралі ўдзел студэнты першага курса гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна.

На першым этапе кіраўніком экспедыцыі быў праведзены збор і вывучэнне даступных дакументальна-архіўных бібліяграфічных

і іканаграфічных матэрыялаў, фотаматэрыялаў, падрыхтавана кароткая гістарычная даведка. Афармлена адпаведная дагаворная дакументацыя. Атрыманы дазвол ад Інстытута гісторыі НАН Беларусі на правядзенне археалагічных даследаванняў. Падрыхтавана адпаведнае абсталяванне і арганізавана працоўная сіла.

Па ўзгадненні з генеральным праекціроўшчыкам і заказчыкам былі акрэслены канкрэтныя задачы, неабходныя для праектавання, – выявіць, даследаваць і зафіксаваць канструктыўныя элементы Тэрэспальскага моста (з боку Тэрэспальскай брамы – тры асновы пад пілоны; з боку Тэрэспальскага ўмацавання – апорную арку і месца мацавання аднаго з анкераў моста).

Актуальная сітуацыя на месцы раскопак выглядала наступным чынам. З боку Тэрэспальскай брамы канструктыўныя элементы моста не захаваліся. Толькі каменная аснова паўднёвага пілона і чыгунны элемент мацавання на паўночным пілоне праглядаліся над дзённай паверхняй.

На Тэрэспальскім умацаванні над арыгінальнай каменна-цаглянай асновай моста ў 20–30-я гг. XX ст. быў узведзены земляны насып для канструктыўнага рашэння па павышэнні ўзроўню моста над рэчышчам Заходняга Буга. У выніку ўсе арыгінальныя канструкцыі пілонаў і адпаведных мацаванняў нацяжных тросаў былі пахаваныя пад насыпным грунтам.

Улічвалася гістарычная тапаграфія старога горада да перыяду будаўніцтва Брэсцкай крэпасці. Для больш дакладнай прывязкі намі быў сумешчаны план горада Брэста 1823 г. з сучаснымі спадарожнікавымі здымкамі. Сумешчаныя планы паказалі, што ў пачатку XIX ст. паблізу месца плануемых раскопак знаходзіліся збудаванні, якія, напэўна, былі ўзведзены яшчэ ў XVIII ст. Гэта дало падставу меркаваць пра наяўнасць каля даследуемага моста культурных пластоў.

Шурфы з боку Тэрэспальскага моста і раскопы на Тэрэспальскім умацаванні былі прывязаны да распрацаванага праекта. На правым беразе Заходняга Буга, насупраць Тэрэспальскай брамы, было закладзена два шурфы агульнай плошчай 33 м$^2$ і глыбінёй да 0,60 м. У выніку былі выяўлены і даследаваны тры падмуркі для пілонаў. Яны ўяўлялі сабой каменную прастакутную базу памерам 2 × 2 м на цаглянай аснове, якая залягала на глыбіні 50 см ад дзённай паверхні. На правым (ад Тэрэспальскай брамы) падмурку пілона захаваўся чыгунны элемент для фіксацыі літой апоры пад нацяжныя тросы моста.

У ходзе раскопак было ўстаноўлена, што падчас будаўнічых прац XIX ст. і баявых дзеянняў Другой сусветнай вайны быў пашкоджаны культурны пласт старажытнага горада. Гэта прывяло да перамешвання стратыграфічных пластоў і траплянне артэфактаў больш ранняга часу ў верхнія пласты. У шурфах была сабрана невялікая калекцыя керамічнага і шклянога посуду, датаваная XVIII–XIX стст.

На левым беразе Заходняга Буга, на Тэрэспальскім умацаванні, уздоўж мяркуемага паўднёвага краю моста, быў закладзены раскоп плошчай 28 м$^2$. Глыбіня раскопу на некаторых участках дасягала 5 м. На верхняй насыпной пляцоўцы моста, на меркаваным месцы анкера, быў закладзены раскоп плошчай 27 м$^2$. Глыбіня ў заходняй яго частцы складала 2,45 м.

У раскопе 1 на Тэрэспальскім умацаванні, на глыбіні 1 м ад дзённай паверхні, былі зафіксаваныя каменна-цагляныя канструкцыі арыгінальнага моста сярэдзіны XIX ст. Ніжэйшы ўзровень іх залягання дасягаў 5 м ад дзённай паверхні. Была ўскрыта апорная цагляная арка моста, што дазволіла вызначаць аб’ектыўныя памеры дадзенага канструктыўнага элемента. Вышыня праёма аркі складала 3,2 м; таўшчыня фасаднага мура – 0,8 м; даўжыня аркі – 10,8 м; даўжыня праёма аркі – 9,2 м. Устаноўлена, што арка глыбінёй у 1,8 м не з’яўляецца маналітнай канструкцыяй. Яна служыла для ўмацавання бакавых сцен моста. Адначасова гэта прыклад эканоміі будаўнічага матэрыялу. Верагодна, аналагічныя дзве аркі знаходзіліся паралельна ў цэнтры моста і на яго правым (ад Тэрэспальскай брамы) баку. Аснова (пята) аркі ўяўляе сабой маналіт, складзены з некалькіх валуноў, звязаных вапнавым росчынам. Кладка мура – шэрагі “лажкоў” чаргуюцца з шэрагамі “тычкоў”. Ад аркі да краю моста (у бок ракі) зафіксавана апорная сцяна, складзеная з валуноў (дыяметр некаторых дасягаў 70 см) і цаглянага мура. Валуны былі звязаныя паміж сабой вапнавым росчынам і цагляным бутам. Край канструкцыі моста, з боку ракі, абкладзены каменнымі плітамі.

На глыбіні 1,8 м ад дзённай паверхні, у паўночнай частцы раскопу, прасочаны пласт буйна бітай цэглы ўперамешку з вапнавым росчынам і слядамі спаленага дрэва. Відавочна, гэта сляды разбураных будынкаў, якія існавалі паблізу даследуемага аб’екта ў XVIII ст. Магутнасць пласта дасягала 40 см. У гэтым стратыграфічным пласце і ніжніх пластах была сабрана значная калекцыя артэфактаў, датаваных XVII–XVIII стст.

Адзначым, што на глыбіні каля 3 м ад дзённай паверхні і пад апорнай аркай зафіксаваныя стратыграфічныя пласты, сфарміраваныя намываннем пяску і глею. У гэтых намытых ракой пластах таксама выяўлена вялікая колькасць артэфактаў XVII–XVIII стст.

Акрамя таго, насупраць ускрытага фасада аркі зафіксаваны ўкапаныя ў мацярык восем драўляных слупоў дыяметрам да 25 см. Верагодна, гэта рэшткі драўлянага моста, які папярэднічаў падвеснаму мосту сярэдзіны XIX ст.

У шурфе 3, на верхняй пляцоўцы маставога насыпу, былі прасочаны асаблівасці змен дарожнага пакрыцця пад’язной часткі. У паўночнай частцы шурфа на глыбіні 1 м зафіксавана ўтрамбаванае дробным

каменнем пакрыццё. Яно датуецца часам перабудовы Тэрэспальскага моста ў 1920–1930-я гг. Пад ім прасочана праслойка магутнасцю 1 м з буйна бітай чырвонай цэглы (для павышэння ўзроўню канструкцыі моста). Ніжэй, на глыбіні 2,4 м, зафіксавана яшчэ адно ўтрамбаванае дробным каменнем дарожнае пакрыццё. Яно, верагодна, было зроблена падчас рэканструкцыі моста нямецкімі войскамі ў перыяд Першай сусветнай вайны. Ніжэй за дадзенае пакрыццё, на глыбіні 2,6 м, зафіксавана першапачатковае дарожнае пакрыццё часоў стварэння і функцыянавання моста ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

У паўднёвай частцы шурфа 3 знойдзены канструктыўны элемент (анкер) для фіксацыі нацяжных тросаў Тэрэспальскага моста. Ён уяўляў сабой прастакутны чыгунны люк памерам 80 × 60 см, які зачыняе цагляна-каменны калодзеж глыбінёй у 2,6 м (часткова засыпаны пяском), куды працягваўся трос.

У ходзе даследавання культурных напластаванняў каля Тэрэспальскага моста сабрана значная археалагічная калекцыя, датаваная XVII – першай паловай XX ст. Вылучаецца нумізматычная калекцыя (11 экз.), у якой прадстаўлены медныя і білонавыя манеты рознай вартасці і геаграфічнага паходжання (Рэч Паспалітая, Расійская Імперыя, Царства Польскае).

Сярод індывідуальных знаходак можна адзначыць керамічныя люлькі для палення XVII–XVIII стст. Керамічны матэрыял прадстаўлены фрагментамі чырванагліняннага, задымленага, чорналошчанага сталовага і кухоннага посуду. Будаўнічая кераміка прадстаўлена фрагментамі тэракотавай і паліванай кафлі, сярод якіх вылучаецца багата аздобленая паліхромная кафля XVII ст. з сіняй і жоўтай палівай. Шкляны посуд XVII–XVIII стст. прадстаўлены фрагментамі чарак, шклянак, куфляў з імпартнага і мясцовага шкла.

У заключэнне адзначым, што ўсе пастаўленыя заказчыкам і праекціроўшчыкамі задачы археолагамі былі выкананы. Выяўлены, вывучаны і ўдакладнены канструктыўныя элементы Тэрэспальскага моста. Зафіксаваныя тры рознachасовыя дарожныя пакрыцці, якія вялі да моста. Вывучаны культурныя напластаванні каля вывучаемага аб’екта. Сабрана значная калекцыя археалагічнага матэрыялу XVII – першай паловы XX ст. Вынікі археалагічных даследаванняў 2013 г. былі апублікаваныя ў матэрыялах канферэнцый і навуковых зборніках [2; 3]. Аднак адзначым, што для поўнага вывучэння рэштак Тэрэспальскага моста неабходны больш маштабныя археалагічныя даследаванні на дадзенай тэрыторыі і абавязковы археалагічны нагляд за будучымі землянымі працамі ў ходзе аднаўлення гэтага ўнікальнага збудавання.

**Крыніцы і літаратура**

1. Башков, А. А. Отчет об археологических исследованиях на объекте «Реставрация с реконструкцией Тереспольского моста с набережной и Тереспольскими воротами» в 2013 г. // ЦНА НАН Беларусі. – ФАНД. Воп. 1. Арх. № 3098.

2. Башков, А. А. Результаты археологического исследования Тереспольского моста в 2013 г. / А. А. Башков // Историческое наследие Брестской крепости в исследованиях и экспозициях мемориала / М-во культуры Респ. Беларусь, мемориальный комплекс «Брестская крепость-герой» ; редкол.: Г. Г. Бысюк [и др.]. – Брест : Альтернатива, 2013. – С. 78–82.

3. Башков, А. А. Археологические исследования в районе Тереспольского моста и Тереспольских ворот Брестской крепости в рамках проектных и реставрационных работ 2011 и 2013 годов / А. А. Башков // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мн., 2016. – Вып. 27. – С. 234–246.

**Да зместу**

УДК 94(476)

**А. М. Вабішчэвіч**
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна

# АРХІТЭКТУРА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 ГГ.): ГІСТАРЫЧНЫ АГЛЯД

У артыкуле зроблены агляд стану і развіцця архітэктуры ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Сістэматызаваны звесткі пра відавую і стылістычную разнастайнасць архітэктуры, яе ідэалагічную накіраванасць у межах паланізацыі заходнебеларускіх зямель, пра аднаўленне і развіццё гарадоў, храмавае будаўніцтва, дзейнасць архітэктараў, спробы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры. Таксама вызначаны перспектыўныя напрамкі для далейшых навуковых даследаванняў гэтай праблематыкі.

**Ключавыя словы:** Заходняя Беларусь (1921–1939 гг.), Польшча, архітэктура, храмавае будаўніцтва, грамадзянская архітэктура, кансервацыя і рэстаўрацыя помнікаў архітэктуры, паланізацыя.

In the article, the author provides a overview of the state and development of architecture in Western Belarus in 1921–1939. Systematized information about the species and stylistic diversity of architecture, its ideological orientation within the framework of the Polonization of Western Belarusian lands, about the restoration and development of cities, church construction, the activities of architects, and attempts at conservation and restoration of architectural monuments. Promising directions for further scientific research on this issue are also identified.

**Key words:** Western Belarus in 1921–1939, Poland, architecture, church construction, civil architecture, conservation and restoration of architectural monuments, Polonization.

У айчыннай гуманітарнай навуцы мінулае архітэктуры заходняй часткі Беларусі, якая пасля савецка-польскай вайны 1919–1920 гг. да верасня 1939 г. апынулася ў Польскай дзяржаве, не было прадметам вывучэння да 1990-х гг. Напрыклад, у энцыклапедычным даведніку “Архітэктура Беларусі” (Мн., 1993) [1] у аглядным артыкуле нічога наогул не было сказана пра дойлідства Заходняй Беларусі. Толькі ў пачатку XXI ст. гісторыкамі, мастацтвазнаўцамі пачаўся працэс навуковага асэнсавання заходнебеларускай архітэктурнай спадчыны. Намі была толькі абазначана гэтая праблематыка ў пятым томе 6-томнай гісторыі Беларусі [2, с. 432] і манаграфіі [3, с. 140]. Гродзенскі даследчык А. М. Загідулін заняўся гістарыяграфіяй пытання, вызначэннем асноўных кірункаў развіцця архітэктуры і будаўніцтва, рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў архітэктуры ў Заходняй Беларусі [4–7]. Пытанні аховы гісторыка-культурнай спадчыны на заходнебеларускіх землях у 1921–1939 гг. закраналіся Л. М. Несцерчуком [8, с. 85–93] і асабліва Д. В. Марозавым у яго кандыдацкай дысертацыі [9] і публікацыях [10; 11]. У кандыдацкай дысертацыі Я. В. Марозава [12],

даследаваннях А. І. Лакоткі, А. С. Шамрук [13] праведзены мастацтвазнаўчы аналіз развіцця пераважна грамадзянскай архітэктуры Заходняй Беларусі (яе кампазіцыйныя і стылістычныя асаблівасці) паралельна з архітэктурай БССР 1920–1930-х гг. Сёння патрабуецца больш глыбокае вывучэнне горадабудаўнічых, тыпалагічных, канструктыўных асаблівасцей жылой і іншай забудовы [14, с. 5]. Культавым дойлідствам заходнебеларускага краю займаецца С. В. Харэўскі [15–17]. У энцыклапедычных даведніках А. М. Кулагіна [18; 19] змешчана каштоўная інфармацыя пра хрысціянскія храмы, якая патрабуе верыфікацыі. У разнастайных краязнаўчых даследаваннях таксама ўтрымліваюцца звесткі па гісторыі архітэктуры асобных гарадоў, мястэчак, вёсак.

У апошнія дзесяцігоддзі актывізавалася вывучэнне архітэктуры міжваеннай Польшчы ў замежнай (найперш польскай) навуцы. Сярод шэрага сучасных польскіх даследчыкаў, якія вывучаюць заходнебеларускае дойлідства, найперш варта адзначыць М. Пшчулкоўскага [20; 21].

Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца сістэматызацыя ведаў пра архітэктуру Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. (яе відавую і стылістычную спецыфіку, тэарэтычна-ідэалагічную аснову, аднаўленне і развіццё гарадской архітэктуры, храмавае будаўніцтва, дзейнасць архітэктараў, спробы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры і інш.).

Слабы ўзровень індустрыяльнага развіцця Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы ў 1921–1939 гг. стрымліваў рост горадабудаўніцтва, але знешняе аблічча яе гарадоў і мястэчак змянялася. Аграрна-сыравінны характар эканомікі заходнебеларускага рэгіёна спрыяў росту дробных сельскіх паселішчаў, хутароў. Адбывалася павольнае аднаўленне разбуранага і спаленага падчас Першай сусветнай і савецка-польскай войнаў. З-за недахопу дзяржаўнага фінансавання і скупасці мясцовых бюджэтаў аднаўленне адбывалася пераважна за кошт прыватнаўласніцкіх сродкаў. Аднак слабы ўзровень развіцця прадпрымальніцтва не спрыяў прамысловаму будаўніцтву. Архітэктары атрымлівалі пераважна дзяржаўныя заказы.

Яшчэ з ХІХ ст. у еўрапейскіх краінах у архітэктуры вяліся пошукі ўласных, агульнанацыянальных стыляў. З 1860-х гг. пачаліся тэарэтычныя дыскусіі і практычныя захады аб стварэнні польскага “нацыянальнага” стылю (styl narodowy). У яго гісторыі вылучаюць два перыяды: 1880-я гг. – 1905 г. і 1908–1928 гг. [22, s. 155–156]. Адной з разнавіднасцей польскага “нацыянальнага” стылю стаў “сядзібны” (“дваровы”) стыль (styl dwórkowy), у якім перапляліся неарэнесанс, неабарока і неакласіцызм. Узорам для яго з’яўляўся польскі шляхецкі маёнтак. Характэрнымі рысамі пабудоў “сядзібнага” (“дваровага”) стылю былі высокі, 4-схільны, ламаны дах, раскінутасць будынка, уваходны рызаліт ці порцік з трохвугольным франтонам, які абапіраўся на дзве ці чатыры калоны ў стылі класіцызму,

алькеж (кутняя, адасобленая частка будынка, выступ сцяны). Гэты стыль фарміраваў эстэтыку гарадскіх жылых пабудоў, пераважна калоній (комплексаў адміністрацыйных будынкаў, жылых дамоў для чыноўнікаў і вайскоўцаў), аб’ектаў грамадскага карыстання (службовых пабудоў, школ, чыгуначных вакзалаў) [23, s. 36–37]. Узвядзенне будынкаў у гэтым стылі асабліва адбывалася пры аднаўленні разбураных падчас вайны гарадоў і мястэчак, у тым ліку ў Заходняй Беларусі, дзе на велічныя архітэктурныя формы ўскладвалася ідэалагічная функцыя: яны павінны былі дэманстраваць моц і магутнасць Польскай дзяржавы. З канца 1920-х гг. “сядзібны” (“дваровы”) стыль страціў сваё значэнне і ўступіў месца мадэрнізму.

З 1924 г. была разгорнута дзяржаўная праграма па будаўніцтве згаданых калоній ва ўсходніх ваяводствах Польшчы, г. зн. і ў Заходняй Беларусі. Прадугледжвалася пабудаваць такія будынкі ў 44 населеных пунктах Навагрудскага, Палескага, Валынскага ваяводстваў і Віленшчыны. Іх праектаваннем і ўзвядзеннем займаліся варшаўскія і мясцовыя архітэктары, інжынеры. Агульнае кіраўніцтва было ўскладзена на асобнае прадстаўніцтва польскага Міністэрства грамадскіх работ у Брэсце [24, s. 3–12]. Калоніі для чыноўнікаў былі пабудаваны па тыпавых праектах у Брэсце, Навагрудку, Браславе і іншых гарадах. Таксама па праекце архітэктара Т. Навакоўскага было разгорнута ўзвядзенне казармаў, жылых будынкаў для Корпуса аховы памежжа – у Клецку, Давыд-Гарадку, Маладзечне і іншых населеных пунктах.

Аднаўленне і далейшая забудова Брэста, Пінска, Гродна і іншых гарадоў і мястэчак Заходняй Беларусі абапіраліся на горадабудаўнічыя традыцыі, вызначаныя генеральнымі планамі канца XVIII – пачатку XX ст. [13, с. 766]. Разам з традыцыяналісцкімі, неакласічнымі напрамкамі, эклектыкай у заходнебеларускім дойлідстве распаўсюджваліся авангардныя тэндэнцыі, шырока выкарыстоўваліся элементы мадэрну.

Падчас Першай сусветнай вайны ў Брэсце было знішчана 2500 дамоў з 3670, 1500 хат з 1700. Як паведамляў Брэсцкі магістрат у МУС Польшчы ў сакавіку 1925 г., горад “з вялікай цяжкасцю і вельмі павольна выбіраецца з галечы, выкліканай вайной” [25, с. 81]. Да канца 1927 г. было адноўлена толькі 730 дамоў. У горадзе вострым быў недахоп жылля, рабочым даводзілася жыць у антысанітарных умовах, некаторыя працягвалі жыць у падвалах разбураных дамоў, для бяздомных былі ўзведзены часовыя баракі ў прадмесці Граеўка. У 1920-я гг. у прадмесці Кіеўка за сродкі Амерыканскага яўрэйскага камітэта “Джойнт” для незаможных яўрэйскіх сем’яў была пабудавана калонія імя Ф. Варбурга (12 драўляных двухпавярховых дамоў). Дзякуючы мабілізацыі намаганняў мясцовага самакіравання і людзей, горад паступова аднаўляўся. Усяго ў 1919–1939 гг. у Брэсце было пабудавана 3139 будынкаў, з якіх 74 % былі драўлянымі [25, с. 55].

У архітэктуры Брэста 1920–1930-х гг. перапляліся ўсе характэрныя з’явы – ад акадэмічнага класіцызму праз мадэрнізаваны класіцызм і нацыянальныя стылі ў розных варыяцыях да экстрэмальнага мадэрнізму [26, с. 7]. Міжваенны генплан Брэста прадугледжваў лагічна звязанае завяршэнне планіровачнай структуры эспланады (тэрыторыі паміж горадам і крэпасцю), абдуманыя неакласічныя планіровачныя вырашэнні прадмесцяў Граеўка, Паўночны гарадок, а потым – усяго паўночнага (Рэчыца, Дуброўка, Граеўка, Бярозаўка) і ўсходняга (Трышын, Гузні) напрамкаў. Перспектывы вуліц замыкалі рэгулярныя плошчы, на восях былі размешчаны культавыя аб’екты, адміністрацыйныя будынкі. Гарадскія раёны былі злучаны паміж сабой дастатковай сеткай вуліц [27, с. 86]. У заходняй частцы (“Новай дзельніцы”) Брэста былі ўзведзены калоніі – калонія імя Г. Нарутовіча, Афіцэрская, “Тартак”, “Схроніско”, забудаваныя каменнымі і жылымі дамамі. Архітэктар Юльян Лісецкі пры распрацоўцы праектаў прытрымліваўся канцэпцыі горада-сада, выкарыстоўваў “нацыянальны” стыль – з высокімі дахамі ці атыкамі, каланадамі і пілястрамі, парталамі і арыгінальным аздабленнем вокнаў, асабліва каменных пабудоў сядзібнага тыпу [20; 28, с. 261, 289; 29; 30]. Сярод яго праектаў былі асабнякі (цяпер у іх размяшчаюцца музей “Выратаваныя мастацкія каштоўнасці”, Музей гісторыі горада), казіно і іншыя пабудовы ў Брэсце. Ім былі спраектаваны калоніі ў Маларыце, Дамачаве, Камянцы.

У жылой архітэктуры Заходняй Беларусі ў 1920-я гг. працягвалі развівацца традыцыяналісцкія напрамкі з выкарыстаннем элементаў готыкі, барока, класіцызму, эклектыкі, мадэрну, нацыянальных традыцый сядзібнай забудовы. У авангардным кірунку жылой архітэктуры (індывідуальных асабняках, шматкватэрных дамах) назіраліся разнастайныя прыёмы (стварэнне эфекту абцякальнасці аб’ёмаў, выяўленне ідэі прасторавай адкрытасці, імітацыя новых канструкцыйных прыёмаў, матэрыялаў і інш.) [13, с. 423–424]. У архітэктуры грамадскіх збудаванняў, банкаў, буйных асабнякоў вядучым стылем стаў канструктывізм. У дойлідстве маёнткаў, сядзіб, фальваркаў, царкоўных пабудоў назіралася стылёвая стракатасць, дзе інтэпрэтаваліся традыцыйныя гістарычныя формы, з якімі суіснавалі элементы стылю “ар-дэко” (набыў сусветнае пашырэнне якраз у міжваенны час), матывы народнага дойлідства [13, с. 766–767]. У 1930-я гг. авангардызм разам з ар-дэко, неакласіцызмам, традыцыяналісцкімі напрамкамі набыў папулярнасць у жыллёвым будаўніцтве Заходняй Беларусі [13, с. 426, 461].

Архітэктура мадэрнізму Брэста ў 1920–1930-я гг. (адміністрацыйныя будынкі, установы адукацыі, аховы здароўя, прыватныя жылыя дамы) увабрала ў сябе функцыяналізм, канструктывізм, неакласіцызм, манументалізм і іншыя стылявыя напрамкі. Яе асаблівасцямі былі простыя кубічныя формы, пераменная вышыня будынкаў, лентачныя вокны, плоскія дахі і інш.

Неакласіцызм і функцыяналізм вылучаліся арыгінальнасцю і разнароднасцю форм. У стылі неакласіцызму ўзведзены архітэктарам С. Філясевічам будынак аддзялення Польскага банка ў Брэсце (1926). Новыя будынкі банкаў былі пасля гэтага ўзведзены ў Пінску, Баранавічах, Гродне. На той жа вуліцы Люблінскай уніі (цяпер – вуліца Леніна) у Брэсце пабудаваны будынкі казённай палаты, акруговай палаты дзяржаўнага кантролю, побач – праектнага бюро меліярацыі Палесся (пазней там быў ваяводскі камунікацыйна-будаўнічы аддзел).

Ад вялікага пажару 7 жніўня 1921 г. была знішчана цэнтральная частка Пінска. Да верасня 1930 г. было ўзведзена 758 жылых пабудоў. "Вынікі таго пажару яшчэ цяпер адчувае збяднелае насельніцтва, і значная частка жыхароў на сённяшні дзень мае магчымасць для існавання дзякуючы атрыманню сціплай дапамогі ад сваякоў з Амерыкі" (з ліста гарадской рады ад 9 верасня 1929 г. палескаму ваяводу) [31, с. 434]. У верасні 1930 г. з агульнай колькасці жылых будынкаў (3585) большасць складалі драўляныя дамы, мураваных было толькі 512. З іх пасля 1922 г. былі ўзведзены 758 [31, с. 435]. Па праектах архітэктара М. Катовіча ў Пінску былі пабудаваны бальніца, яўрэйская гімназія, прыватныя жылыя дамы, адноўлены, перабудаваны ці ўзведзены нанова шэраг прадпрыемстваў.

Для будаўніцтва жылля для бяздомных бедных жыхароў Гродна гарадскі магістрат 9 студзеня 1930 г. вырашыў выдзеліць 200 тыс. злотых на будаўніцтва танных двухкватэрных дамоў (з пакоем і кухняй). Аднак з-за негатыўных наступстваў сусветнага эканамічнага крызісу толькі ў 1936 г. прыступілі да будаўніцтва некалькіх дзясяткаў такіх дамоў для бяздомных сем'яў (цяперашняя Брацкая вуліца) [32, с. 57].

Наогул, пры будаўніцтве масавага жылля для рабочых у гарадах і мястэчках Заходняй Беларусі ўзводзілі пераважна драўляныя 1-2-павярховыя баракі, драўляныя 1-2-кватэрныя дамы і флігелі. У дварах такіх пабудоў змяшчаліся агароды і сады, гаспадарчыя пабудовы, калодзежы ці калонкі. Звычайна водаправод, каналізацыя там адсутнічалі [13, с. 767]. У Гродне ў 1927 г. водаправодам карысталася ўсяго толькі 1240 абанентаў. Жыхары горада бралі ваду з 37 студняў і 11 свідравін, а таксама карысталіся рачной вадой, што ўскладняла санітарна-эпідэміялагічную сітуацыю [33, с. 309].

Цэлы шэраг царкоўных будынкаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі быў страчаны ў ходзе разгорнутай рэвіндыкацыі, г. зн. перадачы рымска-каталіцкай царкве культавых пабудоў, зямель, іншай рухомай і нерухомай маёмасці, што да канца XVIII ст. – 1839 г. належала грэка-католікам, але была перададзена праваслаўнай царкве. З 278 праваслаўных манастыроў, цэркваў, капліц, якія падвергліся рэвіндыкацыі ў 1918–1930 гг., у Віленскім ваяводстве было 40, Беластоцкім – 32, Навагрудскім – 28, Палескім – 19 (паводле іншых звестак – 16). У канцы 1920-х – першай

палове 1930-х гг. назіралася хваля масіраваных судовых разбіральніцтваў – пададзена 755 іскавых заяў, з іх на заходнебеларускія епархіі прыходзілася 478. У ходзе рэвіндыкацыі ў адабраных праваслаўных храмах ламаліся іканастасы, знішчаліся творы скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, адбываліся акты вандалізму на могілках [3, с. 89–90]. Палітыка Польскай дзяржавы была нацэлена на правядзенне канфесіянальных змен на карысць каталіцтва. Хоць польскі ўрад не забараняў ставіць новыя праваслаўныя храмы, рамантаваць цэрквы і капліцы, будаўніцтва праваслаўных цэркваў прадугледжвалася ў тых месцах, дзе святыні згарэлі, зруйнаваны ці страчаны падчас рэвіндыкацыі [34, с. 285]. Аднак з-за бюракратычнай валакіты не заўсёды ўдавалася атрымаць дазвол на будаўніцтва праваслаўных святыняў.

Сярод пабудаваных у 1921–1939 гг. праваслаўных (пераважна драўляных) храмаў у Палескім ваяводстве трэба адзначыць наступныя:

у Брэсцкім павеце – Крыжаўзвіжанская царква ў в. Амелянец (замест згарэлай перавезена царква св. Сергія і Германа з Яблычынскага манастыра, асвечана ў 1930 г.) [19, с. 10], у в. Шастакова (1924 г.) [34, с. 285];

у Кобрынскім павеце – Пакроўская царква (1937 г.) у в. Шляхецкі Камень (цяпер – Акцябр) [19, с. 8], у в. Казішча (1926 г.) [34, с. 285];

у Косаўскім павеце – Троіцкая царква ў мястэчку Целяханы (1934 г.) на месцы храма XIX ст. [19, с. 201], царква Раства Багародзіцы (1925 г.) на месцы папярэдняга храма ў в. Глінная [19, с. 57], а таксама Крыжаўзвіжанская царква ў в. Святая Воля (1922 г.) [34, с. 285];

у Лунінецкім павеце – царква на могілках у Лунінцы (1928 г.) [34, с. 285], царква св. Дыянісія ў в. Заастравечча (1933 г.) [19, с. 85];

у Пінскім павеце – Ільінская царква (1788 г.) у в. Вуйвічы была часткова перабудавана ў 1937 г. [19, с. 44];

у Пружанскім павеце – цагляная Сімяонаўская царква ў мястэчку Малеч (1928 г.) у рэтраспектыўна-рускім стылі (на месцы храма 1880-х гг.) [19, с. 124], Пакроўская царква ў в. Равяцічы (1933 г.) [19, с. 172], а таксама ў вёсках Харава, Сялец, Ястрабель [34, с. 285];

у Столінскім павеце – царква Узнясення (Ушэсця) Гасподнягa (1938 г.) у Століне, у неарускім стылі на месцы мураванай Троіцкай царквы (1815 г.) [19, с. 188], Троіцкая царква ў Калоніі (в. Гарадная) перабудавана (дабудавана вежа-званіца) у 1930-я гг. [19, с. 55], у вёсках Відзібор (1922 г.), Бухлічы (1928 г.) [34, с. 285] і інш.

У Навагрудскім ваяводстве з падзей, звязаных з праваслаўным храмабудаўніцтвам ці рамонтам, найперш трэба адзначыць наступныя:

у Навагрудскім павеце: рэканструкцыю ў 1923–1924 гг. сабора св. Барыса і Глеба ў Навагрудку [19, с. 143]; у 1926 г. на месцы храма 1860-х гг. была ўзведзена з бетонных блокаў у неарускім стылі царква

Раства Багародзіцы ў в. Явар [19, с. 212], а ў 1936 г. у неарускім стылі пабудаваны з цэглы храм Усіх Святых у в. Дольная Рута [19, с. 74];

у Баранавіцкім павеце – Мікольская царква ў в. Малахоўцы (1920-я гг.) [19, с. 124], Георгіеўская царква ў в. Вялікія Лукі (1923–1926 гг.), Мікалаеўская царква ў в. Палонка, аднаўлялася ў 1920-я гг. Ільінская царква ў в. Адахаўшчына [34, с. 285].

На месцы царквы ў Баранавічах, якая згарэла ў 1921 г., было вырашана ўзвесці новы храм. Камітэт па будаўніцтве Пакроўскай царквы ўзначаліў беларускі сенатар А. Назарэўскі. На працягу 1924–1931 гг. быў пабудаваны ў стылі неакласіцызму цагляны праваслаўны Пакроўскі сабор у Баранавічах па праекце архітэктара М. Абалонскага. У храме ўсталявалі прывезены іканастас з дамавой царквы каралеўскага замка ў Варшаве. А. Назарэўскі дабіўся, каб у Баранавічы была перавезена ў 1926–1928 гг. з разбуранага ў Варшаве праваслаўнага сабора Аляксандра Неўскага частка мазаічных пано, якія былі выкананы яшчэ ў пачатку XX ст. у майстэрні Фраловых у Санкт-Пецярбургу па кардонах знакамітых рускіх мастакоў. Такім чынам, у 1929–1931 гг. у Пакроўскім саборы ў Баранавічах былі ўсталяваны мазаікі па эскізах В. Васняцова (“Табе радуецца”), М. Кошалева (“Хрыстос з данатарам” (“Слова Аляксандра Неўскага”), “Дэісус”), М. Бруні (“Сабор архангела Міхаіла і ўсіх нябесных сіл бесцялесных”, “Маці Божая з анёльскімі чынамі”), В. Думітрашкі (мазаічныя іконы мітрапаліта Алексія, які быў мітрапалітам Кіеўскім і Усяе Русі ў 1354–1378 гг., і прападобнага Іосіфа Валоцкага, царкоўнага дзеяча і пісьменніка XV – пачатку XVI ст.). Пры мантажы страчаныя часткі мазаік запаўняліся фрэскавым жывапісам. Гэтыя славутыя мазаічныя кампазіцыі ў інтэр’еры і экстэр’еры Пакроўскага сабора надаюць яму непаўторны мастацкі вобраз [19, с. 17–18; 35, с. 11–25; 36, с. 113–127].

У Вілейскім павеце Віленскага ваяводства ў в. Спягла была пабудавана ў 1923 г. драўляная царква Успення Багародзіцы [19, с. 186], а ў в. Некасецк у 1926 г. – драўляная Троіцкая царква [19, с. 146].

У 1938 г. была разабрана праваслаўная царква св. Аляксандра Неўскага (1870 г.), што стаяла ў цэнтры Палацавай плошчы (цяпер плошчы Тызенгаўза) Гродна – помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю [19, с. 240]. Спасылаліся на тое, што быццам перашкаджала дарожнаму руху на плошчы. Абяцалі яе аднавіць у іншым месцы, аднак з пачаткам Другой сусветнай вайны гэта стала немагчымым.

У міжваенны час у Заходняй Беларусі быў узведзены цэлы шэраг каталіцкіх святыняў. Сярод пабудаваных ці адноўленых у Віленскім ваяводстве былі наступныя каталіцкія храмы:

у Ашмянскім павеце – пасля рэвіндыкацыі быў адноўлены ў 1926 г. касцёл Міхаіла Архангела ў Смаргоні, пашкоджаны падчас Першай

сусветнай вайны, а яшчэ быў пабудаваны ў стылі мадэрн з цэглы па праекце архітэктара А. Дубановіча касцёл Маці Божай Ружанцовай у мястэчку Солы (1926–1934 гг.) – замест касцёла, таксама страчанага ў ваенны час (выдаткі на будоўлю святыні складалі 540 тыс. злотых; у роспісах касцёла ўдзельнічаў мастак П. Сергіевіч), драўляны касцёл св. Андрэя Баболі ў в. Градаўшчына (1938 г.) [18, с. 146–147; 40], на месцы барочнага храма ў мястэчку Крэва, які быў разбураны падчас Першай сусветнай вайны, у 1934–1936 гг. узведзены драўляны касцёл;

у Браслаўскім павеце – касцёл Найсвяцейшай Маці Божай Анёльскай у в. Мяжаны (1923–1928 гг.) па праекце віленскага архітэктара Юліуша Клоса; Петрапаўлаўскі касцёл у Дрысвятах (1929 г.) па праекце архітэктара Лявона Вітан-Дубейкаўскага (ім жа аднаўляліся ў 1920-я гг. Троіцкі касцёл у Відзах, у 1934–1938 гг. – Троіцкі касцёл і кляштар бернардзінцаў у Друі), касцёл св. Станіслава ў в. Далёкія ў 1930-я гг. [18, с. 106; 24; 25];

у Вілейскім павеце – з 1937 г. узводзіўся драўляны касцёл у в. Хаценьчыцы, аднак да верасня 1939 г. не быў пабудаваны, знішчаны ў 1940-я гг.;

у Віленска-Трокскім павеце – адноўлены ў 1920-я гг. касцёл Міхаіла Архангела ў Міхалішках, пашкоджаны падчас Першай сусветнай вайны [18, с. 101–102];

у Дзісенскім павеце – цагляны касцёл Маці Божай Шкаплернай у в. Ідолта (1937–1939 гг.) у стылі мадэрн [18, с. 170], у пачатку 1930-х гг. у мястэчка Варапаева быў перавезены з Дунілавічаў драўляны касцёл.

У Навагрудскім ваяводстве новыя каталіцкія храмы з’явіліся ў наступных паветах:

у Баранавіцкім павеце – касцёл Узвіжання Святога Крыжа (1924–1925 гг.) з рысамі эклектыкі і касцёл Маці Божай Каралевы ў Баранавічах (1930-я гг.) [18, с. 12–13, 163; 34, с. 298], касцёл у в. Завоссе (1932 г.), касцёл Бязгрэшнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі ў в. Рачканы (1928 г.), пасля рэвіндыкацыі быў перабудаваны ў 1930 г. касцёл Маці Божай Ружанцовай у в. Гарадзішча [18, с. 178, 195; 34; 35];

у Валожынскім павеце – пабудаваны касцёл у мястэчку Лоск (1930 г.) [18, с. 88], касцёл Іаана Хрысціцеля ў в. Выгаляненты (1929 г.) [18, с. 30–31], адноўлены касцёл св. Тадэвуша ў мястэчку Вішнева (1935 г.) [18, с. 28];

у Лідскім павеце – драўляны касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі ў Лідзе (1933 г.) [18, с. 205], на месцы драўлянага касцёла пабудаваны архітэктарам Я. Бароўскім з цэглы і каменю ў стылі мадэрн касцёл Маці Божай Ружанцовай у мястэчку Радунь (1929–1931 гг.) [18, с. 130], быў адрамантаваны ў 1928 г. касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай Панны Марыі (XIX ст.) у в. Тракелі [18, с. 152], пабудаваны касцёл Найсвяцейшага Сэрца Ісуса і св. Андрэя Баболі ў 1927–1929 гг. у в. Мінойты;

у Навагрудскім павеце – касцёл Найсвяцейшага Сэрца Ісуса ў мястэчку Наваельня (1936 г.) [18, с. 108], цагляны касцёл Маці Божай

Нястомнай Дапамогі ў мястэчку Карэлічы (1938 г.) [18, с. 204], драўляны касцёл св. Іосіфа ў в. Руда Яварская (1936 г.) [18, с. 134];

у Нясвіжскім павеце – адноўлены касцёл у мястэчку Сноў [18, с. 146–147];

у Слонімскім павеце – рэканструяваны касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі ў Слоніме (1920-я гг.), які стаў гарнізонным храмам [18, с. 143–144], праведзена ў 1925 г. рэстаўрацыя касцёла Св. Андрэя (XVIII ст.) у Слоніме, разбуранага падчас Першай сусветнай вайны [18, с. 144–145];

у Стаўбцоўскім павеце – праведзена рэстаўрацыя ў 1921 г. касцёла св. Казіміра і кляштара дамініканцаў у Стоўбцах, пабудаваны мураваны касцёл Найсвяцейшага Сэрца Ісуса ў в. Хатава (1931–1934 гг.) [18, с. 199, 202] і інш.

У Палескім ваяводстве ўзведзены наступныя каталіцкія святыні:

у Брэсцкім павеце – у Брэсцкай крэпасці па праекце архітэктара Ю. Лісецкага ў 1924–1928 гг. была перабудавана гарнізонная праваслаўная царква ў касцёл св. Казіміра з элементамі неабарока [30, s. 10]. Акрамя таго, пад яго кіраўніцтвам у Брэсце праводзіліся работы па кансервацыі і рамонце касцёла і кляштара езуітаў (1924–1926 гг.), кляштара бернардзінак (1926–1932 гг.) [28, с. 289]. Быў пабудаваны касцёл Найсвяцейшага Сэрца Ісуса ў прадмесці Граеўка ў Брэсце (1932 г.) [34, с. 298], пасля пажару 1924 г. праводзілася аднаўленне мураванага Петрапаўлаўскага касцёла ў Камянцы (1935–1939 гг.) [18, с. 180], узведзены з цэглы ў стылі мадэрн касцёл Найсвяцейшага Сэрца Ісуса у Пелішчах (1934 г.) [18, с. 120], касцёл у в. Вярховічы (1933–1934 гг.) на месцы зруйнаванага старажытнага храма [18, с. 33];

у Драгічынскім павеце – касцёл Маці Божай Каралевы ў Драгічыне (1928 г.) [34, с. 298];

у Кобрынскім павеце – касцёл св. Андрэя Баболі ў мястэчку Антопаль (1938 г.) у стылі канструктывізму [18, с. 9], адноўлены ў 1921 г. Троіцкі касцёл у в. Дзяткавічы [18, с. 176];

у Косаўскім павеце – касцёл Іаана Багаслова і св. Параскевы (1932 г.), узведзены намаганнямі і на ахвяраванні святара Б. Пачопкі на могілках у в. Бабровічы [18, с. 163];

у Лунінецкім павеце – касцёл Маці Божай Каралевы ў мястэчку Мікашэвічы (1935–1937 гг.);

у Пінскім павеце – праведзена рэстаўрацыя ў 1920 г. касцёла (капліцы) Узвіжання Святога Крыжа ў в. Дубай [18, с. 59], адрэстаўраваны ў 1926 г. касцёл Маці Божай Ружанцовай у в. Атолчыцы [18, с. 162];

у Пружанскім павеце – касцёл ў Лінаве (1935 г.) [18, с. 87];

у Столінскім павеце – касцёл Божага Цела ў Давыд-Гарадку (1936 г.) у стылі канструктывізму.

У Беластоцкім ваяводстве неабходна адзначыць найбольш важныя падзеі, звязаныя з будаўніцтвам і рамонтам каталіцкіх храмаў:

у Ваўкавыскім павеце – праведзена ў 1924–1932 гг. рэстаўрацыя касцёла св. Міхаіла Архангела ў Гнезне, помніка беларускай готыкі з элементамі рэнесансу XVI ст. [18, с. 39], аднаўляўся Троіцкі касцёл у Лыскаве [18, с. 91], пабудаваны ў 1934–1936 гг. касцёл Маці Божай Нястомнай Дапамогі ў в. Ізабелін;

у Гродзенскім павеце – узведзены касцёл з цэглы ў в. Галынка (1922 г.) [18, с. 33–34], цагляны касцёл Раства Найсвяцейшай Панны Марыі ў в. Баля Касцельная (цяпер – Зарачанка) (1937 г.) у неагатычным стылі [18, с. 66], пасля перадачы ў 1933 г. католікам быў адноўлены касцёл св. Антонія Падуанскага ў в. Малая Бераставіца [18, с. 94–95], пабудаваны ў 1918–1919 гг. драўляны касцёл св. Іуды Тадэвуша ў в. Прывалкі.

Пасля пажараў 1923 і 1935 гг. вядомыя варшаўскія архітэктары В. Генеберг (праектаваў калонію для чыноўнікаў, дом ваяводы ў Навагрудку) і О. Сасноўскі (аўтар праектаў касцёлаў у Варшаве, Любліне, Беластоку) праводзілі перабудову і рэканструкцыю гарнізоннага касцёла Найсвяцейшай Панны Марыі (Фары Вітаўта) у Гродне, якая набыла рысы раманска-гатычнай архітэктуры. У 1807–1919 гг. гэта быў праваслаўны Сафійскі сабор [18, с. 174]. Да нашага часу гэты помнік архітэктуры не захаваўся, бо быў узарваны 29 лістапада 1961 г.

У 1920–1930-я гг. за кошт вернікаў, ахвяраванняў прыватных асоб, замежнай дапамогі аднаўляліся, рамантаваліся старыя татарскія мячэці, узведзены некаторыя новыя святыні. У Віленскім ваяводстве праводзіліся будаўнічыя ці аднаўленчыя работы на наступных аб’ектах:

у Браслаўскім павеце – узведзены абшчынны малітоўны дом (1927 г.), адбудавана мячэць у мястэчку Відзы (1934 г.) на старым месцы замест згарэлай падчас Першай сусветнай вайны;

у Дзісенскім павеце – пабудаваны малітоўныя дамы ў Докшыцах (1925–1926 гг.) і Глыбокім (1931 г.);

у Пастаўскім павеце – узведзена замест спаленай новая мячэць у мястэчку Мядзел (1923 г.), якая рамантавалася ў 1930 г.

Найбольш аднаўленне і рамонты закранулі мячэці Навагрудскага ваяводства:

у Баранавіцкім павеце – замест спаленай падчас Першай сусветнай вайны адбудавана ў 1928 г. мячэць у мястэчку Ляхавічы (фундатарамі былі польскія ўлады, татарскія эмігранты ў ЗША, кароль Егіпта Фуад I);

у Лідскім павеце – праведзены рамонт (замена мінарэта) у 1922 г. у Мураўшчызне (Іўі) (фундатары – татарскія эмігранты ў ЗША), замест мячэці XVIII ст., спаленай у 1915 г., адбудавана ў 1926 г. на сродкі Я. Рамановіча і датацыі польскіх улад мячэць у Некрашунцах;

у Навагрудскім павеце – адбываўся ў 1936 г. рамонт мінарэта і мячэці 1796 г. у Навагрудку;

у Нясвіжскім павеце – рамантавалася ў 1930–1931 гг. мячэць 1881 г. (1883 г.) у Клецку (фундатары – татарскія эмігранты ў ЗША), перабудавана ў 1924–1925 гг. мячэць у Асмолаве (1834 г.);

у Слонімскім павеце – рамантавалася ў 1930 г. мячэць (1883 г.) у Слоніме;

у Стаўбцоўскім павеце – рамантавалася ў 1925, 1928 гг. мячэць у Міры, пабудаваная да 1795 г. [3, с. 249–251].

Варта адзначыць, што некаторыя з вышэйпералічаных хрысціянскіх (праваслаўных, каталіцкіх), мусульманскіх храмаў не захаваліся да сённяшніх дзён ці былі перабудаваны.

У стылі функцыяналізму ўзведзены шэраг будынкаў грамадскага прызначэння (дзяржаўных устаноў, судоў) у Брэсце, Пінску, Навагрудку, казармы ў Брэсце, Пінску, Кобрыне, у 1930-я гг. – прыватныя асабнякі, жылыя дамы, крамы ў Брэсце, Гродне, Пінску, Кобрыне, Лідзе, Баранавічах, Маладзечне, Глыбокім і іншых гарадах. Найбольш значныя з іх – будынкі Палескага ваяводскага ўпраўлення (1938 г., архітэктар С. Папеўскі), гарадскога суда, бальнічнай касы ў Брэсце, паштамт і гімназія імя К. Хадкевіча ў Лідзе, жылы дом для афіцэрскага саставу ў Паставах і інш. [21, s. 18–51, 63–84, 98–105, 170–182].

Цэлы шэраг мадэрнісцкіх грамадскіх пабудоў і прыватных сядзіб узвёў у Брэсце архітэктар Юзаф Бараньскі. Сярод іх – лютэранская кірха (1938 г.). Той жа Ю. Бараньскі спраектаваў у Брэсце для ўласнага выкарыстання жылы 3-павярховы дом (цяпер – вуліца Гогаля, 18), узведзены ў 1936 г., дзе спачатку размяшчалася бюро аднаго з аддзелаў камандавання корпуса акругі № 9. Галоўны ўваход у будынак быў вылучаны тэрасай на двух прамавугольных слупах. Да паўднёва-заходняй часткі будынка быў далучаны паўцыркульны эркер з тэрасай на даху, а фасады былі рытмічна прарэзаны высокімі прамавугольнымі вокнамі [26, с. 13].

Папулярным у сядзібным будаўніцтве ў Польшчы стаў "закапанскі" стыль (styl zakopiański) з пераважна драўлянай архітэктурай, распрацаваны архітэктарам С. Віткевічам у 1890-я гг. У пачатку XX ст. гэты стыль пашырыўся за межы г. Закапанэ. У 1920-я гг. будынкі "закапанскага" стылю з'явіліся ў Браславе, Глыбокім, Шаркаўшчыне, Мёрах, Мосары, Гальшанах, Ашмянах, Валожыне, Нясвіжы, Закозелі, Брэсце, Навагрудку і іншых населеных пунктах Заходняй Беларусі. Віленскі архітэктар Ю. Клос, які быў добра знаёмы з дойлідствам "закапанскага" стылю, узводзіў калоніі для чыноўнікаў у Браславе, Дунілавічах, казармы ў Беразвеччы (Дзісенскі павет) і іншыя аб'екты архітэктуры.

Паводле праекта Ю. Клоса ў Браславе на ўзгорыстай пляцоўцы ля возера Дрывяты ў 1924–1926 гг. узведзены комплекс з 18 грамадскіх і гаспадарчых пабудоў (суд, жылы дом для павятовага старасты, дом спорту, дом інжынера, сядзібныя жылыя дамы для служачых і інш.). У 1929 г. там пабудаваны 2-павярховы будынак павятовага староства [37, с. 19; 38]. Пасля ўзвядзення комплексу каля яго пачаў фарміравацца новы грамадскі цэнтр Браслава.

У Гродне ў раёне Новы свет былі пабудаваны ў стылі канструктывізму арыгінальныя драўляныя жылыя будынкі з элементамі мадэрну, “закапанскага” стылю, традыцый беларускага народнага дойлідства. На Залатой горцы, якая была часткай Новага свету, былі ўзведзены драўляныя жылыя сядзібныя будынкі. Сярод буйных прамысловых і грамадзянскіх пабудоў у Гродне з’явіліся будынак павятовага банка, Дом стральца (Дом афіцэраў), вялікі склад тытунёвай фабрыкі (у Занёманскай частцы) і інш. Дом стральца (Саюза легіянераў), узведзены ў 1935–1936 гг., з’яўляецца 3-павярховым цагляным, атынкаваным будынкам з характэрнай для стылю “ар-дэко” яруснай аб’ёмна-прасторавай кампазіцыяй. У ім мастацкая выразнасць дасягаецца камбінаваннем розных па вышыні і аб’ёме частак будынка, розных па велічыні вокнаў [32, с. 28–29]. Элементы мадэрнісцкай архітэктуры (“закапанскага” стылю, неабарока) выразна прасочваюцца ў забудове драўляных жылых асабнякоў, дамоў з некалькімі кватэрамі (цяперашняй вуліцы Чырвонапартызанскай).

У Гродне на вуліцы 17 верасня размешчаны жылыя асабнякі “сядзібнага” (“дваровага”) ці “закапанскага” стыляў, якія нярэдка называюць неабарочнымі. Яскравым прыкладам гэтага польскага мадэрну з’яўляецца асабняк на вуліцы 17 верасня (дом № 12) – мураваны, аднапавярховы, з мезанінам, высокім ламаным, складанай канфігурацыі, дахам, пакрытым плоскай керамічнай дахоўкай [32, с. 340].

Даследаванні ў галіне архітэктуры К. Дуж-Душэўскага мелі вялікае значэнне для фарміравання архітэктуры Беларусі першай паловы XX ст. [16, с. 14]. Віленскі архітэктар Л. Вітан-Дубейкаўскі спрабаваў распрацаваць тэорыю беларускага нацыянальнага дойлідства, асобнага “беларускага” стылю. Яго праца “Эвалюцыя і рэформа драўлянага будаўніцтва” (1940) засталася ў рукапісе. Творчасць Л. Вітан-Дубейкаўскага вылучалася новым метадам апрацоўкі дрэва, арыгінальнымі драўлянымі пабудовамі [15; 39].

Транспартная інфраструктура ў Заходняй Беларусі развівалася слаба. У 1938 г. на 100 км$^2$ у Палескім ваяводстве прыходзілася 2,6 км дарог з цвёрдым пакрыццём, у Віленскім – 7,1 км, у Навагрудскім – 9,6 км, а ў цэнтральных і заходніх польскіх ваяводствах – 20–30 км. Па стану на 1936 г., пры захаванні тагачасных інвестыцый Палескае ваяводства магло дасягнуць узроўню гушчыні брукаваных дарог Варшаўскага ваяводства

толькі праз 140 гадоў [2, с. 355]. Павольным было развіццё чыгуначнага транспарту. Да 1934 г. была пабудавана чыгуначная лінія Парэчча – Друскенікі (17 км), да 1938 г. – Варапаева – Друя (89 км). Для вывазу прадукцыі лясной гаспадаркі Заходняй Беларусі актыўна выкарыстоўвалі вузкакалейкі.

У 1932 г. у Пінску ўступіў у дзеянне мост са стальной канструкцыяй праз раку Піну. Да сярэдзіны 1930-х гг. быў адноўлены стары мост (1909 г.) праз раку Нёман у Гродне, які быў узарваны адступаючымі расійскімі войскамі ў 1915 г. Мост меў даўжыню 165 м, шырыню – 12,5 м, яго металічныя канструкцыі важылі 950 т, а агульны кошт аднаўлення складаў 1,84 млн злотых [32, с. 238].

У 1930-я гг. пачалі актыўна будавацца ракадныя (аб'язныя) шляхі зносін (пераважна брукаваныя дарогі), якія мелі больш ваенна-стратэгічнае, чым сацыяльна-эканамічнае значэнне. З найбольш буйных шляхоў зносін на Палессі была ўзведзеная ў 1938 г. дарога Пінск – Кобрын, у пакрыцці якой выкарыстоўвалі трылінку (6-гранную бетонную плітку). Трылінку прымянялі і ў іншых мясцовасцях заходнебеларускага краю. У 1937 г. быў пабудаваны чыгуначны ліцэй у Брэсце. У межах польскага "нацыянальнага" стылю, з рысамі "закапанскага" стылю па праектах інжынера-архітэктара Г. Грынцэвіча быў перабудаваны цэнтральны чыгуначны вакзал у Брэсце, узводзіліся чыгуначныя вакзалы ў Слоніме, Ваўкавыску, Пінску, а таксама чыгуначны вакзал у Стоўбцах (суўтарам быў інжынер Г. Генела, з якім разам працаваў у Віленскай дырэкцыі дзяржаўнай чыгункі; магчыма, што і іншыя згаданыя праекты ствараліся сумесна) [40, s. 70–71].

Польскія ўлады вымушаны былі рабіць адпаведныя захады ў справе аховы помнікаў архітэктуры, аднак ажыццяўлялі гэта ў кантэксце паланізацыі заходнебеларускага краю. Яны абапіраліся на законы "Аб ахове мастацтва і помнікаў старажытнасці" (1928), "Аб апецы над грамадскімі зборамі" (1933). Пры міністэрстве веравызнанняў і грамадскай асветы Польшчы дзейнічаў дэпартамент мастацтва з аддзелам помнікаў і музеяў. Ахова помнікаў фінансавалася з дзяржаўнага бюджэту, фондаў рэлігійных абшчын і свецкіх грамадскіх арганізацый, асабістых сродкаў уласнікаў помнікаў. Пасля структурных пераўтварэнняў у 1930-я гг. тэрыторыя Віленскага, Навагрудскага ваяводстваў увайшла ў склад Віленскай акругі па кансервацыі, Палескага ваяводства – Люблінскай акругі, Беластоцкага ваяводства – Варшаўскай акругі.

Паводле ваяводскіх аддзелаў мастацтва, у 1920–1930-я гг. была праведзена фотафіксацыя 20 тыс. гістарычных аб'ектаў, падрыхтавана 4,5 тыс. планаў, схем размяшчэння помнікаў архітэктуры і гісторыі, абмерана 1856 архітэктурных аб'ектаў [8, с. 87–88]. Для Заходняй Беларусі важнай з'яўлялася дзейнасць па інвентарызацыі помнікаў Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў, пачатку кансервацыі, рэстаўрацыі шэрага

аб'ектаў архітэктуры, якую ажыццявіў Е. Рэмер, кансерватар Віленскай (Віленска-Навагрудскай) акругі па кансервацыі ў 1922–1929 гг., кіраўнік Варшаўскай (Варшаўска-Беластоцкай) акругі па кансервацыі ў 1938–1939 гг. [10]. Фотамастак Я. Булгак прымаў актыўны ўдзел у фотафіксацыі кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў Вільні і Віленшчыны. Кіраўнік Віленскай (Віленска-Навагрудскай) акругі па кансервацыі ў 1929–1935 гг. С. Лорэнц сфармуляваў канцэпцыю кансервацыі руін замкаў Віленшчыны і Навагрудчыны, вывучаў культурную спадчыну, займаўся пытаннямі аховы помнікаў [11].

Былі зроблены практычныя захады па кансервацыі руін замкаў у Навагрудку, Лідзе, Крэве, Старога замка ў Гродне. Мастак Ф. Рушчыц беспаспяхова спрабаваў зацікавіць польскія ўлады ідэяй стварэння скансена (музея пад адкрытым небам). Па праекце архітэктара Т. Буршэ праводзілася рэстаўрацыя прыватнаўласніцкага замка ў Міры яго ўладальнікам М. Святаполк-Мірскім. У 1920–1930-я гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі праводзіліся мерапрыемствы па кансервацыі і рэстаўрацыі ўсіх тыпаў помнікаў грамадзянскай архітэктуры (ратуш, дамоў, сядзіб, палацаў). Не ўсе ахоўныя мерапрыемствы ўдалося рэалізаваць, некаторыя былі праведзены часткова ці недастаткова кваліфікавана, але ўсё-такі значную частку архітэктурных помнікаў тады змаглі захаваць. З-за недастатковага фінансавання з боку Польскай дзяржавы, нешматлікасці адпаведных спецыялістаў, фінансавай слабасці грамадскіх арганізацый многія каштоўныя архітэктурныя пабудовы абарончага тыпу так і не дачакаліся кансервацыі і рэстаўрацыі ці праекты былі выкананы няпоўнасцю [9, с. 15, 17].

Безумоўна, у прадстаўленым аглядзе выкладзены толькі асноўныя звесткі пра стан і развіццё архітэктуры Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Перспектыўнымі для далейшага вывучэння гэтай праблематыкі з'яўляюцца наступныя пытанні: народнае (традыцыйнае) сельскае дойлідства; культавае дойлідства пратэстанцкіх абшчын; іўдзейскае дойлідства; архітэктура шляхоў зносін і інш.

У цэлым архітэктура заходнебеларускіх зямель у складзе Польскай дзяржавы ў 1921–1939 гг. знаходзілася ў супярэчлівых абставінах. З аднаго боку, разбуральныя наступствы Першай сусветнай і савецка-польскай войнаў, аграрна-сыравінны характар эканомікі, палітыка паланізацыі негатыўна адбіліся на магчымасцях развіцця гарадоў і мястэчак, захаванасці культавых (пераважна праваслаўных) пабудоў. З другога боку, адбывалася аднаўленне гарадоў і мястэчак, актыўнае будаўніцтва каталіцкіх храмаў (хоць абмежавана ўзводзіліся ці рамантаваліся і праваслаўныя святыні), былі зроблены пэўныя захады ў справе захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Разам з традыцыяналісцкімі напрамкамі ў дойлідстве пашырыліся авангардныя, мадэрнісцкія кірункі. Ва ўмовах стылявой стракатасці

многія будынкі вызначаліся арыгінальнасцю, разнастайнасцю форм. У адрозненне ад архітэктуры БССР 1920–1930-х гг., архітэктура Заходняй Беларусі развівалася ў межах іншага сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага ладу ў Польшчы, аднак з'яўляецца неадрыўнай часткай агульнабеларускай спадчыны.

**Крыніцы і літаратура**


1. Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / рэд. А. А. Воінаў. – Мн. : БелЭн, 1993. – 620 с.
2. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Мн. : Экаперспектыва, 2000–2011. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч, Н. Васілеўская, І. Ігнаценка [і інш.] ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.), У. Навіцкі, Ю. Бохан [і інш.]. – 2006. – 613 с.
3. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2008. – 319 с.
4. Загідулін, А. М. Гарадская культура Заходняй Беларусі (1921–1939) у айчыннай гістарыяграфіі / А. М. Загідулін // Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі гарадоў і працэсаў урбанізацыі ў Беларусі : зб. навук. арт. / Гродзен. дзярж. ун-т імя Янкі Купалы. – Гродна, 2009. – С. 373–378.
5. Загідулін, А. М. Архітэктура Заходняй Беларусі (1918–1921 гг.): гістарыяграфія праблемы / А. М. Загідулін // Белорусская политология: многообразие в единстве. Политическое знание в современном социальном и образовательном пространстве : тез. докл. V Междунар. науч.-практ. конф., Гродно, 17–18 мая 2012 г. : в 2 ч. / Гродн. гос. ун-т им. Янки Купалы ; редкол.: В. Н. Ватыль [и др.]. – Гродно, 2012. – Ч. 1. – С. 185–188.
6. Загідулін, А. М. Асноўныя накірункі развіцця архітэктуры і будаўніцтва Заходняй Беларусі (1918–1939 гг.) / А. М. Загідулін // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1, Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. – 2014. – № 3. – С. 6–16.
7. Загідулін, А. М. Рэстаўрацыя і кансервацыя помнікаў архітэктуры ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Загідулін // Гістарычная ўрбаністыка: асновы метадалогіі і крыніцазнаўчая база : зб. навук. арт. / Гродз. дзярж. ун-т імя Янкі Купалы ; рэдкал.: І. В. Соркіна [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2011. – С. 357–361.
8. Несцярчук, Л. М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы / Л. М. Несцярчук. – Мн. : БелТА, 2003. – 283 с.
9. Морозов, Д. В. Охрана памятников архитектуры в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 24.00.03 / Морозов Дмитрий Викторович ; БГУ. – Мн., 2019. – 22 с.

10. Марозаў, Д. В. Дзейнасць кансерватара Ежы Рэмера па ахове помнікаў даўніны ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / Д. В. Марозаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2017. – № 9. – С. 23–35.

11. Марозаў, Д. В. Станіслаў Лоранц – руплівец даўніны ў Заходняй Беларусі / Д. В. Марозаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2018. – № 8. – С. 30–42.

12. Морозов, Е. В. Стили и направления в белорусской архитектуре 1920–1930-х годов : автореф. дис. … канд. искусствоведения : 17.00.04 / Морозов Евгений Валерьевич ; ГНУ «ИИЭФ НАНБ». – Мн., 2006. – 20 с.

13. Шамрук, А. С. Грамадзянская архітэктура / А. С. Шамрук // / Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. / навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мн. : Бел. навука, 2005–2009. – Т. 4, кн. 2 : Архітэктура XX – пачатку XXI ст. – 2009. – С. 367–715.

14. Кивачук, С. В. Историография исследований архитектуры и градостроительства Второй Польской республики (1921–1939 гг.) / С. В. Кивачук, Т. А. Панченко // Вестник Брестского государственного технического университета. – 2024. – № 2. – С. 3–5.

15. Харэўскі, С. Беларускі стыль у будаўніцтве 1921–1939 гг. (Лявон Вітан Дубейкаўскі) / С. Харэўскі // Białoruskie zeszyty historyczne. № 18. – Białystok : Białoruskie towarzystwo historyczne, 2002. – S. 206–213.

16. Харэўскі, С. В. Культавае дойлідства Заходняй Беларусі 1915–1940 гг. / С. В. Харэўскі. – Вільня, 2008. – 102 с.

17. Харэўскі, С. В. Культавая архітэктура Заходняй Беларусі / С. В. Харэўскі // Искусство и культура. – 2012. – № 3. – С. 17–24.

18. Кулагін, А. М. Каталіцкія храмы на Беларусі : энцыкл. давед. / А. М. Кулагін. – Мн. : БелЭн, 2000. – 216 с.

19. Кулагін, А. М. Праваслаўныя храмы на Беларусі : энцыкл. давед. / А. М. Кулагін. – Мн. : БелЭн, 2001. – 328 с.

20. Pszczółkowski, M. Architektura Brześcia nad Bugiem w latach II Rzeczypospolitej / M. Pszczółkowski // Świat Kresów Wschodnich II Rzeczypospolitej w literaturze i sztuce. – Zielona Góra, 2014. – S. 137–160.

21. Pszczółkowski, M. Kresy nowoczesne: Architektura na ziemiach wschodnich II Rzeczypospolitej 1921–1939 / M. Pszczółkowski. – Łódź : Księży Młyn Dom Wydawniczy Michał Koliński, 2016. – 260 s.

22. Omilanowska, M. Architekt Stefan Szyller: 1857–1933 / M. Omilanowska. – Warszawa : Instytut Sztuki Polskiej Akademii Nauk : Liber Pro Arte, 2008. – 587 s.

23. Tejszerska, A. Nasz rodzimy ziemiański dwór. „Styl dworkowy” dawniej i dziś / A. Tejszerska // Dwór. Ponowoczesne przygody idei i formy / red. nauk. P. Cichoń, S. Latocha. – Łódź : Instytut Etnologii i Antropologii Kulturowej, Uniwersytet Łódzki, 2016. – S. 33–51.

24. Budowa domów dla urzędników państwowych w województwach wschodnich. – Warszawa : Ministerstwo Robót Publicznych, 1925. – 64 s.

25. Брест в 1919–1939 гг.: документы и материалы. – Брест : Альтернатива, 2009. – 306 с.

26. Мадэрнізм у брэсцкай архітэктуры 1921–1939 гг. – Брэст : Паліграфіка, 2019. – 47 с.

27. Власюк, Н. Н. Город-сад. Стратегия и тактика пространственного развития города Бреста: концепция / Н. Н. Власюк. – Брест : БрГТУ, 2023. – 400 с.

28. Брест. Брэст. Brest. 1000 / сост. А. Н. Вабищевич. – Мн. : Бел. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2019. – 456 с.

29. Czajczyc, I. Architekt Julian Lisiecki / I. Czajczyc // Echa Polesia. – 2019. – № 2. – S. 35–38.

30. Tejszerska, A. Julian Lisiecki (1881–1945) – architect and restorer / A. Tejszerska // Architectus. – 2024. – № 2. – S. 3–12.

31. Гісторыя Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці : да 915-й гадавіны з першага летапіснага ўпамінання / А. М. Літвін [і інш.]. – Мн. : Выш. шк., 2012. – 711 с.

32. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня ; Wrocław, 2012. – 369 с.

33. Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі : (да 880-годдзя горада) : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Гродна, 10–11 красав. 2008 г. – Гродна : ГрДУ, 2008. – 526 с.

34. Мароз, В. В. Драўляныя сакральныя помнікі Берасцейшчыны: нарысы гісторыі, археалогіі і культуры / В. В. Мароз. – Мн. : Бел. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2018. – 512 с.

35. Ярашэвіч, А. А. Баранавіцкі Пакроўскі сабор / А. А. Ярашэвіч, І. Р. Томашава. – Мн. : Беларусь, 2008. – 76 с.

36. Горбунов, Андрей. История православных храмов г. Барановичи / протодиакон Андрей Горбунов. – Мн. : Красная звезда, 2017. – 188 с.

37. Браслав и его окрестности : путеводитель. – Мн. : Рифтур, 2002. – 71 с.

38. Шыдлоўскі, К. Дзейнасць архітэктара Юліуша Клоса на Браслаўшчыне / К. Шыдлоўскі // Przegląd Wschodni. – 2001. – T. VII, z. 4 (28). – S. 1409–1421.

39. Гліннік, В. Л. Вітан-Дубейкаўскі: старонкі біяграфіі / В. Л. Гліннік // Строительство и архитектура Белоруссии. – 1991. – № 5. – С. 40–44.

40. Tucholski, Z. Inżynier Henryk Genello (1872–1948), szkic do portretu zapomnianego architekta kolejowego / Z. Tucholski // Kwartalnik Historii Nauki i Techniki. – 2018. – T. 63, № 1. – S. 65–87.

**Да зместу**

УДК 902/904

**С. А. Донцова**
Минск, Институт истории НАН Беларуси

# ИСТОРИЯ АРХЕОЛОГИЧЕСКОГО ИЗУЧЕНИЯ Г. КАМЕНЦА (ПО АРХИВНЫМ МАТЕРИАЛАМ)

В статье выделены основные этапы изучения г. Каменца в Брестской области, рассмотрены архивные документы Центрального научного архива НАН Беларуси 1991–2004-х гг., отражающие вопросы археологического исследования города. Дается анализ проведенной работы, очерчен комплекс находок.
**Ключевые слова:** Каменец, археология, исследования, научный отчет, находки, топография.

This article highlights the main stages of the study of the town of Kamenets in the Brest region and examines archival documents from the Central Scientific Archives of the National Academy of Sciences of Belarus from 1991 to 2004, reflecting on the archaeological research of the town. An analysis of the work conducted is provided, and the finds are described.
**Keywords:** Kamenets, archeology, research, scientific report, finds, topography.

Впервые Каменец упоминается в 1276 г. в Ипатьевской летописи в связи с приказом галицко-волынского князя Владимира Васильковича построить город на р. Лесной, чтобы укрепить северные границы своего княжества. Приказ был отдан зодчему Алексе, который отметил каменистость выбранной под строительство территории. С этой местной особенностью связывают происхождение названия города – Каменец.

За время своего существования г. Каменец побывал в составе разных государственных образований. С 1366 г. Каменец находился в составе Великого княжества Литовского, являясь центром Земли Каменецкой. Своего расцвета город достиг в период с конца XIV в. до XVII в. С 1413 г. город являлся центром повета в Трокском воеводстве. В 1569 г. Каменец давал общегодовой доход от монополии на водку и мыт (пошлины) в королевскую казну 230 коп грошей, как и Гродно, что красноречиво свидетельствует о значимом экономическом положении города в этот период. Однако экономическое положение города пошатнули масштабные войны с Московским государством и Швецией. В результате войны середины XVII в. Каменцу был нанесен огромный ущерб. Город пытался вернуть прежнее социально-экономическое положение, но ситуацию усугубили эпидемии, голод и пожары. В 1795 г. в результате разделов Речи Посполитой г. Каменец и окольные земли перешли во владения Российской империи. До революции город входил в Брестский уезд Гродненской губернии.

В период 1795–1940 гг. город имел официальное название Каменец-Литовский для отличия от украинского Каменца-Подольского.

Неудивительно, что, имея давнюю и насыщенную историю, Каменец стал вызывать интерес у исследователей, причем не только у историков, краеведов, историков архитектуры, но и у археологов. Выделим следующие этапы краеведческого и археологического исследования г. Каменца.

1. Конец XIX в. – этнографо-краеведческое изучение г. Каменца. В этот период исследователи-краеведы собирали информацию, представленную в письменных источниках, с целью доказать значимость памятника монументальной архитектуры – Каменецкой башни – и привлечь внимание властей к его охране и реконструкции. Среди исследователей можно отдельно выделить Л. С. Паевского [1, с. 231–245] и В. Балабушевича [2, с. 216]. Благодаря их публикациям, в начале XX в. будут приняты меры по консервации и сохранению памятника культуры – Каменецкой башни.

2. Начало XX в. – проведение ограниченных исследований с целью консервации и реставрации Каменецкой башни. Среди исследователей особую роль занимает В. В. Суслов, возглавивший работы по изучению и сохранению этого уникального архитектурного сооружения.

3. 1961 гг. – проведение первых разведочных работ известным специалистом в архитектурно-археологических исследованиях П. А. Рапопортом, направленных на установление местонахождения городища древнего Каменца. Для этого этапа характерны весьма скромные результаты двух шурфов, которые установили лишь наличие переотложенных пластов с северо-западной и юго-западной сторон башни.

4. 1990-е – начало 2000-х гг. – исследования этого периода позволили определить более точную топографию древнего Каменца, изучить погребальный обряд первых обитателей замка. Начиная с 1997 г. изучение древнего города стало систематическим. Была сформирована Западно-Полесская археологическая группа в составе научного сотрудника Института истории НАН Беларуси О. В. Иова и аспиранта (на тот момент) А. А. Башкова.

В июне 1991 г. на территории исторической части города проводились раскопки под руководством Д. Ю. Марухиной [3, л. 3]. Целью раскопок являлось обнаружение культурного слоя, определение границ его залегания. Всего было заложено четыре шурфа. В трех из них археологи наткнулись на перекопы (шурфы 1–3). В шурфе 4 были обнаружены культурные пласты XVII–XVIII вв., собрано 247 фрагментов керамики, а также фрагментов кожаной обуви XVII в. Таким образом, археологам удалось установить зону нетронутого слоя XVII–XVIII вв., что было представлено в виде плана-схемы охранной зоны культурного слоя [3, л. 40].

В ноябре 1997 г. на территории двора ГУО «Средняя школа № 1 г. Каменца» под руководством О. В. Иова проводилась шурфовка, целью которой был поиск культурного слоя с юго-западной стороны от башни. Шурф попал на место старого рва, который был уничтожен во время реконструкции Каменецкой башни в 1903 г. К сожалению, дойти до материка не позволили погодные условия, и шурф был засыпан [4, л. 13]. Среди находок 1997 г. большинство были изделия из керамики (лепной и гончарной). Также были обнаружены железный гвоздь и монета Николая II. Коллекция индивидуальных и массовых находок была передана в фонды Брестского областного краеведческого музея и насчитывала 19 предметов [4, л. 18].

В период с 1997 г. по 2003 г. археологическое изучение города проводилось на регулярной основе.

В отчетах А. А. Башкова представлено археологическое исследование урочища Монастырь, продолжавшееся на протяжении 1998–2003 гг. Например, в 2001 г. было изучено 8 погребений. Из них, предположительно, 1 – мужское, 1 – женское, 2 – детских, 1 – девочки-подростка, принадлежность остальных трех невозможно было определить по останкам [5, л. 5–6]. Все захоронения были ориентированы на запад и сделаны по христианскому обряду. Датировать данные захоронения согласно индивидуальным находкам (фрагменты бронзового пояса, оселок, фрагмент ножа, пуговица, гвоздь, пряслице, горшок, втулка) можно XIV в. Однако в отчете отмечается, что могильник не единовременный и имел большую площадь.

В июле 2002 г. продолжались совместные раскопки под руководством О. В. Иова и А. А. Башкова. Было заложено два шурфа: шурф 15 и шурф 16 [6, л. 3]. Исследование проводилось по инициативе Брестского областного краеведческого музея с целью получения новых археологических материалов. В ходе исследования из шурфа 15 в коллекцию было отобрано 104 фрагмента керамики, 9 фрагментов изразцов и 16 костей животных. Из шурфа 16 в коллекцию отобрали 54 фрагмента керамики, 1 фрагмент изразца, 3 кости животных [6, л. 4–5].

А. Разлуцкой было проведено определение костей, в результате чего были выявлены остатки животных 7 видов (3 домашних, 4 диких, 1 птицы). Благодаря данному исследованию удалось установить, какие животные играли основную роль в рационе питания местного населения [6, л. 7].

Среди индивидуальных находок этого сезона следует отдельно отметить находку медного щиткового перстня с плоским ромбовидным щитком, который сохранился полностью. В отчете отмечается, что подобные перстни встречались в Новгороде и датировались серединой XIII в., но на территории Беларуси это единичная находка.

В своем отчете «Об археологических раскопках в г. Каменец и разведках в Березовском районе Брестской области в 2003 г.» О. В. Иов описывает находку оборонительного рва первоначального городища последней четверти XIII в. [7, л. 3]. В заложенном раскопе было выявлено 2249 фрагментов гончарной керамики, 238 фрагментов изразцов, 265 костей животных. Из них в коллекцию для Брестского областного краеведческого музея было отобрано 473 фрагмента керамики, 137 фрагментов изразцов, 189 костей животных, фаянс, 16 фрагментов стеклянных изделий, фарфор и половая плитка [7, л. 4].

О. В. Иов подробно описывает обнаруженный коробчатый терракотовый портретный изразец, который удалось реконструировать по найденным фрагментам. На данном изразце представлено барельефное поясное изображение юноши в богатой одежде «итальянского стиля». Подобные изразцы характерны для середины XVI в. Среди других обломков терракотовых изразцов автор отдельно выделяет экземпляры с геральдическим орнаментом в виде двуглавого орла под короной и изразец с геометрическим орнаментом в виде «перечеркнутых квадратов» [7, л. 6].

В заключение отметим следующее. Полевые отчеты являются уникальными источниками по истории археологического изучения летописного города Каменца. Они содержат необходимый набор фактов об этапах и методических особенностях проведения полевых работ. Кроме того, они дают точное представление о результативности проведенных исследований. Анализ представленной документации позволяет проследить закономерный рост качества технической подготовки полевой документации. Отмечается повышение качества выполнения рисунков и планов. Вследствие технической эволюции фотодела кардинально меняется качество фотофиксации материала и этапов самих раскопок. Все больше внимание уделяется статистическому анализу массового материала. Совершенствуется методика проведения раскопок, в том числе с использованием металлодетекторов.

В научных отчетах указываются перспективные места будущих исследований и высказываются замечания по актуальным вопросам интерпретации полученного материала. Таким образом, имея за плечами значительный задел археологического изучения, Каменец остается наиболее перспективным для дальнейшего изучения летописным городом Брестчины.

## Источники и литература

1. Виленский календарь на 1896 год : 13-й год изд. – Вильна : Тип. Св.-Дух. прав. братства, 1895. – 298 с.

2. Балабушевич, В. Каменецкий столб / В. Балабушевич // Литовские епархиальные ведомости. – 1881. – 21 июня. – С. 216.

3. Марухіна, Д. Ю. Справаздача пра археалагічныя раскопкі на тэрыторыі горада ў чэрвені 1991 г. / ЦНА НАН Беларусі. – ФАНД. Воп. 1. Арх. № 1364.

4. Іоў, А. В. Справаздача за 1997 г. аб археалагічных раскопках у Брэсцкай вобласці / ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 1666.

5. Башков, А. А. Отчет за 2001 год об археологических исследованиях в Каменецком районе Брестской области / ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 2034.

6. Иов, О. В. Отчет об археологических исследованиях в гг. Пинск, Каменец и Петриковском районе Беларуси в 2002 году / ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 2051.

7. Иов, О. В. Отчет об археологических раскопках в г. Каменец и разведках в Березовском районе Брестской области в 2003 году / ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 2115.

**Да зместу**

УДК 903.01(476.4)”13/17”

**Я. И. Павлова**
Могилев, Могилевский государственный университет
имени А. А. Кулешова

# КОСТЯНЫЕ ПРЕДМЕТЫ ИГР И ЗАБАВ XIV–XVIII ВВ. С ТЕРРИТОРИИ МОГИЛЕВСКОГО ПОДНЕПРОВЬЯ

Статья посвящена изучению археологических находок костяных предметов игр и забав с территории Могилевского Поднепровья. Кратко прослежена история возникновения игр, проанализированы артефакты (шашки, шахматы, «бабки»), являвшиеся важным элементом досуга населения в XIV–XVIII вв.

**Ключевые слова:** предметы игр и забав, шашки, шахматы, битки, археологические артефакты.

The article is devoted to the study of archaeological finds of bone objects of games and amusements from the territory of Mogilev Podneprovye. The history of the origin of games is briefly traced, artefacts (checkers, chess, ‘babki’), which were an important element of the population’s leisure time in the XIV–XVIII centuries, are analysed.

**Key words:** Items of games and amusements, draughts, chess, dice, archaeological artefacts.

Костяные изделия Могилевского Поднепровья слабо изучены исследователями. Существует множество интересных предметов игр и забав, отражающих уровень социально-экономической и духовной жизни общества в XIV–XVIII вв. и демонстрирующих развлечения, существовавшие во времена позднего Средневековья и раннего Нового времени.

Шахматы являются достаточно частой находкой археологов. Это интеллектуальные игры, которыми увлекались в основном только верхи общества. Основную категорию находок на территории Могилевского Поднепровья составляют каменные и деревянные экземпляры, однако костяные артефакты также есть в числе находок.

Считается, что шахматы появились в Северной Индии около II–IV вв. н. э. под названием «Чатуранга». Эта игра предназначалась для четырех человек и фактически означала четырехстороннее войско. Позже, в V–VI вв., игра начала распространяться в двух направлениях: на Запад в страны Среднего и Ближнего Востока (где получила название «Шатранг» и стала предназначаться для двух игроков) и на Восток в Китай, Японию и другие страны [1, с. 652; 2, с. 149; 3, с. 416–417].

В странах Ближнего Востока также появились новые фигуры – ферзь и ладья, а короля уже нельзя было «съесть». Изначально фигурки этих игр были реалистичны: фигура короля выглядела как богатый человек, слон выглядел как настоящий слон, однако с приходом арабов-завоевателей

в VII–VIII вв. вид одушевленных шахматных фигур был изменен из-за их религии и стал абстрактным [2, с. 149].

С арабского Востока шахматы начали распространяться на территорию Древней Руси и Западной Европы. Первые костяные шахматы на территории Древней Руси датируются XI в. и имеют как реалистичную, так и абстрактно новую арабскую форму. С шахматами были знакомы как богатые люди во главе с князем, так и простое население. На территории Беларуси всего было найдено более 52 шахматных фигур XIV–XVIII вв., три из которых – находки с Могилевского Поднепровья [2, с. 149–151].

Реалистичные шахматные фигуры были широко распространены в XI–XIII вв., в то время как абстрактный (символичный) вид шахмат – в более поздние времена. Известны два типа абстрактных шахмат: фигуры символичного арабского типа и фигуры новой абстракции [2, с. 149–159].

Две ладьи, найденные в Мстиславле и Могилеве, являются абстрактно новыми фигурами, возникшими в Древней Руси в конце XIII – начале XIV в. в связи с появлением токарного станка. Подставка фигурок стала устойчиво круглой, на нее размещался цилиндр с выступающей верхней частью. На самом же цилиндре размещалась плоская фигура, у которой были ярко выражены боковые выступы. Следует заметить, что определяются ладьи именно по их верхней части [2, с. 159].

В древние времена арабы называли ладью «рухом» – сказочной птичкой, которая изготавливалась с поднятыми крыльями, из-за чего ладья ранее выглядела как прямоугольник с прямоугольной основой и двумя выступами в верхней части. Иногда форма фигурки и ее характерных выступов менялась. Что касается верхней части ладьи XIV–XVII вв., то косторезы изготавливали нечто похожее как на выступы руха, так и на привычную нам ладью [2, с. 156, 159; 4, с. 93].

Мстиславская ладья была найдена в перепаханном огородном слое детинца. Она по внешнему виду подобна ладьям, найденным в Витебске (2 изделия), Новгороде (2 изделия), а также в Лиде. Все они датируются XIII–XIV вв. [2, с. 159; 4, с. 95–96, рисунок 5.18; 5, с. 42].

Мстиславская ладья достаточно хорошо сохранилась. Она может датироваться в этих же временных рамках (О. В. Медведева), а может принадлежать и к находкам XV в. (Л. В. Алексеев). Сама фигурка небольшая, практически прямоугольная, имеет высоту 2,4 см и диаметр основы 2,2 см. На круглую, тонкую подставку нанесен линейный орнамент [2, с. 159; 6, с. 101; 7, с. 399].

О. В. Медведева описывает ее как «почти прямоугольную фигуру с верхним вырезом в виде лодки, посередине которого находится стержень с круглым концом». Верхняя часть фигурки выглядит как трезубец [2, с. 159].

Могилевская ладья была найдена при археологических раскопках на Подниколье И. А. Марзалюком в 1997 г. Шахматная фигура украшена рифлением и глазковым орнаментом, датируется XVII в. и называется самим автором «турой». В отличие от мстиславской и многих других найденных ладей, тура из Могилева не очень хорошо сохранилась, так как верх фигурки отломан, через саму же фигуру проходит трещина. Она имеет круглую основу, постепенно переходящую в бочковидное туловище с плоской головкой [2, с. 159–160; 8, с. 49, 235].

О. В. Медведева описывает ее как фигуру, которая украшена кружково-линейным орнаментом. Ладья имеет высоту примерно в 5 см и диаметр основы около 3,8 см [2, с. 159–160].

Пешка – самая простая (даже в изготовлении) шахматная фигура. Она выглядит как усеченный конус или цилиндр со срезанным (закругленным) верхом. Размеры пешек бывают разными, но не выходят за пределы 2,5–3 см. Пешки также, как и ладьи, разделяются на два типа: арабский и абстрактно новый [2, с. 163].

Л. В. Алексеев, проводя раскопки в г. Мстиславле, нашел в подогородном слое пешку, которая датируется XV в. Сам автор сомневается, что это изделие именно пешка. Однако с учетом того, что фигурка малого размера, круглая в сечении и гладко срезанная кверху, можно утверждать, что археолог прав. Из-за отсутствия хотя бы частичного описания и только одного рисунка этой шахматной фигуры, достаточно сложно судить о том, сделана она от руки или же на токарном станке. Скорее всего, она была сделана на токарном станке согласно ровной поверхности фигурки, ее гладкости, а также датировке (XV в.), но по типологии она будет склоняться к арабскому типу, изготавливавшемуся вручную, из-за внешнего вида [2, с. 163–165; 9, с. 68].

Шашки наравне с шахматами считаются интеллектуальными играми. Эта игра появилась в Египте в III–II тыс. до н. э. и была одной из любимых игр египтян (в том числе и фараонов), затем распространилась в Грецию и Рим, а из этих стран уже в страны Азии, Европы и Африки [10, с. 403–405; 11, с. 187].

В 1950-х гг. при раскопках богатого поселения около Переяславля-Хмельницкого Киевской области был обнаружен наиболее древний комплект стеклянных шашек, датирующийся примерно III–IV вв. [12, с. 4].

Наибольшее распространение на территории Древней Руси (в том числе и на территории Беларуси) игра в шашки получила в X в., когда массово начала распространяться по водному пути «из варяг в греки» [11, с. 187; 13, с. 653; 14, с. 417–418].

Впервые в письменных источниках эта игра упоминается в 1282 г. в «Списке законьном». С XIII в. и вплоть до XVII в. известные нам шашки

упоминаются под разными названиями – «леки», «дамки» и нек. др., однако письменные источники не содержат информации о правилах игры [12, с. 4].

На территории Беларуси шашки в большинстве своем изготавливались из рога лося или оленя, но также встречаются и шашки из глины, камня, стекла. Диаметр их обычно не превосходит 3 см, высота 0,5 см [11, с. 187].

Согласно классификации О. В. Медведевой, шашки распределяются на два типа:

1) полусферические (наиболее распространены в X–XIII вв.);

2) круглые плоские (использовались в X–XVIII вв.) [11, с. 187–196].

Круглые плоские шашки разделяются:

– на шашки с циркульным орнаментом;

– шашки с концентричными (имеющими общий центр) кругами;

– комбинированные шашки (и с циркульным орнаментом, и с концентричными кругами);

– гладкие шашки;

– шашки с изображением.

Некоторые подтипы также имеют разновидности, например шашки с отверстием посередине и шашки без отверстия. Как и среди многих других изделий, существуют заготовки шашек и бракованные изделия, но на территории Могилевского Поднепровья они не были найдены [11, с. 187–197].

На территории ***Тульской губернии*** отмечается кирпичный завод в г. Туле на берегу р. Воронки (близ Курского вокзала), которым владел И. М. Никитин. Изготавливались кирпич и изразцы на сумму 3200 рублей в год. Количество рабочих – 8 [1, с. 308].

В ***Харьковской губернии*** в г. Харькове на улице Москалевской, 91 работал кафельный завод, принадлежавший купцу В. В. Петрову. Изготавливались кирпич огнеупорный и простой и прочие виды продукции на сумму 15 500 рублей в год. Использовался конный двигатель. Количество рабочих – 35 [1, с. 309].

В ***Ярославской губернии*** отмечается наличие трех предприятий. Купец второй гильдии В. А. Аксенов владел гончарно-изразцовым заводом в Панфиловской волости. Изготавливались изразцы на сумму 58 504 рублей в год. Использовался паровой двигатель с числом сил 12. Количество рабочих – 95 [1, с. 312].

Гончарно-изразцовый завод в г. Рыбинске на Черемушной набережной, 8 (за р. Черемухой) принадлежал купцу второй гильдии К. П. Волкову.

Изготавливались изразцы и кирпич на сумму 18 857 рублей в год. Использовался конный двигатель. Количество рабочих – 28 [1, с. 312].

Рыбинскому лесопромышленному обществу принадлежал гончарный изразцовый завод в Рыбинском уезде – в д. Б.-Тоговщина Ивановской волости. Изготавливались изразцы и кирпич на сумму 19 583 рубля в год. Количество рабочих – 35 [1, с. 312].

Таким образом, «Список фабрик и заводов Российской Империи» 1912 г. позволил установить, что на территории Российской империи действовало 87 производств, занимавшихся изготовлением изразцовой продукции. Изготовление изразцов в большинстве случаев сочеталось с производством другой керамической продукции (кирпич, трубы, гончарные изделия и др.).

Предприятия располагались неравномерно по губерниям и областям. Так, в 21 административной единице действовало по одному предприятию, в пяти – по два предприятия, в пяти – по три предприятия, в двух – по четыре предприятия, в одной – пять предприятий, в двух – по шесть предприятий, в одной – 16 предприятий (Могилевская губерния). Изразцовое производство на территории белорусских земель по количеству предприятий (Витебская, Гродненская, Минская и Могилевская губернии) составляло 31,03 % от предприятий всей Российской империи. Отдельно следует отметить Могилевскую губернию, на территории которой располагалось 16 предприятий (18,39 %). Предприятия, производившие изразцы, составляли 5,69 % от предприятий отрасли по обработке минеральных веществ.

В сравнении с источником «Фабрично-заводская промышленность России. Перечень фабрик и заводов» (1897) «Списокъ фабрикъ и заводовъ Россiйской Имперiи» (1912) содержит в разы меньше критериев для описания действующих производств, информация подана в очень сокращенном виде [3, с. 73–77].

Владельцами производств были: мещане (28 предприятий); купцы (22 предприятия); крестьяне (8 предприятий), дворяне (5 предприятий); почетные граждане (4 предприятия), иностранные подданые (3 предприятия), торговый дом (2 предприятия), акционерное общество (2 предприятия). Небольшую категорию представляют предприятия, социальный статус владельцев которых не указан в источнике или принадлежит отдельным лицам (например, художник) или обществу (например, лесопромышленное общество).

Большинство предприятий отрасли использовали двигатели разных категорий: конный (35,6 %), паровой (11,5 %), локомобильный (9,2 %), керосиново-бензиновый (3,4 %), электрический (2,3 %), нефтяной (2,3 %), газовый (1,2 %). Для 34,5 % предприятий нет указания на использование двигателя.

Количество рабочих, занятых в производстве изразцов, может быть подсчитано достаточно условно, поскольку большинство предприятий специализировалось не только на производстве изразцов, но и на выпуске другой продукции. Всего на предприятиях, согласно источнику, было занято 3360 рабочих.

**Источники и литература**

1. Список фабрик и заводов Российской империи : сост. по офиц. сведениям Отд. пром-сти М-ва торговли и пром-сти под ред. В. Е. Варзара. – СПб. : Тип. В. Ф. Киршбаума, 1912. – 720 с.

2. Шуткова, Н. П. Изразцовые печные наборы Могилевского Поднепровья (XVI–XVIII вв.) : монография / Н. П. Шуткова. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2023. – 168 с.

3. Шуткова, Н. П. «Фабрично-заводская промышленность России. Перечень фабрик и заводов» 1897 г. как источник по изучению изразцового производства белорусских земель / Н. П. Шуткова // Коммуникации. Общество. Духовность – 2024: к Году семьи : XXIV Междунар. науч.-практ. конф., Ухта, 23–24 мая 2024 г. : материалы конф. – Ухта : УГТУ. – С. 73–77.

**Да зместу**

# ЭТНАЛОГІЯ, КУЛЬТУРНАЯ АНТРАПАЛОГІЯ

УДК 93/94:391

**А. М. Варабей**
Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
культуры і мастацтва

## РЭКАНСТРУКЦЫЯ І ПРЭЗЕНТАЦЫЯ ШЛЯХЕЦКАГА СТРОЮ XVI–XVII СТАГОДДЗЯЎ

У артыкуле разглядаюцца разнастайныя падыходы да рэканструкцыі і музейнай рэпрэзентацыі шляхецкага строю Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) XVI–XVII стст. Прыводзіцца класіфікацыя і кароткая характарыстыка крыніц для вывучэння шляхецкага строю ВКЛ, удакладняецца паняційна-тэрміналагічны апарат, які тычыцца рэканструкцыі элементаў касцюма. Прыводзяцца асноўныя прыёмы музеефікацыі і рэпрэзентацыі ў сучасных умовах.

**Ключавыя словы:** шляхецкі строй, сарматызм, экспанаванне, рэканструкцыя, аўтэнтык, копія, рэпліка, фурнітура, музеефікацыя, экспазіцыя.

The article examines various methods of reconstruction and museum representation of the nobility costume of the Grand Duchy of Lithuania in 16th – 17th centuries. It provides a classification and a brief description of sources for studying the nobility clothing of the Grand Duchy of Lithuania, and clarifies the conceptual and terminological apparatus related to the reconstruction of costume elements. The article presents the main techniques of museumization and representation in modern conditions.

**Keywords:** noble system, Sarmatism, exhibition, reconstruction, authentic, copy, replica, fittings, museumification, exposition.

Методыка рэканструкцыі гістарычнага касцюма ўключае як агульнанавуковыя, так і спецыяльныя метады. Сістэмны і параўнальны метады даюць інструменты для апрацоўкі крыніцавай базы па вывучэнні шляхецкага строю ВКЛ XVI–XVII стст., якая досыць шырокая. Можна вылучыць наступныя падгрупы.

1. Іканаграфічныя крыніцы – партрэты шляхты і магнатэрыі, касцюмныя кнігі XVI–XVIII стст., гравюры і замалёўкі бытавых, батальных сцэн, роспісы храмаў, у тым ліку барэльефы. Асобна трэба вылучыць кравецкія кнігі, якія даюць звесткі аб тэхналогіях пабудовы лекал і пашыву рэчаў.

2. Архіўныя крыніцы. Да гэтай групы можна аднесці судовыя і іншыя акты (тэстаменты, судовыя крымінальныя справы, прэтэнзіі), літаратурныя творы, мемуары эпохі, гісторыка-геаграфічныя даведнікі. Пошук, расчытка, пераклад і інтэрпрэтацыя архіўных спраў – нялёгкая справа, якая патрабуе адмысловых ведаў і часу. Найбольш даступныя для даследавання касцюма

апублікаваныя крыніцы з архіваў. У XIX ст. створаныя ў Расійскай імперыі Археаграфічныя камісіі займаліся апрацоўкай і публікацыяй архіўных крыніц. Пэўная колькасць дакументаў, у якіх узгадваюцца прадметы адзення, тканіны, сустракаецца ў справаводстве розных судовых установ з тэрыторыі ВКЛ, апублікаваным у розных тамах Актаў Віленскай Археаграфічнай камісіі (АВАК), а таксама ў іншых зборах (АСД, АЗР, АЮЗР і г. д.). Пэўныя звесткі агульнага характару можна атрымаць з мемуараў Гіёма Левасёра дэ Баплана, Зыгмунта Герберштэйна, прац Шымона Старавольскага і іншых геаграфічных даведнікаў таго часу.

3. Навуковыя працы. Трэба канстатаваць факт, што ў айчыннай навуковай літаратуры дадзенай тэме нададзена недастаткова ўвагі. Гісторыя шляхецкага (і не толькі) касцюма на тэрыторыі Беларусі разгледжана ў грунтоўных працах М. В. Бялявінай [1; 2]. Сярод замежных даследчыкаў можам вызначыць працы К. Блюсевіча, С. Шаменкова і І. Пагарэльскай [3–6]. Гэтыя аўтары не толькі займаюцца тэарэтычным даследаваннямі, але і практычна апрабоўваюць вынікі даследаванняў у фармаце “жывой гісторыі”. Улічваючы ўсходні генезіс традыцыйнага “сармацкага” строю ВКЛ, цікавыя артыкулы В. Пракапенка, якія разглядаюць гісторыю развіцця арыентальнага касцюма і элементаў узбраення [7].

4. Захаваныя арыгінальныя прадметы – элементы строю. Да гэтай падгрупы трэба аднесці археалагічныя прадметы, у першую чаргу металічныя вырабы: гузікі, спражкі, зашпількі, дэталі паясоў і інш. [8]. Калі казаць аб дакладнай прывязцы да шляхецкай культуры, то трэба адзначыць грунтоўную працу А. А. Башкова па даследаванні шляхецкіх рэзідэнцый Берасцейшчыны [9]. Вынікі даследавання месца Берасцецкай бітвы І. Свешнікавым дагэтуль з’яўляюцца ўзорнымі ў дачыненні рэканструкцыі строю і рыштунку былой Рэчы Паспалітай сярэдзіны XVII ст. [10]. Развіццё абутку ў перыяд ранняга Новага часу разгледжана ў артыкулах А. Аўласовіча [11].

Важным крокам з’яўляецца выбар і абгрунтаванне ступені дакладнасці і аўтэнтычнасці выканання мадэлі. У практыцы айчыннай і замежнай гістарычнай рэканструкцыі існуе ўмоўная градацыя ў залежнасці ад ступені прапрацоўкі, адпаведнасці аўтэнтычнаму матэрыялу, тэхналогіі, пабудове лекал і г. д. Часам узнікаюць дыскусіі наконт дакладнасці тэрміналогіі [12; 13].

Копія лічыцца найдакладнейшым паўторам арыгінальнай рэчы. У адносінах да музейных прадметаў копіяй лічыцца рэч, якая адпавядае арыгіналу не толькі па габарытных дадзеных (памерах, прапорцыях), тэхналогіі вытворчасці, колеры, матэрыялах. Ідэальная копія – гэта цэласная пабудова ўсяго ланцуга вытворчасці прадмета, пачынаючы, напрыклад, ад пасадкі лёну, капання балотнай руды, ссякання дрэва і г. д. Пры гэтым увесь працэс і яго асобныя кампаненты павінны адпавядаць гістарычным

аналагам. Па вялікім рахунку, гэта і ёсць “крышталізаваная” навуковая рэканструкцыя ўзроўню “эксперыментальнай археалогіі”.

Падобным прыкладам працэсу гістарычнай рэканструкцыі строю можа служыць працэс вытворчасці знакамітай тунікі з Бокстэну, пададзены ў блогу HIBERNAATIOPESÄKE (малюнак 1). Вытворчасць тунікі пачынаецца з вырабу нітак, вырабніцтва, акрасу тканіны натуральнымі фарбавальнікамі. Сам раскрой і пашыццё – зразумела, уручную – ёсць фінал працэсу [14].



Малюнак 1 – Выраб дакладнай рэплікі бокстэнскай тунікі

Аднак у дадзеным выпадку мы сутыкаемся з шэрагам пытанняў. Кожная рэч выраблялася пад пэўную асобу з пэўнымі прапорцыямі. Прапорцыі чалавечага цела змяняліся на працягу стагоддзяў, не кажучы аб тым, што яны заўсёды індывідуальныя. Дакладная копія гістарычнай рэчы можа пасаваць толькі для выставы ў музейнай вітрыне. Наступнае пытанне – працяглы і досыць дарагі па кошце працэс вытворчасці, які мае выключную каштоўнасць у якасці навуковага эксперымента, але не заўсёды мэтазгодны, калі гаворка ідзе пра напаўненне экспазіцыі ці вырабу рэквізіту для масавых музейных мерапрыемстваў. У гэтым выпадку мы можам казаць пра рэпліку ці версію строю.

Рэпліка – паўтор арыгінала з невялікімі адрозненнямі. Рэпліка вырабляецца з арыгінальнага ўзора, па арыгінальнай тэхналогіі з захаваннем

аўтэнтычнага крою, швоў, апрацоўкі, але з сучасных матэрыялаў, якія адпаведны гістарычным (матэрыялы тыя ж, але фабрычна вырабленыя, з дадаткам сучасных ніцей і г. д.). Ёсць меркаванне, што дапушчальна ўжываць сучасную фурнітуру, ленты, галуны і г. д, але ўсё ж лічыцца, што гэта “касплэй”.

Версія – сучасны выраб у поўнай адпаведнасці з крыніцамі, тэхналогіямі вытворчасці, які не мае адпаведнага захаванага арыгінальнага прататыпа.

Калі мы не маем захаванага арыгінала элемента строю, але ёсць выявы, вопісы, успаміны – ужываецца тэрмін “рэканструкцыя”. Важным момантам, што звязвае паняцці “рэпліка” і “рэканструкцыя”, з’яўляецца адсутнасць уласных домыслаў і фантазій аўтара. Не толькі знешняе падабенства, але і тэхнікі і тэхналогіі вытворчасці мусяць адпавядаць арыгіналу.

Калі гаворка ідзе аб масавых імпрэзах, сцэнках, квэстах, дапускаецца ўжываць т. зв. касплэй, ці строй-вобраз, стылізацыю. У гэтым выпадку строй вонкава адпавядае гістарычнаму пры максімальным выкарыстоўванні сучасных тэхналогій і матэрыялаў.

У падыходах да прэзентацыі строю ў сучаснай музейнай прасторы можна вылучыць некалькі варыянтаў у залежнасці ад мэт, задач, узроўню фінансавання, аўдыторыі.

Класічны калекцыйны, ці сістэматычны, метад прымяняецца ў выпадку, калі трэба прадэманстраваць наведвальніку калекцыю, заснаваную на базе профільнай навуковай дысцыпліны. Гэты метад, нягледзячы на сучасныя інавацыйныя падыходы, працягвае лічыцца асноўным у музейным праектаванні.

У мемарыяльных (гісторыка-мемарыяльных) музеях, створаных на базе аўтэнтычнай архітэктурнай прасторы і адпаведных бытавых рэчаў, прымяняецца ансамблевы метад, калі на аснове музейнай калекцыі трэба аднавіць пэўнае асяроддзе, звязанае з гісторыка-культурным працэсам, падзеяй ці з’явай.

Акрамя мемарыяльных, гэты метад запатрабаваны ў гісторыка-бытавых і этнаграфічных музеях (малюнак 2). У экспазіцыях, якія будуюцца на аснове ансамблевага метаду, паспяхова ўжываюцца сучасныя інтэрактыўныя тэхналогіі – гульнявыя і тэатральныя. Актыўна прымяняецца ў дадзеным выпадку метад рэканструкцыі – ствараецца “жывы музей”. “Жывы музей” прадугледжвае асаблівыя экспазіцыйна-тэматычныя зоны зносін, дзе наведвальніку дазваляецца ў нейкім сэнсе парушаць традыцыйныя правілы наведвання музеяў, напрыклад класічнае “экспанаты рукамі не чапаць” [15, с. 25–29].



Малюнак 2 – Экспазіцыя гісторыка-мемарыяльнага музея “Сядзіба Нямцэвічаў”

Да навукова-папулярных метадаў музеефікацыі касцюма і яго элементаў можна аднесці ілюстратыўна-тэматычны метад (тэматычны, ці комплексна-тэматычны). Асноўнай структурнай адзінкай у дадзеным выпадку з’яўляецца тэматыка-экспазіцыйны комплекс, які ўключае невялікую колькасць разнародных экспанатаў, што ілюструюць нейкую навукова-экспазіцыйную думку, адлюстраваную ў тэксце-каментарыі. З падобных комплексаў складваецца экспазіцыйная тэма, з тэмы – раздзел экспазіцыі і г. д. Узнікшая экспазіцыя нагадвае ілюстраваную навукова-папулярную манаграфію. Прынцыповае адрозненне ў тым, што ў якасці ілюстрацый прапанавана выкарыстоўваць сапраўдныя матэрыяльныя сведчанні тых падзей, аб якіх расказваецца ў экспазіцыі [15, с. 31–29].

У выпадку недахопу музейнай прасторы ці музейных прадметаў ужываецца музейна-вобразны метад з ліку мастацкіх метадаў. У музеі ствараецца экспазіцыйна-мастацкі вобраз, які не ілюструе навуковую ідэю, а з’яўляецца самастойным мастацкім творам з музейнай спецыфікай. У гістарычных, гісторыка-краязнаўчых музеях на аснове музейна-вобразнага метада ствараюцца дыярамы ці панарамы. У выпадку стварэння

міні-дыярам іх стваральнікі працуюць на навуку, адлюстроўваючы ў ілюстрацыйна-вобразнай форме канкрэтную навуковую ці навукова-папулярную тэзу.

Аднак вялікія мастацкія дыярамы ці панарамы на гістарычную тэматыку могуць займаць усю экспазіцыйную прастору, выцясняючы навукова-папулярныя і тэматыка-экспазіцыйныя комплексы. У мастацка-гістарычныя дыярамы павінны арганічна ўключацца арыгінальныя музейныя рэчы [15, с. 34–37].

Найфектыўнейшым сродкам музейнай рэпрэзентацыі строяў і наогул матэрыяльнай культуры пэўнага перыяду з’яўляецца правядзенне інтэр-актыўных мерапрыемстваў – ад невялікіх імпрэз да буйных міжнародных фестываляў (малюнак 3). Гэта той выпадак, калі навуковы падыход удзельнікаў пры адраджэнні матэрыяльнай культуры папулярызуе гістарычную спадчыну ў масавай свядомасці. Важна не проста дэманстраваць наведвальнікам нешта, а старацца ўцягваць іх, асабліва дзяцей, у пэўную дзейнасць – ад “жывой археалогіі” да гістарычных танцаў (малюнкі 4, 5).




Малюнак 3 – Фестываль ля сцен Мірскага замка



Малюнак 4 – Імпрэза каля археалагічнага музея “Бярэсце”



Малюнак 5 – Інтэрактыў для дзяцей. Музей “Бярэсце”, 2019 г.

**Крыніцы і літаратура**

1. Бялявіна, В. М. Беларускі касцюм / В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава. – Мн. : Беларусь, 2017. – 461 с.

2. Бялявіна, В. М. Мужчынскі касцюм на Беларусі / В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава. – Мн. : Беларусь, 2007. – 303 с.

3. Blusiewicz, K. Obuwie warszawskie z XIV–XVIII wieku: ze zbiorów archeologicznych Muzeum Historycznego m. st. Warszawy / K. Blusiewicz // Archeologia dawnej Warszawy. T. 1. – Warszawa, 2009. – 224 s.

4. Шаменков, С. Одяг, військове спорядження та зовнішній вигляд козацької старшини середини – другої половини XVII ст. / С. Шаменков. – URL: https://www.academia.edu/44491251/Сергій_Шаменков_Одяг_військове_спорядження_та_зовнішній_вигляд_козацької_старшини_середини_другої_половини_XVIIст_Serhii_Shamenkov_Clothing_Military_Equipment_and_Appearance_of_Cossack_Officers_in_the_Middle_Second_Half_of_the_17th_Century (дата обращения : 07.05.2022).

5. Шаменков, С. Поясний одяг в гардеробі населення українських земель та в костюмі козацтва кінця XVI першої половини XVII ст. / С. Шаменков // Археологія & Фортифікація України : зб. матеріалів VI Міжнар. наук.-практ. конф. – Кам’янець-Подільський, 2016. – С. 198–201.

6. Irena Pogorzelska. – URL: https://independent.academia.edu/Irena Pogorzelska (date of access: 20.05.2022).

7. Прокопенко, В. Сабельный портупейный подвес с крючком-застежкой. Восточная Европа, Османская Империя – XVI – начало XVIII в. / В. Прокопенко // Історія давньої зброї. Дослідження 2014. – Київ, 2014. – С. 180–191.

8. Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст. / В. М. Ляўко [і інш.]. – Мн. : Бел. навука, 2001. – 597 с.

9. Башков, А. А. Шляхетские резиденции Брестчины в свете археологических исследований: Ружаны, Скоки, Коссово, Закозель : монография / А. А. Башков ; М-во образования Респ. Беларусь, Брест. го.с ун-т им. А. С. Пушкина. – Брест : БрГУ, 2017. – 287 с.

10. Свешніков, І. К. Битва під Берестечком / І. К. Свешніков. – Львів : Слово, 1992. – 304 с.

11. Авласович, А. Кожаная обувь XVI–XVII вв. северо-восточных городов Беларуси / А. Авласович // Середньовічні старожитності Центрально-Східної Європи : матеріали IX Міжнар. студент. наук. археол. конф., Чернігів, 16–18 квітня 2010 р. / Ін-т археології НАН України ; Чернігів. нац. пед. ун-т Т. Г. Шевченка ; Ін-т археології та стародавньої історії Північ. Лівобережжя. – Чернігів : ЧНПУ ім. Т. Г. Шевченка, 2010. – С. 13–14.

12. Калашникова, Н. М. К вопросу о дефенициях: реконструкция – копия – реплика костюма / Н. М. Калашникова. – URL: https://cyberleninka.ru/article/n/k-voprosu-o-definitsiyah-rekonstruktsiya-kopiya-replika-kostyuma (дата обращения: 25.03.2025).

13. Копия? Реплика? Реконструкция? // Творческая мастерская «Дерево». – URL: https://vk.com/@tmdrevo-kopiya-replika-rekonstrukciya (дата обращения: 25.03.2025).

14. Bockstenin miehen innoittamana // HIBERNAATIOPESÄKE. – URL: https://hibernaatio.blogspot.com/2016/06/bockstenin-miehen-innoittamana-inspired.html?fbclid=IwY2xjawJ--mlleHRuA2FlbQIxMABicmlkETFnWkx6MndmMTRyOThrOUNjAR7OdrEY-PlR9JpEvj2xE7ROsYKLal1Ms4K2nbUkelzMwDSuCOZQbpTOo4rBJ5g_aem_pCOpU1gu_A9sdUFgIwNeHg (data of access: 25.04.2025).

15. Поляков, Т. П. Музейная экспозиция: методы и технологии актуализации культурного наследия / Т. П. Поляков. – М. : Ин-т наследия, 2018. – 588 с.

**Да зместу**

УДК 728.1:745(476.6)

**Д. А. Коўшар**
Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

# ВЕТКАЎСКІЯ ЛІШТВЫ ЯК ЧАСТКА КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ СТАРААБРАДЦАЎ

Артыкул прысвечаны вывучэнню асаблівасцей ліштваў як неад'емнай часткі культурнай спадчыны Веткаўскага краю. Грунтуючыся на аналізе гістарычных звестак, даследчых прац і матэрыялаў палявых даследаванняў, у артыкуле разглядаюцца гісторыя развіцця разьбянога мастацтва ў рэгіёне, тыпалогія і стылістыка ліштваў. Асаблівая ўвага надаецца сімвалічнаму значэнню разьбяных элементаў, іх сувязі з народнымі вераваннямі і традыцыямі, а таксама ўплыву гістарычных і культурных падзей на фарміраванне ўнікальнага аблічча веткаўскіх ліштваў.

**Ключавыя словы:** Ветка; стараабрадцы; разьба па дрэве; ліштвы; падаконнік; надаконнік; аканіцы; матывы ў разьбе; абярэг; традыцыйнае мастацтва.

This article is devoted to the study of the features of window frames as an integral part of the cultural heritage of the Vetkovsky region. Based on the analysis of historical information, research papers and field research materials, the article examines the history of the development of woodcarving art in the region, the typology and stylistics of window frames. Special attention is paid to the symbolic meaning of the carved elements, their connection with folk beliefs and traditions, as well as the influence of historical events and cultural influences on the formation of the unique appearance of the Vetkov window frames.

**Keywords:** Vetka; Old Believers; wood carving; window frames; upper part of the window; window sill; shutters; motifs in carving; amulet; traditional art.

Ветка – невялікі горад на Гомельшчыне, які, дзякуючы багатай гісторыі і ўнікальнаму культурнаму ландшафту, з даўніх часоў прыцягвае да сябе ўвагу даследчыкаў і аматараў традыцыйнага мастацтва. Яго асаблівы каларыт вызначаецца не толькі школай іканапісу і кніжнай культурай, але і майстэрствам разьбы па дрэве, найбольш яркім выражэннем якога з'яўляюцца не менш знакамітыя веткаўскія ліштвы.

Гісторыя Веткі непарыўна звязана з царкоўным расколам XVII ст. Рэформа, ініцыяваная патрыярхам Ніканам, выклікала хвалю пратэстаў сярод вернікаў, якія не прынялі новыя абрады і захавалі вернасць старадбрадніцкай традыцыі. Стараабрадцы, якія падвяргаліся жорсткім праследам у Маскве, вымушаныя былі шукаць прытулку на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. У 1680-х гг. на берагах р. Сож і з'явілася Ветка – горад, заснаваны тымі, хто імкнуўся захаваць сваю веру і традыцыі. Палітычнае становішча Рэчы Паспалітай і аддаленасць ад цэнтральнай Расіі спрыялі захаванню і развіццю ўнікальных культурных традыцый [1, с. 71]. У Ветцы склалася ўнікальная школа іканапісу, дзе візантыйскія каноны гарманічна

спалучаліся з мясцовымі мастацкімі традыцыямі. Кніжная справа таксама дасягнула значных вышынь, ствараючы непаўторныя рукапісныя і старадрукаваныя кнігі. Геаграфічнае размяшчэнне Веткі ў зоне ўмеранага клімату з перавагай лясных масіваў аказала значны ўплыў на развіццё традыцыйных рамёстваў, у тым ліку і разьбы па дрэве, дзе беларускія традыцыі гарманічна спалучаюцца з барочнай веліччу і стараабрадніцкім духам. Менавіта гэта надае Ветцы яе непаўторную адметнасць.

Здаўна жыхары беларускіх зямель шанавалі дрэва, выкарыстоўваючы яго для пабудовы жылля і гападарчых памяшканняў, майстравалі мэблю і транспартныя сродкі, выраблялі прылады працы, посуд [2, с. 2]. Аднак менавіта архітэктурную разьбу на беларускіх землях сталі выкарыстоўваць, верагодна, толькі пасля рэформы 1861 г. У гэты ж час назіраецца пераход ад курных хат да “чыстых” хат з комінамі [3, с. 17]. Гэта, у сваю чаргу, дазволіла павялічыць памеры вокнаў і выкарыстоўваць рамы са шклом. Вокны сталі складанай канструкцыяй: рама збіралася асобна і ўстаўлялася ў зруб. Шчыліны паміж рамай і зрубам старанна затыкалі мохам, каб забяспечыць цеплаізаляцыю, а зверху закрывалі дошкамі шалёўкі, якія з часам замяніліся аканіцамі. Каб абараніць асадачны паз ад дажджу і снегу, да верхняга бруса рамы прымацоўвалі шырокую дошку. Гэта плоскасць неўзабаве прыцягнула ўвагу разьбяроў, якія пачалі ўпрыгожваць яе рознымі спосабамі. Спачатку яны выпілоўвалі край дошкі хвалістым контурам, свідравалі адтуліны, аздаблялі накладнымі рэечкамі, ромбікамі ці кружочкамі. Паступова дэкор станавіўся ўсё больш складаным і вытанчаным, з’яўляліся выявы галінак, птушак і жывёл. Уся гэтая разнастайнасць элементаў, аб’яднаная ў адзіную кампазіцыю, утварала ліштвы [4, с. 10–11]. Такім чынам, ліштва складаецца з некалькіх элементаў: надаконнік (надваконнік); рама; падаконнік (падваконнік); аканіцы.

Існуюць розныя класіфікацыі ліштваў, у асноўным паводле формы, памеру і аздаблення надаконніка. У ніжнепасожскай традыцыі разьбянога архітэктурнага дэкору, куды, паводле класіфікацыі Я. Г. Малікава, ўваходзіць Веткаўскі раён, пераважаюць такія тыпы ліштваў, як франтонныя прапільныя і карункавыя [5, с. 92]. У аснове гэтага франтоннага тыпу ліштваў (фота 1) ляжаць надаконнікі з ламанай, пад трохвугольны або закруглены франтон, лініяй карніза, з якога звісаюць шырокія прапільныя карункі над плоскасцю лабавой дошкі, у некаторых выпадках карункі могуць і адсутнічаць. Такога тыпу ліштвы нярэдка ілюструюць сабой уплыў барока, а потым і класіцызму [4, с. 18]. Карункавыя ліштвы (фота 2) вызначаюцца надаконнікам з выразным карнізам, над якім размешчана тонкая вертыкальная дошка-карона, апрацаваная контурнай ці скразяной разьбой, пад ім – шырокая лабавая дошка з накладнымі ці прапільнымі выявамі [6, с. 84].



а)



б)



в)



г)

Фота 1 – Прыклады ліштваў франтоннага тыпу:
*а) г. Ветка, вул Грамыка, 95; б) г. Ветка, вул Грамыка, 88;*
*в) г. Ветка, вул. Д. Кавалёва, 16; г) г. Ветка, завул. Парыжскай камуны, 10*



а)



б)



в)



г)

Фота 2 – Прыклады ліштваў карункавага тыпу:
*а) г. Ветка, вул Грамыка, 56; б) г. Ветка, вул. Свярдлова, 14;*
*в) г. Ветка, вул. Парыжскай камуны, 58; г) г. Ветка, завул. Парыжскай камуны, 28*

Менавіта ў веткаўскіх ліштвах адчуваецца імкненне да дэкаратыўнасці і вытанчанасці, што адрознівае іх ад больш стрыманых форм, характэрных для іншых рэгіёнаў Беларусі. Разьбяры Веткі не толькі

віртуозна валодалі тэхнікай, але і ўкладвалі ў свае творы глыбокі сімвалічны сэнс, які адлюстроўвае імкненне да мастацкага асваення свету, да разумення і ўпарадкавання навакольнай рэальнасці праз эстэтычныя ідэалы [7, с. 188]. Таму знаёмыя з дзяцінства расліны і жывёльны свет служылі ўзорам для народных разьбяроў, натхняючы на стварэнне ўнікальных узораў. Акрамя таго, многія матывы архітэктурнай разьбы бяруць свой пачатак з багата аздобленых старадаўніх рукапісаў і з традыцыі карункавых разьбяных аб'ёмных іканастасаў стараабрадцаў. Нельга не згадаць і пра матывы з ткацтва, бо Веткаўскі раён, асабліва Неглюбка, славіцца сваімі каларытнымі ручнікамі, арнаменты якіх часта пераносіліся на драўляныя элементы, ці наадварот. Усё гэта дало пачатак да ўвядзення ў 1980-я гг. у навуковы ўжытак тэрміна "веткаўская разьба" [8, с. 38].

Акрамя таго, ліштвы вокнаў, безумоўна, захоўваюць памяць пра трох'ярусную мадэль сусвету. Іх надаконныя дошкі ўяўляюць сабой "нябесны" ярус, напоўнены раслінным арнаментам. Гэта сімвал росту, жыцця, сувязі з вышэйшымі сіламі. А самі вокны – гэта "зямны" ярус з крыжам рамы, з кветкамі ў гаршках, калі яны ёсць (і тое, і другое – вобраз Сусветнага дрэва), і з самімі жыхарамі дома, якіх мы можам убачыць праз гэтае акно [9, с. 28]. Вокны ўспрымаліся як сувязь з навакольным светам, як магчымасць бачыць і быць убачанымі. Ніжэй, пад вокнамі, у разьбяных элементах дэкору пануюць тэмы водных істот і знакаў ніжняга свету, напрыклад цмокаў. Лічылася, што іх размяшчэнне ў ніжняй частцы ліштвы абараняе жыхароў дома ад начных напасцяў, ад злых духаў і іншых небяспек, якія чакаюць у цемры.

Ніжэй разгледзім кожны элемент ліштваў і яго семантыку.

Як ужо згадвалася вышэй, першапачаткова галоўная функцыя аканіц – закрываць шчыліны ў вокнах і абараняць дом ад холаду і скразнякоў. Таму калісьці акно мела звычайна толькі адну аканіцу, потым пачалі вешаць па дзве. З-за дарагавізны шкла і адсутнасці падвоеных рам аканіцы шчыльна закрываліся на ноч, а таксама ў час моцных вятроў і маразоў [4, с. 15]. Яны былі неабходнай часткай дома і адным з асноўных элементаў, якія дазвалялі захаваць цяпло.

У большасці дамоў, пабудаваных у ніжнепасожскай традыцыі, вокны ўпрыгожваліся двухстворкавымі аканіцамі. Гэта быў самы распаўсюджаны варыянт. Зрэдку можна было сустрэць адна- і чатырохстворкавыя аканіцы, але гэта хутчэй выключэнне, чым правіла. Большасць аканіц складалася з трох філёнг – устаўных панэляў, якія ўтваралі асноўную плоскасць аканіцы. Звычайна рэльефныя філёнгі былі адзіным упрыгожваннем, без дадатковых элементаў, такіх як разьба ці малюнкі [5, с. 118]. Асноўная ўвага ўдзялялася форме і фактуры саміх філёнгаў. Аднак на дамах,

пабудаваных, хутчэй за ўсё, пасля вайны, сустракаліся аканіцы з аздабленнем у выглядзе ромбаў, крыжоў, радзей – ажурнай рашоткі.

У савецкі час роля аканіц зменшылася, таму можна ўбачыць вокны і без іх [4, с. 15]. Замест традыцыйных аканіц тут выкарыстаны “вушкі” – невялікія дэкаратыўныя элементы, якія ўстанаўлівалі па баках акна, што надавала ім сучасны выгляд.

Франтонны тып ліштваў лічыцца больш старажытным за карункавы, датуецца прыкладна канцом XIX – XX ст. і характарызуецца простай, але гарманічнай формай надаконніка, выкананага ў класіцыстычным стылі. Гэта сведчыць пра імкненне мясцовых жыхароў пераймаць гарадскую культуру, капіраваць элементы каменных будынкаў, імкнучыся да элегантнасці і вытанчанасці. Верхняя частка наваконніка ўтварае двухсхільны дах, а вуглы кароны аздоблены пілястрамі з дэкаратыўным завяршэннем (т. зв. краштэйны), што надае канструкцыі завершаны і выразны выгляд [10, с. 51].

Сярод разнастайных узораў, якія выкарыстоўваліся ў аздабленні менавіта карункавых ліштваў, варта вылучыць *стрэлы* – сімвал, які нясе ў сабе глыбокія ахоўныя і магічныя значэнні. Найчасцей стрэлы размяшчалі на дошках надаконнікаў, радзей – на філёнгах аканіц. Першапачаткова стрэлы мелі форму гарызантальнага ромба, але з часам сталі больш ажурнымі і складанымі [5, с. 117–118]. У некаторых выпадках майстры, імкнучыся ўзмацніць ахоўны эфект, размяшчалі на ліштве некалькі стрэл. Лічылася, што стрэлы адганяюць ад дома ўсё дрэннае, засцерагаюць жыхароў ад удару маланкі ці страшнага пажару. Гэта можна заўважыць па напрамку стрэл, якія нібы абгінаюць дом з двух бакоў, ствараючы ахоўны круг. Вобраз стрэл невыпадковы, улічваючы існаванне ў гэтым рэгіёне ўнікальнага абраду “Страла”, які выклікае дождж і спрыяе ўрадлівасці зямлі [11, с. 28].

На верхняй частцы дошкі падаконніка (абавязкова ў цэнтры) размяшчаліся *сонечныя сімвалы*, якія мелі асаблівае значэнне для нашых продкаў. Сустракаліся знакі Сонца ў выглядзе разетак ці паўкола, якія сімвалізавалі Сонца ў зеніце, а таксама кола з промнямі, якія разыходзяцца ў розныя бакі [11, с. 30]. Асаблівай іканаграфіі сонечных сімвалаў у Ветцы не было, кожны майстар рабіў па-свойму. Але сэнс заўсёды заставаўся аднолькавым: Сонца ўвасабляла жыццё, энергію і цяпло, было крыніцай усяго жывога. Нездарма нашы продкі надавалі Сонцу вялікае значэнне. Дні сонцастаяння і раўнадзенства выдзяляліся асабліва. Жыццё людзей, якія аселі на зямлі, непасрэдна залежала ад Сонца. Халоднае і дажджлівае лета або занадта гарачае магло пакінуць хлебаробаў без ураджаю, а гэта азначала б пагрозу смерці для ўсёй сям’і. Таму сонечныя сімвалы на ліштвах выступалі

ў ролі магутнага абярэга, які павінен быў забяспечыць спрыяльнае надвор'е і багаты ўраджай, гарантуючы дабрабыт і выжыванне сям'і.

Сярод *раслінных элементаў*, характэрных для аздаблення ліштваў, асабліва вылучаюцца пераходныя S-падобныя завіткі, кветкі, трыліснік і іх паўторы, якія ў сукупнасці ўяўляюць сабой вобраз райскага саду [12, с. 418]. Гэтыя элементы сімвалізуюць рост, развіццё і непарыўную сувязь чалавека з прыродай. Трыліснік, варта адзначыць, лічыўся надзейнай абаронай ад свету мёртвых і абярэгам поспеху, таму яго часта "хавалі" сярод іншых малюнкаў. У хрысціянстве трыліснік з'яўляецца сімвалам Святой Тройцы, а ў каталікоў асацыіруецца з крыжам святога Патрыка.

У цэнтры дошкі падаконніка можна заўважыць і *фігуркі берагінь*. З распасцёртымі рукамі і нагамі, яны дораць жыццё, увасабляюць жаночы пачатак і працяг роду. Гэта адзін з самых частых вобразаў, які займае важнае месца як на старых вышыўках, так і на разьбяных ліштвах. Гэта, па сутнасці, малітва аб урадлівасці зямлі і працягу роду. Гэта просьба аб дабраславенні на стварэнне новай сям'і і нараджэнне здаровых дзяцей.

Акрамя асноўных узораў верхняй дошкі наваконніка, варта звярнуць увагу на карункі, якія нібы "звісаюць" з яе, нагадваючы кроплі дажджу. Гэта даволі частая з'ява для мясцін Веткаўскага раёна, хоць часцей такія "кроплі" рабіліся на карнізе самога дома. Кроплі таксама можна заўважыць на звесе бакавіны. Яны сімвалізуюць жыццё, урадлівасць і ачышчэнне. Гэтыя сімвалічныя кроплі не толькі ўпрыгожваюць ліштву, але і могуць разглядацца як працяг гісторыі, звязанай з абрадам "Стралы" [11, с. 28].

У народнай разьбе 20–30-х гг. мінулага стагоддзя вялікую папулярнасць набылі элементы савецкай сімволікі. Разам з традыцыйнымі ўзорамі, такімі як раслінныя матывы, геаметрычныя фігуры і выявы жывёл, майстры ўмела ўплыталі ў свае работы стылізаваныя атрыбуты працы – серпы, молаты, а таксама каласкі пшаніцы, пяціканцовыя зоркі і г. д. [13, с. 54]. Большасць гэтых узораў, на жаль, не захавалася да нашых дзён. Аднак асобныя, не вельмі прыкметныя зорачкі яшчэ можна сустрэць на старых ліштвах.

Ніжняя частка ліштвы, так званы падаконнік, мае своеасаблівы "фартух", які пашыраецца ў сярэдняй частцы [5, с. 119]. Выявы на ім больш простыя, чым у надваконніку, але таксама нясуць важнае значэнне. У старажытных уяўленнях ніжняя частка акна сімвалізуе падземную глыбіню і свет продкаў, таму арнамент тут больш стрыманы і лаканічны, што адлюстроўвае сувязь з тымі, хто быў да нас, і аддае даніну павагі нашым караням. Упрыгожванне падаконніка яшчэ звычайна складаецца з апрацоўкі канцоў бакавых дошак (т. зв. "звесы бакавіны") у выглядзе трохвугольнікаў, завіткоў або простага зрэзу пад вострым вуглом [14, с. 3]. У пабудовах канца XIX – XX ст. падаконнік зусім адсутнічае.

Візуальная выразнасць многіх знакаў забяспечваецца пэўнымі характэрнымі рысамі, такімі як рытмічнасць паралельных ці радыяльных ліній, якія ствараюць адчуванне руху і парадку, а таксама завостранасць або гранёнасць фігуры, што дадае дынамікі. Рытмічная накіраванасць ліній ад цэнтра да краёў стварае эфект выпраменьвання, падкрэсліваючы важнасць цэнтральнага элемента, а пабудова знака ў адпаведнасці з прынцыпамі цэнтральнай сіметрыі забяспечвае збалансаванасць, робячы яго лёгка распазнавальным і запамінальным. З аднаго боку, гэта адлюстроўвае імкненне да гармоніі і балансу ў стварэнні знакаў, з другога – перадае дуальнасць існага: верхняга і ніжняга свету, дня і ночы, дабра і зла, жыцця і смерці [6, с. 84].

Такім чынам, трэба адзначыць, што Веткаўшчына сапраўды з'яўляецца цэнтрам багатай гістарычнай і культурнай спадчыны. Стараабрадцы, якія заснавалі горад, прынеслі з сабой свае традыцыі, што спрыяла развіццю адметнай школы мастацтва, у якой ліштвы вокнаў сталі сімвалам статусу і мастацкай вытанчанасці. Яны не толькі выконваюць дэкаратыўную функцыю, але і служаць абярэгамі, адлюстроўваючы светапогляд і культурныя каштоўнасці мясцовых жыхароў, спалучаючы язычніцкія і хрысціянскія сімвалы, якія адлюстроўваюць узаемапранікненне розных культурных традыцый у беларускім народным мастацтве.

### Крыніцы і літаратура

1. Горбацкий, А. А. Старообрядчество на белорусских землях / А. А. Горбацкий. – Брест : БрГУ, 2004. – 236 с.

2. Сахута, Я. М. Беларускае народнае мастацтва / Я. М. Сахута. – Мн. : Беларусь, 1980. – 154 с.

3. Сахута, Я. М. Народнае мастацтва / Я. М. Сахута. – Мн. : Бел. навука, 2015. – 179 с.

4. Сахута, Я. М. Народная разьба па дрэву / Я. М. Сахута. – Мн. : Выш. шк., 1978. – 92 с.

5. Малікаў, Я. Р. Традыцыі разьбянога дэкору ў народнай архітэктуры паўднёва-ўсходняй Беларусі: канец XIX – першая палова XX ст. / Я. Р. Малікаў. – Мн. : Бел. навука, 2016. – 237 с.

6. Малікаў, Я. Р. Агульныя рысы ў аздабленні разьбой традыцыйнага жылля паўднёва-ўсходніх раёнаў Беларусі (канец XIX – 1-я палова XX ст.) / Я. Р. Малікаў // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы. – Мн., 2008. – Вып. 5. – С. 78–87.

7. Локотко, А. И. Белорусское народное зодчество: середина XIX – XX в. / А. И. Локотко. – Мн. : Навука і тэхніка, 1991. – 286 с.

8. Скідан, А. В. Дзейнасць Веткаўскага музея народнай творчасці па зборы, захаванні і даследаванні архітэктурнай разьбы па дрэве Гомельскага Пасожжа / А. В. Скідан // Музей і традыцыйная культура Беларусі : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Гомель, 17–18 мая 2011 г. / рэдкал.: С. В. Разанаў (гал. рэд.), В. В. Дамасканаў, С. К. Кананові. – Гомель, 2011. – С. 37–40.

9. Голоса ушедших деревень / Г. Г. Нечаева, Г. И. Лопатин, С. И. Леонтьева [и др.] ; под общ. ред. Г. Г. Нечаевой. – Мн. : Бел. наука, 2008. – 341 с.

10. Сахута, Я. М. Народнае мастацтва Беларусі / Я. М. Сахута. – Мн. : Бел. Энцыкл., 1997. – 286 с.

11. Нячаева, Г. Р. Тэраталагічныя вобразы ў драўляным дэкоры жытла: (паўднёвы ўсход Гомельшчыны – паўднёвы захад Брагіншчыны) / Г. Р. Нячаева // Беларускі гістарычны часопіс. – 2023. – № 7. – С. 27–31.

12. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Веткаўскага раёна. У 2 кн. Кн. 2. – Мн. : БелТА, 1997. – 461 с.

13. Скідан, А. В. На ліштвах – сад дзівосны: веткаўская дамавая разьба ў кантэксце стараверскай культуры / А. В. Скідан // Мастацтва. – 2008. – № 7. – С. 52–55.

14. Беларуская народная архітэктурная разьба : альбом / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. – Мн. : Дзярж. выд-ва БССР, 1958. – 92 с.

**Да зместу**

УДК 639+502.7(476)

**А. В. Омелюсик**
Брест, Брестский государственный университет
имени А. С. Пушкина

# ПРОБЛЕМА СОХРАНЕНИЯ ТРАДИЦИОННЫХ ПРОМЫСЛОВ БЕЛАРУСОВ В КОНТЕКСТЕ БОРЬБЫ С БРАКОНЬЕРСТВОМ

Статья затрагивает проблему сохранения традиционных промыслов белорусов в контексте феномена браконьерства. Рассмотрена история развития белорусских промыслов (рыболовства, собирательства, охоты), феномена браконьерства от древних времен до современности. Проанализиорованы правовые подходы к регулированию промысловых занятий, их особенности.

**Ключевые слова:** традиционные промыслы, добывающие промыслы белорусов, браконьерство, природопользование, экологическое право, Статут ВКЛ, рыболовство, охота, собирательство.

The article addresses the issue of preserving traditional Belarusian extractive livelihoods in the context of poaching. It examines the historical development of Belarusian traditional extractive livelihoods – hunting, fishing, and gathering – and the phenomenon of poaching from ancient times to the present. Legal approaches to regulating these activities and their distinctive features are analyzed.

**Keywords:** traditional extractive livelihoods, Belarusian traditional extractive livelihoods, poaching, natural resource use, environmental law, Statutes of the Grand Duchy of Lithuania, fishing, hunting, gathering.

В современной белорусской этнографии сложились определенные трактовки понятия «промыслы». Так, в энциклопедии «Этнаграфія Беларусі» термин «промысел» используется параллельно с термином «ремесло». Авторы объясняют, что такое отождествление «адлюстроўвае поўнае ці частковае супадзенне іх прадметнага зместу, а разыходжанні звязаны з асэнсаваннем іх з пункту гледжання сацыяльна-эканамічнай характарыстыкі, сувязі з земляробствам, адносін да спажыўца і інш.» [1, с. 426]. Так, авторы приводят следующее общее определение: «промыслы – падсобная ў сельскай гаспадарцы вытворчасць, якая ўключае рамёствы і іншыя неземляробчыя заняткі». Из определения следует, что промыслы – это вспомогательная деятельность, которая включена в сферу сельского хозяйства и не является земледельческой. Отмечается, что такая широкая трактовка промыслов была характерна в исторической литературе XIX – начала XX в. [2, с. 11].

В издании «Беларусы» критикуется подобный подход к определению промыслов. Так, отмечается, что в сущности акцент данного определения в «неземледельческом» и вспомогательном характере деятельности.

Таким образом, определение подчеркивает второстепенность промыслов по отношению к земледелию. Отмечается, что «апошнія [промыслы] нібыта толькі дапаўнялі земляробства і не адыгрывалі істотнай ролі ў дарэвалюцыйнай вёсцы» [2, с. 12]. Тем не менее необходимо добавить, что в некоторых регионах Беларуси (например, Полесье) доминирующими в силу природных особенностей были именно промыслы (рыболовство, пчеловодство). Таким образом, мы понимаем промыслы как самостоятельные занятия, которые органически сочетались с земледелием либо существовали вне земледелия (например, добывающие промыслы).

Стоит уточнить, что в настоящей статье основное внимание отведено отдельной группе традиционных промыслов – добывающим. Более уместным будет использование следующего определения: промыслы – разнообразные занятия, направленные на получение продуктов питания или технического сырья, а также изготовление из него готовой продукции [3, с. 310]. Конкретно из данной группы промыслов мы выделили следующие: собирательство, охота и рыболовство. Данные промыслы были характерны для всей группы восточных славян, в том числе и белорусов.

Собирательство – одна из форм хозяйственной деятельности человека, собирание (добывание) готовых даров природы, в основном предметов питания и лекарственных растений [1, с. 209]. В издании «Беларусы» описывается следующим образом: «адзін з найстаражытнейшых спосабаў здабывання расліннай і жывёльнай ежы, заснаваны на збіранні дарункаў прыроды, усяго таго, што само па сабе, без ніякага дачынення чалавека расло і вадзілася на зямлі і ў вадзе» [2, с. 38]. Исходя из вышеназванных определений, собирательство, как и остальные добывающие промыслы, входит в систему присваивающего хозяйства. На своей начальной стадии оно носило синкретический характер, включая в себя элементы будущих промыслов (рыболовства, охоты, пчеловодства) [2, с. 38]. Собирательство играет важную роль в формировании традиционных природных знаний белорусов. Для того чтобы успешно заниматься собирательством, необходимо было знать особенности местной природы. Перед человеком вставал вопрос, что можно употреблять в пищу, а что нельзя. Таким образом, благодаря собирательству человек начал накопление знаний, которые затем передавал своим потомкам. Они, в свою очередь, воспринимали этот опыт. Таким образом еще на самых ранних этапах существования человека начинает появляться традиция, а вместе с этим оформляются и традиционные промыслы.

Охота в наиболее общем виде – поиск и преследование диких зверей и птиц с целью их добычи. Охота сыграла важную роль в эволюции человечества. На территории Беларуси охота известна с момента появления на ней первого человека. Важнейшим событием стало создание

специальных орудий труда для охоты. Создание таких орудий окончательно утвердило зависимость человека от «традиционности» его промысла. Возникла необходимость передачи своих знаний о производстве орудий труда и о повадках животных, без которых охотиться было не только неэффективно, но и опасно. Из этого также следует, что благодаря охоте человек начал изучать повадки животных и тем самым положил основу традиционным природным знаниям о диком животном мире. В общем виде все изложенные положения охоты распространяются и на рыболовство.

Кардинальные изменения в жизнь людей, а также трансформацию промыслов привнес неолит. Именно в этот период ведущей отраслью экономики становится рыболовство. Этот факт был обусловлен внешними обстоятельствами: резкая смена климата в связи с отходом ледника привела к кризису охоты [2, с. 55]. Рыболовство стимулировало развитие материальной культуры людей, а также помогало им в усвоении новых знаний, развитии творчества и мышления.

В период неолита окончательно оформились традиционные рыболовные принадлежности. Как подчеркивает И. Н. Браим, «створаныя ім [древним человеком] прылады лоўлі рыбы нагэтулькі аптымальныя і рацыянальныя па форме, прынцыпе будовы і дзеяння, што без істотных змен пратрывалі тысячагоддзі і паспяхова выкарыстоўваюцца ў нашы дні» [2, с. 56]. По принципу действия и способа лова традиционные приспособления лова делятся на неводы, сетки, ловушки, крючковые снасти, ударные приспособления [1, с. 437].

Постепенно традиционное присваивающее хозяйство начало вытесняться хозяйством производящим. Безусловно, такой переход не означал отказа от прежних занятий, по-прежнему люди занимались охотой, рыболовством и собирательством, однако все больше времени начала занимать новая деятельность – животноводство и земледелие. В условиях производящего хозяйства человек окончательно переходил к оседлому образу жизни, что затрудняло ведение охоты. Постепенно в большинстве семей традиционные промыслы начали трансформироваться во второстепенные занятия. Кроме этого, они начали конкретизироваться и специализироваться и окончательно оформились во времена Средневековья.

В Средневековье стремительно развивалась идея о частной собственности, что не могло не изменить отношения к традиционным промыслам. Именно в Средневековье начинает зарождаться феномен браконьерства. Стоит отметить, что само понятие «браконьерство» имеет давнюю историю. Оно проникло в русский и белорусский языки из Франции.

Изначально слово «браконьер» не имело негативной коннотации. Согласно источникам, слово braconnier означало то же самое, что и Bracher, т. е. человека, который заботится об охотничьих собаках, называемых

по-французски и по-немецки bracs, а по-латыни – bracconies. Отмечается, что слово Braconarius встречается в этом же значении в одной из грамот Генриха II, короля Англии [4]. Поэтому в изначальном смысле слова браконьеры были разновидностью охотников, как, например, сокольничьи охотники. Со временем понятие трансформировалось и обрело новые смыслы. В литературе приводятся следующие версии трансформации: «...но от того ли, что впоследствии браконьеры более других показали наклонность к тайному истреблению дичи, охота за которой составляла одно из важнейших преимуществ дворянства, или от того, что именем этим стали называть без различия всех людей, которые, единственным средством для пропитания имея охоту, необходимостью принуждены были присвоить себе добытое трудом» [5, с. 514].

В русский и белорусский язык термин пришел именно для обозначения того, «кто, не по праву, охотится в чужих дачах, кто занимается воровскою охотою, дичекрад, вор-стрелок, пострельщик, напольщик» [3, с. 108]. Важно отметить, что это определение первоначально включало в себя лишь охотничий промысел.

Феномен браконьерства представляет собой сложную взаимосвязь отношений государство – законодательство – человек – природа. Понятие браконьерства неразрывно связано с законодательными нормами. Право определяет то, что понимается под браконьерством, и вместе они представляют собой систему, в которой каждый элемент влияет друг на друга.

Стоит отметить суровость западноевропейского законодательства по отношению к браконьерам. В словаре Дидро, например, приводится выдержка из французского королевского ордонанса 1669 г., который предусматривает очень строгие наказания для браконьеров: «Все, кто расставляет силки, ловушки, тенета, петли из веревок и проволоки, сети, ошейники и т. д., будут приговорены к порке за первое нарушение и к штрафу в тридцать ливров; а за второе – будут наказаны плетью, клеймены и изгнаны на пять лет из владений» [4].

Похожее положение о браконьерстве существовало также и на белорусских землях. Так, в Статуте 1529 г. имеется девятый раздел «О ловах, о пущах, о бортном дереве, об озерах, о бобровых гонах, о хмельниках, о соколиных гнездах», который регулировал традиционные белорусские промыслы.

В первом артикуле закрепляется запрет охоты на чужих землях: «также постановляем: если бы кто-либо незаконно охотился в чужих владениях, то тому, в чьей пуще охотился, должен заплатить за насилие двенадцать грошей, а нам, великому князю, столько же должен заплатить и вознаградить, сколько будет зверей убито…» [7, с. 193]. Таким образом, здесь закрепляется денежная компенсация нарушителем нанесенного

ущерба владельцу территорий, а также выплата денежной компенсации государству за каждого убито зверя. Особенно строгой является ситуация, когда незаконный охотник ловится «над зверем убитым», т. е. прямо на месте преступления, при таких обстоятельствах охотник приговаривался к смертной казни. Схожими по содержанию являются четвертый и седьмой артикулы, посвященные вылову рыбы из чужих водных объектов. В этих артикулах также применяется практика денежной компенсации государству и владельцу, но не предусматривается мера смертной казни.

Определенно точно можно сделать вывод о том, что в государственном понимании Великого княжества зверь – собственность феодала. Так, в том же артикуле можно обнаружить, что «если бы кто-либо на своей земле зверя поднял, а тот зверь убежал бы на чужую землю, то он может своего зверя преследовать и по чужой земле и может убить зверя на чужой земле» [7, с. 193]. Закон акцентирует внимание на диком звере как на «своем звере», т. е. своей собственности, что во многом повторяет западноевропейскую модель.

За каждого зверя устанавливалась своя цена. Так, самым дорогим был зубр – 12 рублей; вдвое дешевле был лось – 6 рублей; медведь, лань, олень и конь – 3 рубля и т. д. Эти цены корректировались и изменялись: в Статуте 1566 г. олень и лань стали вдвое дороже.

Однако стоит подчеркнуть, что, кроме мер защиты права на собственность феодала, Статут содержит и артикулы, которые по современным меркам можно причислить к законодательству о защите животного мира. Ярким примером служит девятый артикул «О бобровых гонах». Как следует из артикула, «пан, в чьих владениях будут гоны, не должен разрешать своим людям и сам не должен от старого поля допахивать на такое расстояние, чтобы можно было до гнездовья бобров добросить палку. На такое же расстояние не должен подкашивать сенокосы и вырубать новые кусты» [7, с. 196]. Исходя из текста, можно увидеть, что ограничиваются в правах даже владельцы собственных территорий. Даже с учетом того, что бобры находятся на территории владельца, он не становится их собственником. Убийство же бобра каралось очень большим штрафом (за карего – копа, за черного – две копы).

Добыча бобров – один из старейших видов охотничьего промысла в Беларуси. Для добычи бобров существовала отдельная категория крестьян – бобровники. Они были ответственны за охоту на бобров, а также за охоту бобровых гонов [1, с. 44].

В Статуте 1566 г. были добавлены новые артикулы, посвященные незаконной вырубке леса, воровству в саду, а также намеренным пожарам. В 17-м артикуле примечательным является то, что на законодательном

уровне отмечается, что пожары наносят огромный вред пчелам, зверям и птицам. За намеренный пожар человека приговаривали к смертной казни.

Одним из источников Статутов Великого княжества Литовского являлось обычное право, которое существовало у белорусов на протяжении множества поколений [1, с. 212]. Обычное право является отражением мышления целого народа. Так, в Статутах нашел отражение тот факт, что белорусы – народ, который ценит и бережет окружающую природу.

Кроме Статута, такое положение подтверждает и «Устава на волоки». Так, в 40-м артикуле «Уставы» объявляется о полном запрете лова рыбы в озерах в апреле, мае и июне. В артикуле дается объяснение причины такого запрета – «для множенья ихъ въ тыхъ мѣсяцахъ» [8, с. 86].

Безусловно, отражение запрета на ловлю в нерестовый период – показатель традиционно сложившегося рационального отношения белорусов к природе. Кроме этого, в данном артикуле определяется «вольность подданых до рек и озер наших». Таким образом, закрепляется разрешение на использование рыболовецких принадлежностей (крыга, уда, бредень, тригубица и другие малые сетки). Стоит также отметить, что в целом рыболовный промысел носил более демократический характер и не контролировался так жестко, как охота [9, с. 137].

Артикулом ранее объявляется разрешение пользования лесом для заготовки дров, хвороста для ограждений, древесины для строительства и лыка исключительно для собственных нужд, а не для продажи. Кроме этого, «робятамъ малымъ и невѣстамъ» разрешалось собирать хмель, ягоды и «овощу лѣсного всякого». На своих волоках разрешалось охотиться на волка, лисицу, рыся, росомаху, зайца, белку и других маленьких зверей, а также птиц с правом «продавати кому хотячи». Однако вместе с этим говорилось, что «болшого звѣру не бити и на своихъ волокахъ; а особливо въ пущахъ и подъ пущами нашими ручницъ ховати и жадного звѣру ловити не маютъ». Стоит обратить внимание на то, что запрещается «ховати ручницы», которые не являлись традиционным охотничьим оружием белорусов.

Безусловно, Статуты и «Устава» показывают, что к Средневековью белорусы уже обладали зачатками справедливого экологического законодательства. Тот факт, что среди белорусов к этому времени уже сформировалась устойчивая модель рационального восприятия и использования природы, вытекает из законодательства. Как отмечает К. А. Шумский, исследователь экологических знаний белорусов, «…традыцыйныя веды беларусаў аб мясцовай флоры і фаўне, якія зафіксаваны ва ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі, маюць ярка акрэслены экафільны характар: у іх адсутнічае абгрунтаванне драпежніцкіх адносінаў да расліннага і жывёльнага свету, выяўляюцца павага да прыроды, яе прыгажосці,

імкненне захоўваць і рацыянальна выкарыстоўваць прыродныя багацці» [10, с. 112]. Так, например, отсутствие в средневековом законодательстве запрещенных орудий рыбного лова показывает, что «існавалі дакладна распрацаваныя, жорстка рэгламентаваныя і кантралюемыя нормы зносінаў з акаляючай прыродай» [10, с. 113]. Таким образом, белорусский народ естественным образом выстраивал такие взаимоотношения с природой, где не было места нерациональному использованию природных ресурсов.

После вхождения земель Беларуси в состав Российской империи положение традиционных промыслов мало изменилось. Однако именно в XIX в. проблема браконьерства начала становиться серьезной угрозой. Так, к концу века в рыболовном промысле распространилось отравление рыбы кукельваном. Кукельван – растение, горькие, ядовитые плоды которого применялись для придания горечи пиву и для одурманивания рыбы при ловле. В «Уложении о наказаниях уголовных и исправительных» статья 1624 предусматривала ответственность за истребление рыбы в прудах и реках с помощью яда [11, с. 183]. Е. Романов замечает, что «настоящими рыболовами этот способ добывания рыбы не практикуется и даже преследуется» [12, с. 47].

На законодательном уровне отсутствовали общегосударственные ограничения на лов в период нереста, на лов рыбной мелочи и т. д. Меры, принимаемые земствами, населением игнорировались, а ресурсов, чтобы следить за их соблюдением, у власти не было. Дореволюционный закон о рыболовстве так и не был принят. Как отмечается, «всему виной лобби промышленников, которым закон, ограничивавший их права и грозивший снижением прибыли, был не нужен» [13].

С критикой охотничьего браконьерства на белорусских землях выступал И. Алмазов. Так, он не только критиковал браконьеров, но и пытался по-своему понять и объяснить сущность феномена браконьерства [14, с. 32–37]. И. Алмазов отмечал, что под браконьерством понимает только изначальный, традиционный смысл этого слова. Под изначальным смыслом браконьерства он понимал тех, «кто охотится в чужих лесах без дозволения». Однако также отмечал и то, что «в настоящее же время значение этого слова расплылось». В своей статье он приводит попытку понять браконьеров с точки зрения их психологии: «почти всякая человеческая натура склонна к борьбе – она любит и даже ищет ее». Из этого он делает закономерный вывод, что образоваться браконьеры могли «лишь там, где охота не только воспрещается, но и преследуется». Автор отмечал, что борьба с браконьерством ведется неэффективно, «какая стража у нас занимается особенно тщательно ловлею силовщиков и травильщиков, какая стража в состоянии поймать их с поличным или отыскать хитро расставленные силки и капканы?» Мерами по борьбе

с браконьерством были денежные штрафы как для браконьеров, так и для полиции и лесной стражи за бездействие, однако они не работали: «…как же подвергнуть штрафу браконьера-промышленника, когда даже уличить его нет почти никакой возможности». Отмечается, что местные браконьеры редко бросались в бегство или скрывались с места преступления. Чаще всего они встречали преследователя лицом к лицу, нередко даже угрожали ему оружием, а в случае необходимости даже использовали его по назначению. Так, после выстрела лесника по собаке браконьера браконьер совершил ответный выстрел в самого лесника. Также он сообщает о случае, когда «за одно намерение отнять оружие у охотящегося полесовщик получил заряд крупной дроби в ноги».

В действительности, как отмечает Н. В. Туркин, «с падением крепостного права неустройство в охотничьем хозяйстве проявилось с особенною силою, а число охотников умножилось в громадной пропорции» [15, с. 3]. Полноценного закона об охоте в Российской империи не существовало вплоть до 1889 г. До выхода в свет нового закона положения об охоте были разбросаны по разным законодательным сборникам.

Они сочетали в себе разнородные положения. Одновременно использовались, с одной стороны, нормы древнерусского права, а с другой – современные нормы, вдохновленные западноевропейским законодательством. Так, например, в законодательстве не оговаривалось право охоты несовершеннолетних, душевнобольных, лиц судимых, состоящих под надзором, женщин, иностранцев. Прежнее законодательство не включало в себя регулирование способов охоты на хищных зверей, «которые могут быть истреблены во всякое время года и всеми возможными способами» [16, с. 41]. Похожее положение касалось и нехищных животных. Н. В. Туркин обращает внимание, что «…различие редакций, отмена одних и замена других статей, окончательно спутало вопрос о дозволенных и запрещенных способах охоты» [11, с. 82].

Такое положение вещей привело к плачевным последствиям: «недостаток надзора допустил такое укоренение браконьерства, что, передаваясь из поколения в поколение, оно обратилось въ обыденное занятие местных крестьян». Так, в период с 1888 по 1902 г. было возбуждено 751 уголовное дело, касающееся браконьерства на территории Беловежской пущи [17, с. 334].

Безусловно, период социально-экономической нестабильности, который в общем виде наступил с Первой мировой войной, а затем продолжился в войну гражданскую и советско-польскую, усугубил уже существующие негативные тенденции. Последствием этих процессов является одна из главных трагедий для белорусской фауны – истребление зубров. Накануне Первой мировой войны в Беловежской пуще насчитывалось 727 зубров, в 1919 г. они были полностью истреблены [18, с. 32].

В советский период происходит формирование национального белорусского государства. Вместе с этим происходит пересмотр отношения к традиционным промыслам. Зарождается проблема сохранения промыслов в традиционном виде как таковых. Так модернизационные процессы в промышленности, сельском хозяйстве начали постепенный процесс вытеснения традиционных способов ведения населением хозяйства. С массовым повышением грамотности постепенно изменяется и мировоззренческая система белоруса. Теперь на место традиционных знаний и отношений к природе приходит рационально-научное мировоззрение.

Во многом это явилось важным изменением в сфере традиционных промыслов XX в. Так, например, у рыбаков традиционного мировоззрения существовал свой собственный этикет, нарушение которого не только не приветствовалось, но и осуждалось (стоит вспомнить кукельван, который осуждали рыболовы). Справедливо отмечается, что «..вялікая колькасць традыцыйных уяўленняў аб дзікіх жывёлах (забарона забіваць многія іх віды без патрэбы, разбураць гнёзды, мурашнікі, пчаліныя дуплы) працавала больш эфектыўна за цяперашнія прыродаахоўчыя законы і заклікі грамадскасці» [10, с. 82]. Вместе с этим трансформировались и сами традиционные промыслы. Так, получило широкое распространение любительское и спортивное рыболовство. В такой же степени изменился и охотничий промысел.

Традиционные промыслы постепенно превратились в средства отдыха и развлечения населения, что также изменяло восприятие о традиционных промыслах. В правилах любительского и спортивного рыболовства в водоемах БССР постановляется, что «грубыми нарушениями при ловле рыбы для личного потребления являются: применение гражданами сетей, бредней, мережей и других ловушек, самоловных сетных “экранов” (“телевизоров”), подъемников, лов с применением взрывчатых, отравляющих и наркотических веществ, электротока, огнестрельного и пневматического оружия, колющих орудий лова (остроги, задевы и др.), способом гона, багрения при помощи бряцал и ботания» [19, с. 11].

Как можно заметить, среди запрещенных способов добычи присутствуют и традиционные орудия труда, которые белорусские рыбаки знали и использовали столетиями. Безусловно, среди запрещенных орудий есть и те, которые никогда не были свойственны традиционным способам ловли, – взрывчатые, отравляющие и наркотические вещества, огнестрельное и пневматическое оружие, электроток и т. д.

Таким образом, начиная с этого момента возникает проблема сохранения традиционных промыслов (в первую очередь рыболовства). С запретом традиционного ведения промысла утрачивается и сама традиция, которая составляет важнейшую часть белорусской культуры. Так, регионы,

в которых традиционно занимались рыболовством (Поозерье, Полесье), оказываются в затруднительном юридическом положении.

В 2021 г. в Республике Беларусь был принят указ № 284 «О рыболовстве и рыболовном хозяйстве». Данный указ является важным шагом к разрешению проблемы сохранения традиционных ценностей.

В новой редакции правил любительского рыболовства появляется определение «традиционных национальных орудий лова рыбы» – самодельные (ручной работы) орудия лова рыбы, изготовленные из натуральных природных материалов (прутьев ивы, дранок, коры, луба, древесины, льна, пеньки, хлопчатобумажной пряжи). Стоит отметить, что в правилах приведен перечень традиционных национальных орудий лова рыбы: жак, нерет, мережа, вентер и т. д.

Для всех этих орудий оговорены предельные размерности. Использование национальных орудий лова становится легальным при условии включения пользователя орудий в специальный перечень, который формируют местные органы власти. Кроме этого, использование традиционных орудий возможно лишь в рамках платного любительского лова. К пользователям традиционных орудий предъявлены также дополнительные требования.

Следовательно, современный законодательный подход учитывает существование традиционных орудий труда, однако вместе с этим предъявляет к человеку множество требований, что делает использование традиционных орудий труда занятием с дополнительной ответственностью. Нынешнее положение традиционного рыболовного промысла можно охарактеризовать как ограниченное. Однако вместе с этим важно отметить, что данные меры, возможно, являются началом к разрешению проблемы соотношения браконьерства и традиционных промыслов белорусов, которая складывалась на протяжении значительного периода времени.

## Источники и литература

1. Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн. : БелСЭ, 1989. – 575 с.

2. Беларусы / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Каендрата Крапівы ; рэдкал.: В. К. Бандарчык, М. Ф. Піліпенка, В. С. Цітоў. – Мн. : Навука і тэхніка, 1995. – Т. 1 : Прамысловыя і рамесныя заняткі / В. К. Бандарчык, Н. І. Буракоўская, Г. М. Курыловіч [і інш.]. – 1995. – 351 с.

3. Гісторыя сялянства Беларусі : у 3 т. / пад рэд. М. П. Касцюка [і інш.]. – Мн. : Бел. навука, 1997. – Т. 1 : Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. / Я. К. Анішчанка, Г. Я. Галенчанка, В. Ф. Голубеў [і інш.] ; рэдкал.: В. І. Мялешка [і інш.]. – 1997. – 430 с.

4. Encyclopédie ou Dictionnaire raisonné des sciences, des arts et des métiers. Tome second, Azyme-Cezimbra // Gallica. – URL: https://gallica.bnf.fr/ark:/12148/bpt6k50534p/f398.item (дата обращения: 18.04.2024).

5. Энциклопедический лексикон : в 17 т. – СПб. : Типография А. Плюшера, 1836. – Т. 6 : БИН–БРА. – 551 с.

6. Толковый словарь живого великорусского языка : в 4 ч. / В. И. Даль. – М. : Изд. О-ва любителей рос. словесности, учрежден. при Император. Моск. ун-те, 1863. – Ч. 1 : А–З. – 627 с.

7. Статут Великого Княжества Литовского 1529 года / Акад. наук Бел. ССР, Отд. правовых наук. – Мн. : Изд-во Акад. наук БССР, 1960. – 253 с.

8. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией : в 5 т. – СПб. : Типография 2-го отд-ния Собствен. Е. И. В. канцелярии, 1846–1853. – Т. 3 : 1544–1587 / под ред. Император. археогр. комис. – 1848. – 356 с.

9. Беларусы / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы ; рэдкал.: В. К. Бандарчык, М. Ф. Піліпенка, І. У. Чаквін. – Мн. : Навука і тэхніка, 1995. – Т. 4 : Вытокі і этнічнае развіццё / В. К. Бандарчык, В. М. Балявіна, Г. І. Каспяровіч [і інш.]. – 2001. – 433 с.

10. Шумскі, К. А. Традыцыйныя экалагічныя веды беларусаў у XIX ст. – пачатку XXI ст. : манаграфія / К. А. Шумскі. – Мн. : БДАТУ, 2011. – 192 с.

11. Уложение о наказаниях уголовных и исправительных / Сенат Рос. империи. – СПб. : Типография II Отд-ния Собствен. Его Император. Величества Канцелярии, 1845. – 898 с.

12. Романов, Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. Быт белоруса / Е. Р. Романов. – Вильна : Типография А. Г. Сыркина, 1912. – 600 с.

13. Беляев, Д. С. От закона до закона / Д. С. Беляев // Русская рыбалка : журнал. – URL: https://rusfishjournal.ru/publications/from-the-law-until-the-law/. – Дата публ.: 16.02.2016.

14. Алмазов, И. Браконьерство в Северо-Западном крае / И. Алмазов // Журнал охоты : орган Император. о-ва размножения охотничьих и промысловых животных и правильной охоты. – 1875. – Т. 2, № 6. – С. 32–37.

15. Туркин, Н. В. Законы об охоте: Критическое исследование русских охотничьих законоположений / Н. В. Туркин. – М. : Ред. журн. «Природа и охота», 1889. – 219 с.

16. Свод законов Российской империи, повелением государя императора Николая Павловича составленный : в 15 т. – СПб. : Типография II Отд-ния Собствен. Его Император. Величества Канцелярии, 1832–1839. – Т. 12 : Свод законов государственного благоустройства, Ч. 4, 5. – 1932. – 734 с.

17. Карцов, Г. П. Беловежская пуща: ее исторический очерк, современное охотничье хозяйство и Высочайшие охоты в Пуще / Г. П. Карцов. – СПб. : Артистическое заведение А. Ф. Маркса, 1903. – 414 с.

18. Козло, П. Г. Зубр в Беларуси / П. Г. Козло, А. Н. Буневич ; науч. ред. В. П. Семенченко. – 2-е изд., испр. и доп. – Мн. : Бел. навука, 2011. – 366 с.

19. Ломтев, Ю. И. С удочкой по водоемам / Ю. И. Ломтев, В. Я. Линник. – Мн. : Ураджай, 1989. – 143 с.

**Да зместу**

УДК 39(476)

**А. А. Селях**
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна

# "НА ДОЎГУЮ ПАМЯЦЬ": ПАЭТЫЧНЫЯ ІНСКРЫПТЫ Ў РУКАПІСНАЙ ДЗЯВОЧАЙ КУЛЬТУРЫ АПОШНЯЙ ТРЭЦІ XX СТАГОДДЗЯ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ З ЗАХОДНЯГА ПАЛЕССЯ)

У артыкуле асэнсоўваецца адна з практык дзявочай штодзённасці – складанне дароўных памятных надпісаў. Разглядаюцца найбольш пашыраныя жанры дзявочай рукапіснасці, дзе сустракаюцца паэтычныя інскрыпты. Аналізуецца сэнсавы змест інскрыптаў, а таксама іх значэнне ў міждзявочай камунікацыі ў апошняй трэці XX ст. Праблема асэнсоўваецца на падставе аналізу матэрыялаў, сабраных у выніку палявых этнаграфічных даследаванняў у Заходнім Палессі.

**Ключавыя словы:** рукапісная дзявочая культура, камунікатыўныя практыкі дзяўчат, інскрыпты, паэтычныя інскрыпты, Заходняе Палессе.

The article is devoted to the study of one of the practices of girls' everyday life – the compilation of commemorative inscriptions. The author considered the most expanded genres of girls' handwriting, where poetic inscriptions are found. The author analyzes the semantic content of scripts, as well as their significance in girls' communication in the last third of the twentieth century. The problem is understood based on the analysis of materials collected as a result of field ethnographic research in the Western Polesie.

**Keywords:** handwritten girls' culture, girls' communication practices, inscriptions, poetic inscriptions, The Western Polesie.

У поле даследавання сучаснага культурнага антраполага, этнолага ўваходзяць шматлікія аспекты штодзённасці, у тым ліку яе кампаненты, звязаныя са спосабам мыслення, стратэгій паводзін грамадства, яго карцінай свету. Асобную цікавасць для даследавання ўяўляе камунікатыўная прастора соцыуму. Прадметам разгляду дадзенага артыкула з'яўляюцца паэтычныя інскрыпты, а менавіта іх месца сярод пісьмовых форм камунікацыі заходнепалескіх сельскіх дзяўчат.

Вывучаючы штодзённасць заходнепалескіх сельскіх дзяўчат на падставе палявога матэрыялу, які збіраўся ў сельскай мясцовасці Заходняга Палесся, было выяўлена, што адной са штодзённых практык дзяўчат у другой палове XX ст. з'яўлялася стварэнне рукапісных тэкстаў [1, с. 366]. Пры гэтым асобныя жанры рукапіснай дзявочай культуры (анкеты, сшыткі пажаданняў, надпісы на фотаздымках) выконвалі камунікатыўную функцыю і прадугледжвалі наладжванне сувязі паміж адрасантам і адрасатам.

Зыходзячы з заяўленага прадмета навуковага асэнсавання (паэтычныя інскрыпты ў рукапіснай культуры), на першы погляд падаецца, што праблема будзе разглядацца ў філалагічным накірунку. Але гэта не зусім так. Сапраўды, рукапісная культура дзяўчат апошняй трэці XX ст. (анкеты,

дзённікі, спеўнікі, пажаданнікі, фотаальбомы, у якіх фота суправаджаецца подпісамі) – гэта тэксты ў чыстым выглядзе. Але гэтыя "тэксты" ўяўляюць цікавасць не толькі з пункту гледжання філалогіі, лінгвістыкі, але і культурнай антрапалогіі. У дзявочых сшытках і альбомах зафіксаваны ў тым ліку пачуцці і перажыванні, каштоўнасці і ўяўленні, што адлюстроўвалі сацыяльны і ментальны бок жыцця гэтай полаўзроставай і статуснай групы вясковай супольнасці ў пэўных прасторавых і часавых межах.

На падставе аналізу зместу сабраных падчас палявых даследаванняў помнікаў дзявочай рукапіснай культуры было заўважана даволі частае фігураванне ў тэкстах катэгорыі "памяць". Найбольш яскрава "мемарыяльнасць" прасочваецца праз памятныя надпісы – інскрыпты [2]. Інскрыпт уяўляе сабой дароўны памятны надпіс, пакінуты адрасантам для адрасата [3, с. 53–54]. Такога кшталту надпісы можна знайсці як на фотаздымках, так і ў рукапісных альбомах, анкетах, сшытках пажаданняў і інш. Адзначым, што тэксты сабраных матэрыялаў, з якімі атрымалася папрацаваць у працэсе даследавання, – рускамоўныя, таму цытаванне будзе ажыццяўляцца адпаведна арыгінальнай мове крыніцы.

Інскрыпт на фотаздымках – надпіс, які сведчыў аб перадачы ў дар фотаздымка з выявай дарыльшчыка. Размяшчаўся інскрыпт, як правіла, на адваротным баку. Ён меў "формульную" і "няформульную" часткі. Формульная частка змяшчала дароўную формулу, у якой называліся атрымальнік і дарыльшчык ("Свете от Тани"), пазначалася мэта дарэння ("на долгую/вечную/добрую память"), пазначалася дата і месца дарэння, а таксама подпіс дарыцеля. Няформульная частка змяшчала адрасаванае атрымальніку пажаданне "не забываць" [4, с. 194–195]. Даволі часта ў дзявочых тэкстах сустракаліся інскрыпты накшталт "на памяць", "згадай", "не забывай". Акрамя таго, сустракаліся інскрыпты ў вершаванай форме. Вершы і афарызмы, размешчаныя на адваротным баку фотаздымка, адносяць да "паэтычных інскрыптаў", якія былі прызваны аказаць уплыў на чытача за кошт сваіх мастацкіх і эстэтычных якасцяў [4, с. 195].

Прыклады інскрыптаў на фота з уласных архіваў рэспандэнтаў:

*Не нравится – порви, а нравится – храни* (Прыватны архіў рэспандэнткі, фотаздымак дзяўчыны, 1986 г.);

*Пусть волны жизненного моря не смоют* ***память*** *обо мне* (Прыватны архіў рэспандэнткі, фотаздымак дзяўчыны, 1985 г.);

*Лучше* ***вспомни*** *и взгляни, чем взгляни и* ***вспомни*** (Прыватны архіў рэспандэнткі, фотаздымак дзяўчыны, 1978 г.);

*Дарю на долгую* ***память,***
*А может на несколько дней.*
*Все это зависит от дружбы,*
*От дружбы твоей и моей* (Прыватны архіў рэспандэнткі, фотаздымак дзяўчыны, 1989 г.).

Іншая група тэкстаў, што адносяць да паэтычных інскрыптаў, прадстаўлена ў дзявочых анкетах і пажаданніках. Сярод памятных надпісаў найчасцей сустракаліся цытаты, аўтарскія вершы, празаічныя пажаданні. У анкетах дзяўчат часта сярод пытанняў сустракаецца пункт “Пожелание хозяйке анкеты” (размяшчаўся, як правіла, у самым канцы, пасля ўсіх пытанняў). Адрасаваны інскрыпт-пажаданне ўтрымліваў просьбу “не забываць”, “успамінаць”:

***Вспоминай** иногда, если будет когда... А всегда **вспоминать** невозможно...* (Прыватны архіў рэспандэнткі, інскрыпт з анкеты, 1983 г.);

*Алая роза упала на грудь, милая Лена, меня **не забудь!*** (Прыватны архіў рэспандэнткі, інскрыпт з анкеты, 1968 г.).

У сшытках пажаданняў інскрыпты ў сваёй большасці прадстаўлены ў вершаванай форме:

*Пусть радость и счастье, любовь и ученье*

*Всегда украшают твой жизненный путь.*

*Сквозь бурь наслаждений, тревог и волнений*

*Меня, ты мой друг, **не забудь!*** (Прыватны архіў рэспандэнткі, інскрыпт з пажаданніка, 1980 г.);

*Если тетрадь ты откроешь,*

*Неужели не **вспомнишь** меня?*

*Нет! Я думаю, **вспомнишь**,*

*Ведь когда-то мы были друзья* (Прыватны архіў рэспандэнткі, інскрыпт з пажаданніка, 1963 г.).

Акрамя таго, даволі часта ў сшытках пажаданняў можна знайсці інскрыпт-настаўленне. Гэта своеасаблівае пажаданне, якое змяшчала парады на будучыню, у тым ліку павучальнага характару:

*Смейся жизни в лицо,*

*Никогда не грусти.*

*Там, где нужно рыдать,*

*Ты назло хохочи* (Прыватны архіў рэспандэнткі, інскрыпт з пажаданніка, 1980 г.).

***Не забывай** весёлой шумной школы.*

***Не забывай** весёлых шумных дней.*

***Не забывай** друзей, среди которых,*

*Проходят годы юности твоей* (Прыватны архіў рэспандэнткі, інскрыпт з пажаданніка, 1988 г.).

Аналіз тэкстаў з рукапісных помнікаў, створаных дзяўчатамі, дае падставу вызначыць пэўныя характарыстыкі гэтай сацыяльнай групы. Так, напрыклад, з фотакартак і анкет можна даведацца пра ўзрост дзяўчат, іх сацыяльнае становішча (вучаніца, студэнтка). Як правіла, такога кшталту камунікацыя адбывалася паміж дзяўчатамі-аднагодкамі, якія разам

навучаліся ў школе, тэхнікуме, інстытуце або разам працавалі. Падчас пражывання ў інтэрнаце ў перыяд навучання або працы ў горадзе, выезду на "сезоны" за мяжу адбывалася пашырэнне сяброўскага кола дзяўчат. Найбольшае распаўсюджванне паэтычныя інскрыпты атрымалі менавіта ў асяроддзі школьнікаў і студэнтаў, паколькі гэтыя субкультуры больш шырока выкарыстоўвалі ў камунікацыі пісьменнасць, вершаваныя формы, праз якія рамантызаваліся пачуцці сяброўства і кахання. Нездарма рукапісную дзявочую культуру даследчыкі называюць "школьным фальклорам" [1, с. 366].

Інскрыпты як мемарыяльны знак ствараліся дзяўчатамі-сяброўкамі з мэтай дэманстрацыі жадання захаваць адносіны ў перспектыве, калі прыйдзе час развітання. Камунікацыя на адлегласці нярэдка працягвалася праз ліставанне. Дзеля захавання вобраза ў памяці дзяўчаты паміж сабой, таксама як з хлопцамі, абменьваліся фотаздымкамі. На адваротным баку пакідалі інскрыпты, якія, як правіла, утрымлівалі дату і месца фотаздымка, колькасць гадоў, вершаваныя радкі [5, с. 258]. Пакіданне на фотаздымках ці ў дзявочых сшытках паэтычных інскрыптаў прадугледжвала непазбежны ў перспектыве разрыў у камунікацыі паміж атрымальнікам і дарыльшчыкам. Але ў сітуацыі расстання менавіта праз дароўны тэкст адбывалася сімвалічная камунікацыя паміж сяброўкамі, якія адна ад адной маюць паведамленне, прачытаўшы якое згадаюць мінулае. Многія з дзяўчат натуральным чынам знікалі з камунікацыйнага поля (раз'язджаліся па розных гарадах навучацца ці ўладкоўвацца на працу, выходзілі замуж у розныя мясцовасці), але памяць пра іх захоўвалася і зберагалася, што немалаважна. Аб гэтым сведчыць трапяткое стаўленне жанчын (былых дзяўчат) да сваіх фотаальбомаў і сшыткаў.

З успамінаў: *Есть подружкэ, фотографіі которых я дажэ і не помню, шо ў меня есць, а там напэсанэ стіхі. От ностальгія такая! Сядем посмотрым: «О, в мана вжэ ныма, а в ейі сохранылысь фотографіі на долгую память». І там подпісі такэі да чітаеш. І когда-то думалы, шо ныкогда ны забудым, но прошло врэмя. Конешно, всё помынялось. Став совсем образ другэй жызні. Воно ны забувалось: подружкы, друзья, но всё равно своя жызнь стала і всё как-бы чуть-чуть вдаль отошло, а вжэ твоя жызнь другая пошла. Совершэнно другіе вжэ друзья і замуж, деті...* (Запісана ад С. В. Нічыпорчык, 1963 г. н., в. Літоўск Драгічынскага р-на) [6, інт. № 63].

Такім чынам, паэтычныя інскрыпты з'яўляюцца неад'емным кампанентам рукапіснай дзявочай культуры, у цэлым дзявочай субкультуры апошняй трэці XX ст. і адлюстроўваюць культуру сацыяльных адносін гэтага часу. Аналіз зместу інскрыптаў-пажаданняў (вершаў, цытат, афарызмаў) дае падставу для высновы аб тым, што асобнае месца

ў пісьмовых камунікатыўных практыках дзяўчат займала “мемарыяльнасць”, мемарыяльная тэматыка. Частае сустраканне катэгорыі “памяць” (у выглядзе лексем “не забудь”, “помни”, “вспоминай”, “на память” і інш.) сведчыць пра значнасць гэтага канцэпту ў ментальнасці грамадства, яго каштоўнасных арыенцірах, свядомасці, без вывучэння якіх немагчыма спасцігнуць гісторыка-культурную рэчаіснасць ва ўсёй яе паўнаце.

Традыцыя міждзявочых камунікатыўных практык праз запаўненне анкет, складанне пажаданняў, стварэнне памятных надпісаў на фотаздымках сёння страчана. Гэты пласт культуры застаецца малавывучаным айчыннымі даследчыкамі, але даволі цікавым і рэпрэзентатыўным для вывучэння штодзённасці асобных сацыяльных груп, а таксама грамадства (як вясковага, так і гарадскога) ў цэлым.

**Крыніцы і літаратура**

1. Селях, А. А. Месца пісьмовага фальклору ў дзявочай культуры заходнепалескай вёскі другой паловы XX ст. / А. А. Селях // ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы : зб. навук. арт. / Ін-т гісторыі Нац. акад. навук Беларусі ; рэдкал.: Т. Даўгач [і інш.]. – Мн. : Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 2024. – С. 364–369.

2. Косых, Е. А. Жанровое своеобразие инскрипта / Е. А. Косых ; Алтайс. гос. пед. ун-т. – Барнаул : АлтГПУ, 2024. – 161 с. – URL: https://library.altspu.ru/dc/pdf/kosyh.pdf (дата обращения: 08.05.2025).

3. Косых, Е. А. Инскрипт в речевой парадигме социума: к проблеме классификации / Е. А. Косых // Филология и человек. – 2022. – № 1. – С. 53–66.

4. Бойцова, О. Ю. Любительские фото: визуальная культура повседневности / О. Ю. Бойцова. – СПб. : Изд-во Европейского ун-та в С.-Петербурге, 2013. – 266 с.

5. Селях, А. Дзявочая рукапісная культура другой паловы XX ст.: па матэрыялах з Заходняга Палесся / А. Селях // Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні : зб. навук. пр. – Мн. : Бел. навука, 2024. – Вып. 11. – С. 248–261.

6. Фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, сабраныя А. А. Селях у Заходнім Палессі // Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі. – Ф. 23. Воп. 23. Спр. 1.

**Да зместу**

# ГІСТОРЫЯ, ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ

УДК 94(476)“1940/1980”(092)

**В. А. Баран**
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна

## УСПАМІНЫ І. Я. КАЛЕСНІКАВА ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧАГА РУХУ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ 1921–1939 ГАДОЎ

Артыкул прысвечаны аналізу ўспамінаў Івана Ягоравіча Калеснікава, члена Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), як гістарычнай крыніцы для вывучэння нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. Падкрэсліваецца важнасць комплекснага падыходу да вывучэння эга-дакументальнай спадчыны ветэранаў КПЗБ, якая патрабуе крытычнага аналізу крыніц у кантэксце іншых гістарычных даных, уліку культурных, сацыяльных і палітычных фактараў часу, што дазваляе стварыць больш аб’ектыўную карціну досведу і светапогляду аўтараў, якія паўплывалі на адлюстраванне імі гістарычных падзей.

**Ключавыя словы:** Заходняя Беларусь 1921–1939 гг., нацыянальна-вызваленчы рух, падпольная барацьба, Вялікая Айчынная вайна, успаміны ветэранаў КПЗБ.

The article is devoted to the analysis of the memoirs of Ivan Kolesnikov, a member of the Communist Party of Western Belarus (CPZB), as a historical source for the study of the national liberation movement of Western Belarus in 1921–1939. The importance of an integrated approach to the study of the ego-documentary heritage of veterans of the CPZB is emphasized, which requires a critical analysis of sources in the context of other historical data, taking into account cultural, social and political factors of the time, this allows you to create a more objective picture of the experience and worldview of the authors who influenced their depiction of historical events.

**Key words:** Western Belarus 1921–1939, national liberation movement, underground struggle, Great Patriotic War, memoirs of veterans of the Communist Party of Belarus.

Гісторыя Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. – неад’емная і найважнейшая старонка айчыннай гісторыі. Яе значэнне актуалізуецца надзённасцю і запатрабаванасцю вопыту заходнебеларускай гісторыі, яе адміністратыўна-палітычнага, гаспадарча-эканамічнага, грамадска-палітычнага і культурнага жыцця [1, с. 4]. Крыніцамі, якія даюць магчымасць рэканструяваць карціну тых гадоў, з’яўляюцца не толькі афіцыйныя дакументы і публікацыі, але і асабістыя сведчанні ўдзельнікаў падзей – эга-дакументальныя крыніцы ветэранаў КПЗБ, у якіх праз прызму асабістага досведу і ідэалагічных перакананняў адлюстроўваюцца рэаліі жыцця насельніцтва Заходняй Беларусі пад польскай уладай, падзеі нацыянальна-вызваленчага руху, дзейнасць КПЗБ. Аналіз гэтых крыніц у спалучэнні з іншымі гістарычнымі

данымі, дазваляе больш поўна і аб'ектыўна ацаніць уклад жыхароў Заходняй Беларусі ў нацыянальна-вызваленчы рух і фарміраванне беларускай ідэнтычнасці ва ўмовах складанай геапалітычнай сітуацыі міжваеннага перыяду. У сувязі з гэтым уяўляюць цікавасць успаміны І. Я. Калеснікава, актыўнага дзеяча КПЗБ з 1930 г., які прымаў актыўны ўдзел у важных палітычных кампаніях. З яго арганізацыйным удзелам на Быценшчыне было арганізавана пяць ячэек кампартыі, у 1936 г. працаваў сакратаром падрайкама КПЗБ, удзельнічаў у 1937 г. у рабоце Варшаўскага кангрэса прафсаюзаў. Яго вопыт мемарыялізацыі пралівае святло на многія аспекты акрэсленых праблем. Выяўленыя ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным архіве Брэсцкай вобласці і Занальным дзяржаўным архіве ў г. Баранавічы, а таксама апублікаваныя на старонках кнігі "Памяць" успаміны І. Я. Калеснікава дазваляюць пашырыць уяўленні адносна як біяграфіі самога аўтара, так і многіх аспектаў нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі.

Паводле ўспамінаў, Іван Ягоравіч Калеснікаў нарадзіўся ў 1910 г. у в. Быцень Івацэвіцкага раёна сучаснай Брэсцкай вобласці (Слонімскага павета Гродзенскай губерні – па тагачасным адміністрацыйным дзяленні) у сям'і серадняка. Падчас Першай сусветнай вайны ў 1915 г. сям'я падалася ў бежанства ў Расію, дзе з кастрычніка 1915 г. пражывала ў Казанскай губерні – у в. Елькіна Ядрынскага павета. У 1921 г. у Паволжы была засуха, азімае жыта было вельмі дрэннае, а яравыя пасля пасеву засушыла. У кастрычніку 1921 г. разам з іншымі бежанцамі сям'я І. Я. Калеснікава выехала ў г. Маскву і жыла там "на питательном пункте", а ў сакавіку 1922 г. вярнулася на радзіму ў в. Быцень. Асаблівае месца ва ўспамінах І. Я. Калеснікава нададзена паказу становішча простага беларускага народа пры польскай уладзе: "Пробыл я всего дома одну неделю и сразу пришлось пойти пастухом к хозяину. Нужно было зарабатывать на хлеб. Нанялся я пастухом к крестьянину Левону Волкову в д. Коротень Новогрудского района. Я пас коров и должен был работать по хозяйству. Отдыхать хозяин не давал совершенно. Будни до восхода солнца, а ложился я поздно вечером" [2, арк. 2–3].

У 1923 г. І. Я. Калеснікаў наняўся пасвіць кароў у в. Сецевіна, за 7 км ад Навагрудка, у селяніна Ануфрыя Казла. Яго пляменнік Іван Казёл, камуніст з 1920 г., добраахвотнік Чырвонай Арміі, былы камісар, а з восені 1923 г. – член КПЗБ, які ўжо працаваў у падполлі, істотна паўплываў на палітычны светапогляд юнага Калеснікава. Ён даваў І. Я. Калеснікаву невялікія даручэнні па распаўсюджванні сярод насельніцтва рэвалюцыйнай літаратуры, далучаючы да рэвалюцыйнай дзейнасці. І хоць атрымаў прапанову застацца на другі год, І. Я. Калеснікаў наняўся на службу да іншага гаспадара. Але, як падрабязна апавядае аўтар пра ўмовы працы

на новым месцы, "служба была очень тяжелой. Пришлось не только летом пасти коров, но и всю работу выполнять в хозяйстве. Ночью нужно было молотить цепом. Хозяин часто ездил ночью воровать лес и меня брал с собой. Хозяин меня часто бил за то, что иногда был не в силах выполнять ту или иную работу". Восенню 1924 г. пасля чарговых пабояў Калеснікаў звярнуўся ў паліцыю, але не атрымаў чаканай абароны і падтрымкі, а ў суд не звярнуўся, бо разумеў цяжкасці судовых намаганняў. Падмануты гаспадаром ("по окончании срока службы мне хозяин не заплатил. Он не отдал хлеб, а пообещал купить сапоги, пиджак, рубашку, брюки. Купил же сапоги, которые через два месяца развалились, и дал пиджачок своей работы из домотканного полотна, а хлеба совсем не дал"), вярнуўся пехатой у Быцень, "был истощен и слаб, у меня не было никаких сил" [2, арк. 3–5].

Аўтар настойліва акцэнтуе ўвагу на галоўнай цяжкасці тагачаснага незаможнага насельніцтва – пошуку працы. Яго маркотнае жыццё ажыўляецца ў выніку чарговага знаёмства і супрацоўніцтва з камуністамі-падпольшчыкамі Іванам Ладыкам і Фёдарам Жылінскім, які з'яўляўся сакратаром камсамольскай арганізацыі. У 1926 г. І. Я. Калеснікава прынялі ў камсамол, што вызначыла яго далейшы лёс [3, с. 115], бо гэта быў вірлівы час Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ) і ахопленых рамантыкай нацыянальнага вызвалення камсамольцаў Заходняй Беларусі.

2 лютага 1927 г. на чале з Ф. Жылінскім у складзе пяці чалавек І. Я. Калеснікаў накіраваўся ў Косава, дзе прынялі ўдзел у Косаўскай дэманстрацыі супраць разгрому польскімі ўладамі БСРГ. Аўтар з захапленнем успамінаў, як з чырвонымі сцягамі і транспарантамі, на якіх былі надпісы "Вызваліць рабоча-сялянскіх дэпутатаў, вызваліць усіх палітзняволеных!", "Далой фашысцкую дыктатуру Пілсудскага!", з рэвалюцыйнымі песнямі дэманстранты прайшлі па вуліцах Косава, правялі мітынг. Атрады самаабароны прагналі паліцыю, якая спрабавала яго разагнаць. Калі дэманстранты зноў рушылі па горадзе, паліцыя пачала страляць. Першым залпам быў забіты Пётр Гаўрусь з в. Малы Галік. Ён ішоў наперадзе калоны са сцягам у руках. Паміраючы, ён крыкнуў: "Товарищи, мы погибаем единицы – вас останутся миллионы, не бросайте начатого нами дела…" [2, арк. 5; 4, с. 429].

І. Я. Калеснікаву ўдалося пазбегнуць арышту, у 1928 г. у чарговы раз працаваў на лесазаводзе Блок-Быцень, у 1929 г. уладкаваўся на лесазавод у Стоўбцах, які належаў фірме "Англія-Еўропа", дзе пасля трох месяцаў "катаржнай работы" рабочыя арганізавалі забастоўку з патрабаваннем павялічыць заработную плату. Скончылася тым, што зачыншчыкаў забастоўкі звольнілі з работы, і І. Я. Калеснікаў вымушаны быў пакінуць Стоўбцы. Вярнуўшыся дамоў, зноў стаў працаваць на заводзе Блок-Быцень,

адразу адчуў, што за ім устаноўлены нагляд, за арганізацыю выступлення рабочых быў звольнены з работы.

Вартасць успамінаў заключаецца ў тым, што змяшчае прозвішчы паплечнікаў па барацьбе, у тым ліку ў складзе КПЗБ, сябрам якой ён стаў у 1930 г., а таксама вызначальныя аспекты рэвалюцыйнай дзейнасці. Сакратаром партячэйкі быў Фёдар Аляксандравіч Макарэвіч, членам яе з'яўляўся Сцяпан Салонка з в. Манцюты, якога праз год арыштавалі, а ў 1932 г. арыштавалі І. Ф. Макарэвіча, абвінаваціўшы ў шпіянажы на карысць СССР і правядзенні сярод польскіх салдат антыўрадавай агітацыі. Пазней, пасля некалькіх звальненняў з розных месцаў работы, Ф. А. Макарэвіч перайшоў граніцу і апынуўся ў СССР. І. Я. Калеснікаў застаўся працаваць у сваім раёне. Сакратарамі партыйных ячэек у вёсках вакол Быцені сталі А. Ф. Лукшын і І. А. Ляўчук з в. Прыбарава, М. І. Банасевіч з в. Рудні, В. І. Ермаловіч з в. Заполле, М. М. Лукашык з в. Козіна, У. М. Страковіч з в. Манцюты. Да самага роспуску КПЗБ яны з'яўляліся сакратарамі партыйных ячэек, арганізоўвалі і ўзначальвалі забастоўкі. Адной з самых працяглых была забастоўка рабочых, якія працавалі ў капіталіста Рамбіля [3, с. 115–116].

Кідаецца ў вочы ідэйна-палітычная абумоўленасць стылістыкі аўтара, сацыяльна-класавыя прыярытэты якога былі скіраваны на цяжкія ўмовы найму, працы, арганізацыі барацьбы і эканамічныя правы рабочых. Так, паводле ўспамінаў аўтара, у лістападзе 1935 г. была аб'яўлена забастоўка лесарубаў, возчыкаў і рабочых лесазавода Блок-Быцень на тэрыторыі быценскай гміны. Рабочыя патрабавалі павышэння заробку для возчыкаў на 40 %, г. зн. з 2,5 злотых да 4 злотых, лесарубам на 10 %. Спачатку капіталісту ўдалося знайсці штрэйбрэхераў у кожнай вёсцы, нягледзячы на тое, што была праведзена тлумачальная праца сярод насельніцтва, каб не выходзілі і не выязджалі на працу да таго часу, пакуль не будзе заключаны дагавор. Вельмі перашкаджалі ў дасягненні пастаўленай мэты штрэйкбрэхеры. Дружыны самаабароны, якія былі створаны ў кожнай вёсцы, адбіралі ў іх сякеры і пілы, ламалі вазы і тапілі ў р. Шчары. Аднак пасля настойлівай растлумачальнай работы яны адступілі [2, арк. 11–12]. Забастоўкі праходзілі ва ўмовах жорсткіх рэпрэсій і праследаў. У Быценскай гміне былі мабілізаваныя на тое, каб зламаць забастоўкі, асаднікі, якія не давалі збірацца па 3–5 чалавек, разганялі і збівалі бастуючых, праводзілі арышты. Калеснікаў адзначыў важную акалічнасць, звязаную з тым, што забастоўка працягвалася больш за два месяцы і закончылася перамогай рабочых. Акрамя павелічэння платы за працу, было вырашана пабудаваць для рабочых завода Блок-Быцень інтэрнат [5, арк. 182].

Аўтар праяўляе жаданне падкрэсліць сваю значнасць праз супрацоўніцтва з вядомымі асобамі камуністычнага руху, акцэнтуе ўвагу і на 20 лістапада 1936 г., калі яго выклікалі ў в. Акунінава, дзе знаходзіўся сакратар Слонімскага акруговага камітэта камсамола С. В. Прытыцкі, на момант напісання ўспамінаў важная асоба палітычнай іерархіі БССР. Па яго прапанове І. Я. Калеснікава абралі сакратаром партячэйкі, членамі якой сталі А. М. Маслоўскі і К. А. Макарскі. Праз тры месяцы былі арганізаваны пяць ячэек КПЗБ, а праз паўгода ў наваколлі Быцені была арганізавана яўрэйская партячэйка і дзве камсамольскія. Паспяхова завяршылася новая забастоўка на Блок-Быцені. Зарплата возчыкаў была павышана на 70 %, а лесарубаў – на 20 %. Былі пабудаваны для рабочых тры баракі [3, с. 116].

Як вядома, у законе, прынятым Сеймам Польшчы ў 1924 г., было сказана, што там, дзе пражывае 25 % беларусаў ці дзе 40 % бацькоў выказвае жаданне навучаць сваіх дзяцей на беларускай мове, павінны быць адкрыты беларускія школы. У 1936–1937 гг. паўсюдна праводзіліся сходы, дзе абмяркоўвалася пытанне аб адкрыцці беларускіх школ на тэрыторыі Быценскай гміны. На сходах прымаліся рэзалюцыі з патрабаваннем адкрыць беларускія школы. Мясцовая адміністрацыя на чале з войтам Гейгатэхам усімі сіламі імкнулася аслабіць барацьбу беларускіх рабочых за родную школу, пад рознымі падставамі не давала магчымасці падаваць дэкларацыю. Сяляне вёсак Быцень, Прыбарава, Козіна, Заполле, Манцюты праяўлялі вялікую актыўнасць і напорыстасць. У масавым парадку ў гмінныя рады і школьны інспектарат паступалі дэкларацыі. Збіраліся подпісы і накіроўваліся ў Міністэрства асветы ў г. Варшаву, а таксама ў староства і на імя ваяводы. Такіх рэзалюцый і дэкларацый было накіравана каля 20 з подпісамі каля 3000 чалавек. За патрабаванне адкрыцця беларускіх школ было масавае выступленне рабочых і сялян. Адміністрацыя і паліцыя праследавалі і разганялі сходы, але былі выпадкі, што пасля разгону сходу сяляне на другі і трэці дзень збіраліся зноў [2, арк. 23–24; 5, арк. 190].

Асобная частка ўспамінаў прысвечана аўтарам знаходжанню ў канцлагеры Бяроза-Картузская. Першыя дні знаходжання ў канцлагеры моцна адбіліся ў памяці І. Я. Калеснікава: “Нас завели в подвал, так называемый изолятор. Камера была большая, сырая, холодная. Окна были забиты. Нас поставили к стенке по стойке смирно, почти уткнули носом в стену и заставили раздеться догола. Произвели тщательный обыск и стали избивать резиновыми палками. Они издевались над нами в течение целого дня”. Апісанне штодзённасці лагера ўключае ў сябе інфармацыю пра, сцвярджэнні аўтара, наўмыснае стварэнне антысанітарных умоў, а менавіта затапленне камеры вадой і прымус да знаходжання ў мокрым асяроддзі. Прымусовае прыняцце вызначанага становішча (“ляжаць на левым баку”) і

наступнае цыклічнае паўтарэнне каманд. Начныя інцыдэнты з уздымам і збіццём, якія здзяйсняліся пад рознымі падставамі, паказваюць на сістэму наўмыснага парушэння сну і сталага падтрымання стану страху і трывогі. Далей падрабязна апісана працэдура ранішняга мыцця і сняданку: "Утром принесли нам котелки, ложки, а затем погнали нас умываться к водоколонке. Гнали и командовали: "Ложись! Бегом марш! Ложись! Ползи по пластунски!" Назад в камеру бежали под ту же команду. После умывания стали еще грязнее. Такие приемы умывания почти каждый день повторялись. Вбежав в камеру и схватив котелки, мы направлялись в столовую на завтрак. Получив мутную водичку (кофе или кислую похлебку) и порцию хлеба, арестованные по сигналу садились за стол. Полиция обычно подгоняла палками опоздавших сесть за стол, а поэтому арестованные во избежание экзекуции усаживались на пол и принимались за пищу" [2, арк. 32–33]. Дадзеныя факты паказваюць на грэбаванне патрэбамі зняволеных і выкарыстанне ежы ў якасці інструмента кантролю і пакарання.

27 ліпеня І. Я. Калеснікава перавезлі з канцлагера Бяроза-Картузская ў Слонімскую турму, дзе ўжо знаходзіўся Іван Малец са Слоніма і сакратар ЦК камсамола Заходняй Беларусі Давід Фенгінберг. Хутка І. Я. Калеснікаў быў абраны сакратаром турэмнага камітэта. Задачы турэмнага камітэта былі наступныя: 1. Арганізаваць вучобу камуністаў і камсамольцаў, павышаць іх адукацыйныя веды, весці сярод іх палітычна-выхаваўчую работу і арганізаваць нелегальную перапіску. 2. Дабіцца ад турэмнай адміністрацыі, каб не перашкаджалі зняволеным атрымліваць з дому прадукты і выпісваць газеты.

